С. В. Снапкоўская

# Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі

С. В. Снапкоўская

# Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі

З гісторыі школы
і педагагічнай думкі Беларусі
канца XIX — пачатку XX ст.

МІНСК
«НАРОДНАЯ АСВЕТА»
1995

ББК 74.03(4Беи)
С 53
УДК 37.01(476) 09

**Снапкоўская С. В.**

С 53 Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. — Мн.: Нар. асвета, 1995. — 128 с.

ISBN 985-03-0232-1.

Кніга прысвечана даследаванню стану асветы, асноўных напрамкаў і тэндэнцый развіцця школы і педагагічнай думкі Беларусі ў 1890—1917 гг. Аўтар вяртае з небыцця шэраг забытых імёнаў таленавітых настаўнікаў і педагогаў Беларусі.

Адрасуецца настаўнікам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй культуры і асветы Беларусі.

С $\frac{3700000000-043}{М\ 303(03)-95}$ 9-95 **ББК 74.03(4Беи)**

Навукова-папулярнае выданне

СНАПКОЎСКАЯ Святлана Валянцінаўна

ЛЯ ВЫТОКАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПЕДАГОГІКІ

Загадчык рэдакцыі *М. А. Нікітка.* Рэдактар *В. У. Назарэўская.*
Вокладка мастака *М. М. Грыбава.* Мастацкі рэдактар *Л. А. Дашкевіч.*
Тэхнічны рэдактар *З. У. Раманкевіч.* Карэктар *І. С. Яромчык.*

Здадзена ў набор 23.09.94. Падпісана ў друк 27.02.95. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 2. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 6,72. Умоўн. фарба-адб. 6,83. Ул.-выд. арк. 7,63. Тыраж 5000 экз. Заказ 927.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект, Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога». 222310, Маладзечна, Таўлая, 11.

**ISBN 985-03-0232-1** © С. В. Снапкоўская, 1995

## УВОДЗІНЫ

Вывучэнне гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX—пачатку XX ст. застаецца важнай задачай сучаснай педагагічнай навукі. Адзін з галоўных аргументаў на карысць звяртання да дадзенай праблематыкі заключаецца ў тым, што даследаванне стану і тэндэнцый развіцця асветы, школы і педагагічнай думкі перадкастрычніцкай эпохі дазваляе ў вядомай ступені знайсці адказ на пытанне: з якім духоўным, маральным і інтэлектуальным патэнцыялам падышоў беларускі народ да кастрычніцкага рубяжа 1917 г.

Працэсы станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці і дэмакратычнага абнаўлення, якія адбываюцца ў наш час на Беларусі, вывелі гэтыя пытанні з вобласці навукова-тэарэтычных даследаванняў вузкага кола вучоных-прафесіяналаў у сферу ідэалогіі і рэальнай палітыкі, зрабілі іх прадметам дыскусій сярод шырокіх колаў грамадскасці, розных сацыяльна-палітычных сіл. У такіх умовах неабходна скінуць цяжар старых падыходаў, пераадолець ідэалагічныя стэрэатыпы, якія складаліся на працягу дзесяцігоддзяў.

Вывучэнне гісторыі асветы і школы дакастрычніцкага перыяду пачалося на Беларусі ў 20-я гады ў працах Я. Лесіка, А. Цвікевіча, У. Пічэты, У. Ігнатоўскага. У 30-я і 40-я гады сур'ёзных распрацовак у гісторыка-педагагічных даследаваннях не было ў сувязі з разгулам рэпрэсій сталінскага рэжыму пад лозунгам барацьбы з «нацдэмаўцамі» супраць беларускай інтэлігенцыі, умовамі ваеннага часу, заідэалагізаваным падыходам грамадазнаўцаў да гісторыі беларускага нацыянальнага адраджэння. «Адліга» ў другой палове 50-х гадоў суправаджалася ўзмацненнем інтарэсу даследчыкаў да гісторыі народнай адукацыі, да вывучэння педагагічных ідэй прадстаўнікоў беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху. Праблемы пачатковай школы і педагагічнай адукацыі на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст., педагагічныя погляды Цёткі (А. Пашкевіч) і Я. Коласа знайшлі адлюстраванне ў працах І. А. Алісіевіч, Л. В. Арабей, П. С. Івашчанкі, М. К. Кірылава, А. І. Краўцова.

У 60-я гады адбывалася пашырэнне і паглыбленне тэматыкі гісторыка-педагагічных даследаванняў (працы М. Н. Аўраменкі, З. А. Пастуховай і інш.), з'явіліся першыя абагульняючыя працы па гісторыі народнай адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі («Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі»).

У 70-я гады вучоныя звярнуліся да даследавання педагагічнай журналістыкі, дзейнасці педагагічных таварыстваў, жаночай адукацыі, адукацыі на роднай мове, поглядаў асобных прадстаўнікоў педагагічнай думкі Беларусі (працы Г. Р. Сянькевіч, А. В. Трухан, В. К. Жураўлёва, С. В. Лузгіной, У. Н. Радыёнава).

80-я гады адзначаны паглыбленай распрацоўкай асобных праблем дадзенага перыяду, а таксама першым вопытам стварэння спецыяльных навуковых даследаванняў па гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. (М. С. Мяцельскі).

Дасягненнем гісторыка-педагагічнай навукі рэспублікі стаў выхад у свет у 1985 г. абагульняючай працы «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г.», якая больш поўна і грунтоўна ў параўнанні з «Нарысамі гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі» асвятляе тэму. Каштоўным і цікавым выданнем стала «Антология педагогической мысли Белорусской ССР», у якой прадстаўлены работы асветнікаў, пісьменнікаў, вучоных, педагогаў, грамадскіх дзеячаў канца XIX — пачатку XX ст.

У 80-я гады пытанні народнай адукацыі, прававога і матэрыяльнага становішча настаўніцтва і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў перадкастрычніцкага перыяду сталі прадметам разгляду гісторыкаў Н. В. Каменскай, Е. К. Новіка, А. А. Первачук. Е. Г. Андрэева даследавала гісторыю дашкольнага выхавання ў дасавецкай Беларусі. У 1991 г. у Маскве выйшла кніга «Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. Конец XIX — начало XX в.», дзе ў сканцэнтраваным выглядзе адлюстраваны працэсы адукацыі і педагагічнай думкі на Беларусі.

Сказанае вышэй сведчыць аб тым, што гісторыка-педагагічнай навукай Беларусі зроблены пэўныя крокі па шляху даследавання складанай і супярэчлівай праблемы развіцця асветы і педагагічнай думкі ў краіне. Аднак цэлы шэраг пытанняў, звязаных з развіццём асветы, патрабуе сур'ёзнага вывучэння і дасканалага асвятлення з сучасных пазіцый. Уведзеныя ў навуковы абарот не да-

следаваныя раней і не выкарыстаныя архіўныя дакументы і матэрыялы дазволілі аўтару кнігі наблізіцца да аб'ектыўнага аналізу стану і развіцця беларускага нацыянальнага адраджэння і школы канца XIX — пачатку XX ст.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў навуковы, узважаны падыход да даследавання развіцця нацыянальнай школы і педагагічнай думкі не ўяўляўся магчымым. Таму прапанаваная чытачу кніга ставіць мэту перш за ўсё скінуць цяжар старых падыходаў, пераадолець заслону ідэалагічных стэрэатыпаў. Аўтар імкнецца па заслугах ацаніць інтэлектуальную і маральна-духоўную спадчыну прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага адраджэння, дзейнасць якіх заклала асновы беларускай нацыянальнай школы, педагогаў-даследчыкаў, народных настаўнікаў.

У сувязі з вышэйвыказаным аўтарам пастаўлены наступныя задачы: даследаваць асаблівасці развіцця народнай асветы і яе сувязь з грамадска-педагагічным рухам на тэрыторыі Беларусі ў кантэксце нацыянальнага адраджэння; прааналізаваць асноўныя падыходы ва ўдасканальванні зместу, форм і метадаў вучэбна-выхаваўчага працэсу ў пачатковых і сярэдніх школах беларускіх губерняў; паказаць вядучыя фактары і ўмовы развіцця школы і педагагічнай думкі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Пры напісанні дадзенага даследавання аўтарам выкарыстана значная колькасць крыніц. Гэта — дакументы і матэрыялы фондаў Беларускага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Мінску, Гродне, Гістарычнага архіва Літоўскай Рэспублікі ў Вільні, Літаратурнага музея М. Багдановіча ў Мінску, краязнаўчых музеяў Беларусі (Мінск, Гродна, Гомель); публікацыі па пытаннях народнай асветы ў часопісах «Журнал Министерства народного просвещения» (ЖМНП), «Народное образование в Виленском учебном округе», «Циркуляр по Виленскому учебному округу», «Виленский вестник», «Голос учителя», «Белорусский учитель», «Белорусский учительский вестник», «Лучынка», «Русская школа», а таксама ў газетах «Наша доля», «Наша ніва», «Школа и жизнь», «Гродненские губернские ведомости», «Витебские губернские ведомости» і інш.; педагагічныя, вучэбна-метадычныя, літаратурна-крытычныя, гістарычныя і мастацкія працы прадстаўнікоў педагагічнай думкі Расіі і Беларусі канца XIX — пачатку XX ст.

## НЕАБХОДНАСЦЬ ПЕРАБУДОВЫ ШКОЛЬНАЙ СПРАВЫ

### У адпаведнасці з патрабаваннямі жыцця

У канцы XIX ст. тэрыторыя Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі, адставала ад цэнтральных губерняў краіны па важнейшых паказчыках развіцця народнай адукацыі. Такое становішча было абумоўлена агульным сацыяльна-эканамічным і культурным адставаннем, але перш за ўсё мэтанакіраванай русіфікатарскай палітыкай царскага самадзяржаўя, якое ў апошнюю чаргу і толькі пры крайняй неабходнасці клапацілася аб развіцці адукацыі і пісьменнасці на ўскраінах сваёй імперыі, населеных нярускімі нацыянальнасцямі.

Беларускі народ на працягу ўсяго XIX — пачатку XX ст. знаходзіўся ў неспрыяльных умовах сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Працэс фарміравання беларускай нацыі ажыццяўляўся марудна і супярэчліва, узровень нацыянальнай самасвядомасці народа быў вельмі нізкім. Большая частка пануючых класаў, якая выходзіла з беларусаў, падверглася глыбокай дэнацыяналізацыі. Шляхта, зямельныя магнаты, багатыя гараджане лічылі сябе палякамі, літоўцамі, рускімі, але не беларусамі.

Царскі ўрад пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі стаў праводзіць палітыку русіфікацыі. У 1840 г. урад Мікалая I афіцыйна забараніў ужыванне назвы «Беларусь», і яе тэрыторыя стала называцца Паўночна-Заходнім краем. Палітыка русіфікацыі беларускіх зямель узмацнілася пасля падаўлення паўстання 1863 г. Беларускае друкаванае слова заставалася па-за законам. Акрамя таго, свой традыцыйны ўплыў на беларускае насельніцтва імкнуліся захаваць і ўзмацніць польская шляхта і каталіцкае духавенства, якія праводзілі лінію на апалячванне і акаталічванне беларусаў.

Адмена прыгоннага права адкрыла шлях да развіцця капіталізму, значна паскорыла працэс кансалідацыі беларускай нацыі, дала штуршок для фарміравання беларускай нацыянальнай мовы, для ўзрастання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, фарміравання белару-

скага нацыянальна-вызваленчага руху. У канцы XIX ст. пачаўся новы этап нацыянальнага адраджэння Беларусі.

Аднак нацыянальнае адраджэнне і прагрэсіўнае развіццё беларускага грамадства былі немагчымымі без распаўсюджвання пісьменнасці (перш за ўсё сярод сялянства — асноўнай часткі беларускай нацыі), развіцця народнай асветы, культуры і навукі, прафесійных ведаў, свабоднага функцыяніравання роднай мовы. Неабходнасць развіцця капіталізму таксама востра ставіла пытанне аб масавай падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых, спецыялістаў з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй. Сістэма народнай асветы, якая склалася ў сярэдзіне XIX ст. у Расіі, ужо не адпавядала патрабаванням часу, і таму паўстала неабходнасць у глыбокіх рэформах і дэмакратызацыі. Недахопы і заганы адукацыйнай палітыкі царызму, яе саслоўна-класавы характар і русіфікатарская сутнасць асабліва выразна праяўляліся ў адносінах да нацыянальных ускраін Расійскай імперыі, адной з якіх з'яўляўся Паўночна-Заходні край.

На Беларусі горш, чым у цэнтральных губернях, фінансавалася народная асвета. Калі ў 1898 г. расходы на яе ў разліку на аднаго чалавека па земскіх губернях Расіі складалі 36,1 кап., то ў Віцебскай губерні — 25,5 кап., Гродзенскай — 19,3; Мінскай — 18,7; Магілёўскай — 10,8 кап.

Больш нізкім у канцы XIX ст. на Беларусі ў параўнанні з Еўрапейскай Расіяй быў і ўзровень пісьменнасці насельніцтва. Па даных перапісу 1897 г., у Пецярбургскай губерні пісьменныя складалі 62 % насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за 9 гадоў, у Маскоўскай — 49 %, у той час як у Гродзенскай — 39 %, Віцебскай — 33 %, Мінскай — 24 %, Магілёўскай — 22 %. У цэлым пісьменных ва ўзросце, старэйшым за 9 гадоў, у Еўрапейскай Расіі было 30 %, а на Беларусі — 25,7 %. Сярод жанчын колькасць непісьменных дасягала 90 %.

Беларусь адставала ад цэнтральных губерняў і па ахопу навучання дзяцей. Так, у губернях Еўрапейскай Расіі ў 1898 г. навучалася 42 % дзяцей школьнага ўзросту, а ў чатырох беларускіх губернях — 32 %. Найбольш непісьменнай часткай народа з'яўлялася яго самая шматлікая катэгорыя — сяляне, 90 % якіх не ўмелі чытаць і пісаць.

У суадносінах колькасці вучняў пачатковых школ ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў да дзіцячага насельніцтва

таго ж узросту беларускія губерні, як сведчылі даныя Аднадзённага перапісу пачатковых школ Расіі 1911 г., мелі значна горшае становішча ў параўнанні з цэнтральнымі і некаторымі ўскраіннымі губернямі краіны. Гэты паказчык складаў: у Магілёўскай губерні — 26,5 %, Гродзенскай — 25,5 %, Віцебскай — 20,6 %, Мінскай — 20,3 %, у той час як самы высокі ўзровень гэтых суадносін быў у Рыжскай вучэбнай акрузе, а таксама Маскоўскай, Петраградскай і Яраслаўскай губернях — ад 32 да 40 %.

Параўнанне па вучэбных акругах колькасці вучняў, якія скончылі курс пачатковых школ, па даных Аднадзённага перапісу 1911 г., паказвае, што Віленская вучэбная акруга, у склад якой уваходзілі беларускія губерні, займала перадапошняе месца сярод усіх 15 вучэбных акруг Расійскай імперыі, апярэджваючы толькі Варшаўскую акругу. Гэты паказчык па Віленскай вучэбнай акрузе складаў 7 % сярод хлопчыкаў і 6 % сярод дзяўчынак. Самы высокі працэнт дзяцей, якія скончылі пачатковую школу, быў у Рыжскай вучэбнай акрузе — адпаведна 16 % і 14 %. У Петраградскай акрузе ён адпаведна раўняўся 13 % і 11 %, у Маскоўскай — 12 % і 8 %. Па колькасці дзяцей, што выбылі з пачатковай школы да заканчэння курса, Віленская вучэбная акруга займала сярэдняе месца — да 18 % сярод хлопчыкаў і 17,5 % сярод дзяўчат.

У беларускіх губернях быў вельмі высокі адсеў вучняў. Большасць дзяцей не вучылася больш за адну-дзве зімы. Бацькі забіралі іх са школы ў сувязі з недахопам вопраткі і абутку, для выкарыстання ў хатняй гаспадарцы, адпраўкі на заробкі. Сур'ёзнай прычынай адсеву былі эпідэміі прастудных захворванняў з-за антысанітарнага стану і перапоўненасці школьных памяшканняў, аддаленасці школ ад месцажыхарства дзяцей.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне пачатковых школ Беларусі было горшым у параўнанні з Расіяй. Памяшканні школ Віленскай вучэбнай акругі былі ў большасці цяснейшымі, чым у акругах Цэнтральнай Расіі. На адну школу ў Віленскай вучэбнай акрузе прыходзілася 1,2 школьнага пакоя. Каля 6 % усёй колькасці школ не мелі пастаяннага памяшкання. Гэта былі так званыя перасовачныя хатнія школы, дзе настаўнікі карысталіся кватэрай і сталом гаспадароў. «У сувязі з тым, што колькасць вучняў у гэтых школах нязначная (у сярэднім ад 15 да 20 чал.), — гаварылася ў прадмове

да Аднадзённага перапісу 1911 г., — уся сям'я гаспадара лічыць магчымым застававацца ў чарговай хаце ў час класных заняткаў; зімой жа, у халодныя дні, у класную хату дапускаецца і мелкая дамашняя скаціна». З-за нязручнасці памяшканняў сярэдні навучальны год у перасовачных хатніх школах працягваўся не больш за 130 дзён.

Па расходах на школу, на ўтрыманне вучняў і настаўнікаў Віленская вучэбная акруга займала адно з апошніх месцаў сярод акруг еўрапейскай часткі краіны. Так, у сярэднім у 1910 г. на адну пачатковую школу ў акрузе было выдаткавана 620,7 руб., у той час як у Маскоўскай вучэбнай акрузе — 1011,2 руб., на аднаго вучня — адпаведна — 10,8 руб. і 15,3 руб., на аднаго жыхара — 43,2 кап. і 82,5 кап.

У другой палове XIX — пачатку XX ст. на Беларусі адбыўся даволі рэзкі скачок колькасці вучэбных устаноў, перш за ўсё пачатковых школ. Калі ў 1856 г. у Віленскай вучэбнай акрузе было 830 навучальных устаноў з 22 607 навучэнцамі, то на 1 студзеня 1911 г. — 10 287 навучальных устаноў з 544 663 навучэнцамі. За 54 гады колькасць навучальных устаноў узрасла ў 12,4 раза, а навучэнцаў — у 24,1 раза. Як падкрэслівалася ў прадмове да Аднадзённага перапісу 1911 г., попыт на «навуку» зрабіўся даволі моцным, што прывяло да значнага працэнта адмаўленняў у прыёме — 15 % да ўсёй колькасці навучэнцаў. Па словах А. Цвікевіча, у апошнім 20-годдзі XIX ст. «Беларусь пасунулася далёка наперад у сэнсе расійскае асветы».

Сістэма народнай адукацыі на Беларусі, як і ў цэлым па Расійскай імперыі, на мяжы XIX і XX стст. адрознівалася шматтыповасцю школ, адсутнасцю пераемнасці паміж пачатковай і сярэдняй школамі, падначаленнем навучальных устаноў розным ведамствам, наяўнасцю дзяржаўных і прыватных сярэдніх школ, саслоўна-класавым характарам сярэдняй і вышэйшай адукацыі, абмежаваннем для асоб жаночага полу ў атрыманні вышэйшай адукацыі. На працягу разглядаемага перыяду, асабліва ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. і пасля яе, гэтыя характэрныя рысы адукацыі значна змяніліся пад уплывам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця, а таксама ўзнікшага на Беларусі шырокага нацыянальна-культурнага і грамадска-педагагічнага руху.

Пачатковую адукацыю давалі народныя і гарадскія

вучылішчы, якія адносіліся да Міністэрства народнай асветы, царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці, што адносіліся да царкоўнага ведамства. Народныя вучылішчы былі двух тыпаў: аднакласныя, ці ніжэйшыя пачатковыя з трохгадовым тэрмінам навучання, і двухкласныя (пачатковыя вучылішчы павышанага тыпу) з 5—6-гадовым навучаннем. Колькасць двухкласных народных вучылішчаў, якія пачалі адкрывацца на Беларусі значна пазней, чым у губернях Цэнтральнай Расіі, была нязначнай. Так, на 1 студзеня 1905 г. дзейнічала 1314 народных вучылішчаў (з іх 65 — двухкласныя) са 106 196 вучнямі (у тым ліку з 20 636 дзяўчынкамі), на 1 студзеня 1908 г. — 2034 вучылішчы (з іх 132 — двухкласныя) са 163 659 вучнямі, на 1 студзеня 1914 г. — 4784 вучылішчы (з іх 531 двухкласнае) з 304 745 вучнямі. У пачатку XX ст., па прыведзеных даных, сетка пачатковай школы расла хутка.

Значную ролю ў павелічэнні сеткі народных вучылішчаў, як і ў цэлым у распаўсюджванні адукацыі сярод насельніцтва, ігралі земствы. Да 1911 г. земскія ўстановы ў беларускіх губернях былі прадстаўлены адміністрацыйнымі органамі па кіраванню земскімі гаспадаркамі: губернскімі і павятовымі камітэтамі і ўправамі па справах земскай гаспадаркі. Увосень 1911 г. на Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні было распаўсюджана «Палажэнне аб земскіх установах» ад 12 чэрвеня 1890 г. Гэта азначала ліквідацыю папярэдніх адміністрацыйных органаў земскага самакіравання — губернскіх і павятовых земскіх сходаў і ўпраў. У кастрычніку 1911 г. усталяваліся Віцебская, Мінская і Магілёўская земскія ўправы. З 7 аддзелаў, якія ўваходзілі ў склад структуры ўправы, народнай адукацыяй кіраваў агульны аддзел.

Выступіўшы за ўсеагульную адукацыю, за наданне ёй свецкага характару, дэмакратызацыю і перабудову вучэбна-выхаваўчага працэсу, земствы падтрымалі гэтыя патрабаванні практычнымі крокамі і матэрыяльнымі сродкамі. Яны падкрэслівалі неразрыўную сувязь паміж народнай асветай і нацыянальным дабрабытам. «Вестник Могилевского губернского земства» пісаў у 1911 г.: «Зараз ніхто не адмаўляе ўзаемнай сувязі народнай адукацыі і набытку: на падмурку першага будуецца другое, і, у сваю чаргу, апошняе з'яўляецца імпульсам першага. Развіваць сродкі народнай адукацыі, зрабіць іх даступнымі шырокім масам насельніцтва — значыць — даць

ім у рукі моцны рычаг, з дапамогай якога падымаецца і павялічваецца набытак, які выкліча рост новых агульнаадукацыйных сродкаў».

З моманту ўзнікнення земскага самакіравання як у Расіі, так і ў беларускіх губернях пачалася барацьба паміж земскай і царкоўнай школамі. У адпаведнасці з «Правіламі аб царкоўнапрыходскай школе» ад 1884 г. насаджэнне царкоўных школ разглядалася Сінодам Рускай праваслаўнай царквы як сродак барацьбы з грамадскай земскай школай. Разам з тым духавенства разлічвала сумесна з земскімі расходамі пашырыць сетку царкоўных школ і ўзмацніць свой уплыў у галіне пачатковай адукацыі. Гэтыя спадзяванні з'яўляліся небеспадстаўнымі. Пачынаючы з 1911 г. земскія ўправы Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў сталі даваць у карыстанне епархіяльным саветам значныя сумы на ўтрыманне царкоўнапрыходскіх школ. Па Мінскай губерні яны складалі ў 1912 г. — 70 674 руб., у 1913 г. — 62 888 руб., у 1914 г. — 69 732 руб. Разам з тым у 1906—1908 гг. Мінскае губернскае земства штогод скарачала расходы на царкоўныя школы ў параўнанні з папярэднімі гадамі суадносна на 18 тыс., 8 тыс. і 9 тыс. руб.

Пад уплывам грамадска-педагагічнага руху ўзмацнілася незадаволенасць сялянства царкоўнымі школамі з-за іх нізкага ўзроўню вучэбнай работы; земствы ўзялі курс на паступовае выцясненне гэтых школ з вёскі. Гэта рабілася як шляхам скарачэння расходаў на царкоўныя школы, так і шляхам адкрыцця земскіх школ у мястэчках, якія абслугоўваліся епархіяльным ведамствам.

Адначасова пераходзіла на ўтрыманне земстваў усё большая колькасць народных вучылішчаў, падведамасных МНА. З 1907 г. большасць народных вучылішчаў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях адкрывалася земствамі. Земскія ўправы гэтых губерняў накіроўвалі шматлікія хадайніцтвы ў адрас наглядчыка Віленскай вучэбнай акругі аб адкрыцці вучылішчаў, аб павелічэнні ў губернях колькасці інспектараў з тым, каб кожны павет меў аднаго інспектара. З 1912 г. разам з адкрыццём новых вучылішчаў земскія ўправы пачалі браць на сваё ўтрыманне адкрытыя раней народныя вучылішчы, якія ўтрымліваліся сялянскімі гуртамі. Да пачатку 1914/15 навучальнага года большасць школ МНА знаходзіліся на матэрыяльным утрыманні земстваў.

Расходы Мінскага губернскага земства на народную асвету ўзрасталі з 327 тыс. руб. у 1911 г., што складала 16 % усёй сумы расходаў, да 1588 тыс. руб. у 1914 г. — 13 % усіх расходаў. У 1911—1914 гг. у Мінскай губерні павятовыя земствы пабудавалі і запраектавалі 150 школьных будынкаў, а расходы на школьнае будаўніцтва склалі: са сродкаў земства — 50,5 %, Міністэрства народнай асветы — 45,9 %, сялянскіх таварystваў і ахвяраванняў — 3,4 %. У 1911 г. у Віцебскай губерні на ўтрыманні земства было 882 школы, у той час як МНА — 122 народныя і 312 царкоўнапрыходскія школы.

Вялікі ўклад унеслі земствы і ў развіццё прафесійнай адукацыі, асабліва ў распаўсюджванне сельскагаспадарчых ведаў. У прыватнасці, Мінскае губернскае земства распрацавала па прыкладу Маскоўскага земства падрабязную праграму для шасцігадовай школы, у якой адзначалася, што новая пачатковая школа павінна садзейнічаць пашырэнню сельскагаспадарчых ведаў, а ўвага вучняў павінна быць накіравана на «ежедневную работу крестьян».

У пачатковай адукацыі, згодна з заканадаўчым палажэннем, уведзеным з 80-х гг. XIX ст., насаджваліся школы царкоўнага ведамства і адначасова ўзнікалі перашкоды для распаўсюджвання народных вучылішчаў ва ўсходніх губернях Паўночна-Заходняга краю. Палітыка царскага ўрада і дзейнасць кіраўнікоў Віленскай вучэбнай акругі былі накіраваны на тое, каб у губернях з праваслаўным насельніцтвам — Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай — пашыраць школы царкоўнага ведамства. А развіццё сеткі пачатковых школ, на думку наглядчыка Віленскай вучэбнай акругі (1904), неабходна было сканцэнтраваць у Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губернях, у якіх большасць насельніцтва адмаўлялася ад праваслаўных царкоўных школ.

Найбольшага развіцця сетка школ царкоўнага ведамства на Беларусі дасягнула напярэдадні рэвалюцыі 1905—1907 гг. На 1 студзеня 1905 года тут было 4990 царкоўных школ (1217 царкоўнапрыходскіх і 3773 школы пісьменнасці) са 156 812 вучнямі. З іх двухкласных (з 4—5-гадовым навучаннем) было толькі 26 школ, астатнія — аднакласныя з трохгадовым навучаннем. З 1906 г. у выніку шырокай незадаволенасці насельніцтва гэтымі школамі іх колькасць пачала скарачацца. На 1 студзеня 1908 г. было 4027 царкоўных школ са 143 670 вучнямі. На 1 студзеня 1914 г. засталося 2813 школ з 136 900

вучнямі. Параўнанне колькасці вучняў у міністэрскіх і царкоўных школах паказвае, што калі ў 1905 г. у першых было на 50 тыс. вучняў менш, то ў 1914 г. — на 167 тыс. больш, чым у сінадальных школах. Галоўнай прычынай рэзкага падзення колькасці царкоўных школ трэба лічыць нізкі ўзровень у іх вучэбна-выхаваўчай работы. Як адзначалася ў рапарце магілёўскага губернатара ад 23 верасня 1903 г., «толькі вучылішчы Міністэрства народнай асветы можна лічыць рассаднікамі пачатковай адукацыі, бо школы пісьменнасці ніякай карысці не нясуць, а царкоўнапрыходскія школы пастаўлены вельмі нездавальняюча». У большасці з іх выкарыстоўваліся неэфектыўныя, устарэлыя метады навучання (дыктоўкі, літараскладальны спосаб навучання пісьменнасці і чытанню, зубрэнне стараславянскіх тэкстаў і малітваў). А ў школах пісьменнасці за адну-дзве зімы большасць дзяцей не паспявала засвоіць нават навыкі чытання. Царква лічыла галоўнай задачай школы рэлігійнае і вернападданніцкае выхаванне, а не ўзбраенне ведамі. У сотнях царкоўных школ не было выпуску, выкарыстоўвалася фізічнае пакаранне.

Акрамя міністэрскіх і царкоўных школ, пачатковую адукацыю на Беларусі ў пачатку XX ст. можна было атрымаць таксама ў нешматлікіх, але добразабяспечаных чыгуначных, гарадскіх, грамадскіх і габрэйскіх школах. Так, у 1910 г. сярэдні расход грашовых сродкаў на аднаго вучня ў год быў вышэй за ўсё ў чыгуначных і габрэйскіх школах: адпаведна 25,6 і 21,6 руб., а ніжэй за ўсё — у царкоўнапрыходскіх школах і школах пісьменнасці — 7,9 і 2,5 руб. Па Віленскай вучэбнай акрузе сярэдні расход складаў 10,8 руб., у гарадах ён быў роўны 19,3 руб., а ў сельскай мясцовасці ў 2 разы меншы — 9,6 руб. Па губернях акругі гэты паказчык быў найвышэйшым у Ковенскай, а найніжэйшым — у Мінскай губерні.

Ролю павышанай пачатковай школы для «сярэдніх» слаёў гарадскога насельніцтва — дробнай буржуазіі, рамеснікаў, служачых і гандляроў — адыгрывалі гарадскія вучылішчы (па палажэнню 1872 г.). Яны былі закліканы замяніць павятовыя вучылішчы, дзейнасць якіх урадам і грамадскасцю была прызнана нездавальняючай. На Беларусі працэс рэарганізацыі павятовых вучылішчаў у гарадскія быў завершаны толькі ў 1902 г. Знаходзіліся гарадскія вучылішчы ў асноўным у павятовых цэнтрах. Іх колькасць у канцы XIX ст. не перавышала паловы

колькасці гарадоў у беларускіх губернях. На 1 студзеня 1905 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі было 39 гарадскіх вучылішчаў з 37 344 вучнямі. З прычыны вельмі абмежаванай колькасці гэтых вучылішчаў атрыманне павышанай пачатковай адукацыі для большасці насельніцтва было надзвычай цяжкім. Дзеці гарадской і вясковай мелкай шляхты складалі ў 1904 г. ад 70 % да 80 % вучняў гарадскіх вучылішчаў беларускіх губерняў. Большая частка дзяцей рабочых не мела матэрыяльнай магчымасці для доўгага 6-гадовага навучання ў гэтых вучылішчах. І тым не менш гэтыя ўстановы адкрывалі дзецям працоўных доступ да павышанай адукацыі, карысталіся папулярнасцю, а іх колькасць усё ўзрастала. У 1905—1914 гг. сетка гарадскіх вучылішчаў (з 1912 г. — вышэйшых пачатковых вучылішчаў) узрасла на Беларусі з 39 да 82, а колькасць вучняў — з 7344 да 12 432.

Вялікім недахопам гарадскога вучылішча было тое, што яно не давала магчымасці пераходу яго вучняў у сярэднюю вучэбную ўстанову. Даючы адукацыю, якая прынцыпова адрознівалася ад агульнаадукацыйнай праграмы сярэдняй школы, гарадскія вучылішчы сталі ізаляванымі, тупіковымі вучэбнымі ўстановамі ў сістэме школьнай адукацыі. Толькі невялікая колькасць выпускнікоў гарадскіх вучылішчаў (у асноўным дзеці заможных бацькоў) пасля падрыхтоўкі за аплату па дадатковых прадметах мелі магчымасць паступіць ці ў настаўніцкія інстытуты, ці ў гімназіі. Для астатніх адзінай рэальнай перспектывай была практычная дзейнасць.

Стан пачатковай народнай адукацыі найбольш красамоўна характарызаваў паказчык адукацыі, г. зн. працэнт вучняў пачатковых школ да ўсяго насельніцтва. Паказчык адукацыі для беларускіх губерняў у 1894 г. быў наступны: Магілёўская — 3,8 %, Гродзенская — 3,3 %, Мінская — 2,5 %, Віцебская — 2,1 %. У 1911 г. сярэдні паказчык адукацыі беларускіх губерняў (4,7 %) ужо перавышаў сярэдні агульнарасійскі ўзровень (4 %), уступаючы толькі Маскоўскай, Амурскай, Харкаўскай і Прыбалтыйскім губерням і апярэджваючы Кіеўскую, Чарнігаўскую, Варшаўскую, Чарнаморскую і іншыя губерні. З чатырох беларускіх губерняў самая высокая ўдзельная вага вучняў пачатковай школы да колькасці жыхароў была ў Магілёўскай губерні — 5,6 %, што перавышала нават узровень Маскоўскай губерні (5,5 %), а самая нізкая — у Віцебскай і Мінскай губернях — 4,1 %, што тым не менш было вышэй за сярэдні агульнарасійскі паказчык.

Калі ўлічыць, што ў 1894 г. сярэдні паказчык адукацыі ў беларускіх губернях складаў 2,9 %, то гэта значыла, што за 16 гадоў ён узрос на Беларусі ў 1,8 раза.

Сярэдняя адукацыя на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці XIX ст. развівалася марудна. Калі ў 1868 г. тут было 18 сярэдніх вучэбных устаноў з 3255 вучнямі, то ў 1899 г. — 20 з колькасцю навучэнцаў каля 5 тыс. У пачатку XX ст. тэмпы росту колькасці сярэдніх вучэбных устаноў паскорыліся. У пачатку 1905 г. на Беларусі было 23 сярэднія ўрадавыя вучэбныя ўстановы (8 мужчынскіх і 10 жаночых гімназій, 1 мужчынская прагімназія, 3 рэальныя і 1 камерцыйнае вучылішча) з 9117 навучэнцамі. У сетку прыватнай сярэдняй школы ўваходзілі 2 вучэбныя ўстановы I разраду, 12 — II разраду і 65 падрыхтоўчых вучылішчаў III разраду, у якіх навучалася ўсяго каля 7 тыс. чалавек. У 1914 г. на Беларусі было 13 мужчынскіх і 17 жаночых урадавых гімназій, 7 рэальных і 1 камерцыйнае вучылішча, 16 мужчынскіх і 23 жаночыя прыватныя школы I разраду, 5 мужчынскіх і 40 жаночых — II разраду. Ва ўрадавых і прыватных сярэдніх вучэбных установах навучалася ўсяго 31 328 чалавек. Сярэднія школы былі цяжкадаступнымі для дзяцей рабочых і сялян з-за высокай аплаты за навучанне. У 1913 г. у гімназіях Віленскай вучэбнай акругі дзеці шляхты, чыноўнікаў і духавенства складалі 43 %, гарадской буржуазіі, гаспадароў, мяшчан — 37 %, заможных сялян — 20 %. Прыкладна такі ж сацыяльны састаў вучняў быў і ў іншых сярэдніх школах.

На пачатку XX ст. пашырылася сетка сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, галоўнае месца па колькасці сярод якіх займалі настаўніцкія семінарыі, што выпускалі настаўнікаў для пачатковых школ. У 1905 г. на Беларусі былі 4 настаўніцкія семінарыі ў Маладзечне, Полацку, Нясвіжы, Свіслачы. У 1909—1916 гг. зноў былі адкрыты 5 настаўніцкіх семінарый: мужчынская ў Рагачове і 4 жаночыя ў Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску.

Значным крокам наперад у справе падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў было адкрыццё на тэрыторыі Беларусі трох настаўніцкіх інстытутаў: у Віцебску — у 1910 г., Магілёве — 1913, Мінску — 1914. Настаўніцкія інстытуты не з'яўляліся вышэйшымі вучэбнымі ўстановамі, аднак праграма навучання ў іх была шырэйшая, чым у семінарыях. Яны рыхтавалі настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Педагагічных вучэбных устаноў па падрыхтоўцы настаўнікаў для гарадскіх вучы-

лішчаў і сярэдніх школ на Беларусі не было. Настаўнікаў для іх прысылалі з Масквы, Пецярбурга, Кіева.

Узровень падрыхтоўкі настаўнікаў у разгледжаны перыяд павысіўся. Калі ў 60—70-я гг. XIX ст. настаўнікамі ў народных школах былі людзі без спецыяльнай адукацыі, то ў 1899 годзе настаўнікаў, атрымаўшых спецыяльную падрыхтоўку, было ў сярэднім 30—35 % ад агульнай колькасці настаўнікаў пачатковых школ. Тым не менш і ў наступныя гады нездавальняючыя тэмпы росту кантынгенту навучэнцаў педагагічных вучэбных устаноў вялі нават да пагаршэння забеспячэння школ кваліфікаванымі кадрамі. Так, у Магілёўскай губерні ў 1909 г. 56,7 % настаўнікаў народных вучылішчаў не мелі педагагічнай адукацыі, а ў 1913 г. — ужо 73 %. Кваліфікаваных настаўнікаў не хапала і ў іншых губернях.

Пасля таго як у 1864 г. Горы-Горыцкі земляробчы інстытут Магілёўскай губерні быў пераведзены ў Пецярбург, на Беларусі не засталося вышэйшых навучальных устаноў, хоць патрэба ў вышэйшай школе дыктавалася развіццём эканомікі і культуры, працэсам нацыянальнага адраджэння беларускага народа. Амаль усе губернскія гарады Беларусі выказвалі жаданне мець у сябе вышэйшую навучальную ўстанову. Асабліва актыўна гэтае пытанне абмяркоўвалася ў гарадской думе, прадпрымальніцкіх і шляхецкіх аб'яднаннях, сярод інтэлігенцыі Мінска, якія адзначалі, што ВНУ неабходна адкрыць менавіта ў іх горадзе, бо ён знаходзіцца ў цэнтры беларускіх губерняў і з'яўляецца да таго ж адным з буйнейшых у краі як па колькасці насельніцтва, так і па ўзроўню развіцця прамысловасці. Але мясцовыя ўлады не падтрымлівалі прапановы аб адкрыцці ў Мінску універсітэта, з якой выступіла гарадская дума ў 1903 г. Абгрунтоўваючы сваё адмаўленне, мінскі віцэ-губернатар заявіў: «У Мінску і без таго моцны рэвалюцыйны настрой сярод моладзі».

У далейшым Мінская і Віцебская гарадскія думы, прадпрымальніцкія і грамадскія аб'яднанні неаднаразова падымалі пытанне перад МНА аб адкрыцці універсітэта ці тэхнічнага інстытута. У адказ на гэта ў 1913 г. міністр асветы Л. А. Касо заявіў, што адкрыццё універсітэта на Беларусі — справа няспешная і не так хутка настане яе чарга. Вышэйшую адукацыю беларусы атрымлівалі ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве і іншых універсітэцкіх цэнтрах Расіі.

Вельмі сумная карціна агульнага стану народнай

асветы на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. была пададзена ў вядомым капітальным выданні «Россия. Полное географическое описание нашего отечества». У ім канстатавалася: «Нягледзячы на павелічэнне колькасці школ у апошні час, наша вобласць не багатая вучэбнымі ўстановамі: ВНУ няма зусім, сярэднія існуюць толькі ў больш багатых гарадах, і толькі ніжэйшая адукацыя, хоць і нельга назваць яе бліскучай, дае магчымасць азнаёміцца з адукацыйнымі сродкамі краю». Нездавальняючае становішча асветы, і ў першую чаргу сярод працоўных, прызнаваў нават афіцыйны друк таго часу. У прыватнасці, газета «Полацкі лісток» у 1913 г. адзначала высокі кошт навучання, нізкі ўзровень ведаў вучняў пачатковых школ горада і адмоўна ацэньвала школьныя падручнікі.

Вельмі важным з пункту погляду вывучэння беларускага нацыянальнага адраджэння, барацьбы нацыянальна-дэмакратычных сіл і шырокіх мас насельніцтва Беларусі за навучанне на роднай мове мае даследаванне нацыянальнага складу навучэнцаў Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX — пачатку XX ст. Гэта пытанне з'яўляецца «белай плямай» у беларускай гісторыка-педагагічнай літаратуры. Яго фактычна абмінулі ў абагульняючых працах па гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі. Між тым у матэрыялах агульнарасійскага перапісу насельніцтва 1897 г. і Аднадзённага перапісу пачатковых школ Расійскай імперыі ад 18 студзеня 1911 г. змяшчаюцца даныя адносна нацыянальнага саставу насельніцтва і навучэнцаў губерняў краіны.

Па перапісу 1897 г., на тэрыторыі сучаснай Беларусі пражывала 6579,6 тыс. чалавек. З іх 73 % складалі беларусы, 13,8 — яўрэі, 4,7 % — украінцы, 4,3 % — рускія, 2,5 % — палякі і 1,7 % — іншыя нацыянальнасці. У пяці заходніх губернях жыло 5408,4 тыс. беларусаў.

Размеркаванне нацыянальных груп па губернях было наступным: беларусы (разам з украінцамі) складалі 82,6 % насельніцтва Магілёўскай, 76,4 % — Мінскай, 66,7 % — Гродзенскай, 56 % — Віленскай і 52,9 % — Віцебскай губерняў. Доля рускіх вагалася ад 3,4 % у Магілёўскай да 13,3 % у Віцебскай губернях, палякаў — ад 1,4 % у Магілёўскай да 10,1 % у Віленскай губернях, яўрэяў — ад 11,7 % у Віцебскай да 17,4 % у Гродзенскай губернях. Такім чынам, найбольшы працэнт беларусаў пражываў у Магілёўскай, найменшы — у Віцебскай

губерні, у якой ён ледзь перавышаў палову ўсяго насельніцтва. Удзельная вага рускіх, наадварот, была найбольшай у Віцебскай, а найменшай у Магілёўскай губерні. Такія суадносіны этнічных груп насельніцтва як у цэлым па Паўночна-Заходнім краі, так і па губернях адбіваліся на нацыянальным саставе навучэнцаў.

Дастаткова красамоўным па выніках Аднадзённага перапісу 1911 г. быў і такі паказчык, як колькасць пачатковых школ МНА і Свяшчэннага Сінода на 100 жыхароў сярод розных этнічных груп. Па Віленскай акрузе ён складаў: рускіх — 4,16 %, у тым ліку велікарусаў — 16,47 %, маларусаў — 2,67 %, беларусаў — 2,98 %, далей ішлі латышы — 2,88 %, палякі — 2,67 %, немцы — 2,53 %, літоўцы — 1,91 %, яўрэі — 1,68 %. Відавочна, што велікарусы значна апярэджвалі ўсе іншыя нацыянальнасці, у тым ліку і беларусаў, па колькасці навучэнцаў на 100 жыхароў.

У 1911 г. у пачатковых школах МНА і Свяшчэннага Сінода Віленскай вучэбнай акругі навучалася (у акругленых лічбах): 336 тыс. рускіх (у тым ліку велікарусаў — 118 тыс., маларусаў — 13 тыс., беларусаў — 205 тыс.), 30 тыс. яўрэяў, 21 тыс. літоўцаў, 19 тыс. палякаў, 12 тыс. латышоў і жмудзі. Усяго ў акрузе было 425 911 тыс. вучняў.

Калі ўзяць размеркаванне вучняў па роднай мове ў працэнтах да агульнага іх ліку па губернях, то, па даных перапісу 1911 г., самая вялікая ўдзельная вага вучняў, назваўшых беларускую мову сваёй роднай мовай, была ў Гродзенскай губерні — 69,18 % хлопчыкаў і 55,49 % дзяўчынак. Затым ішлі Віленская — адпаведна 65,32 % і 51,96 %, Мінская — 63,39 % і 50,29 %, Магілёўская — 50,62 % і 43,14 %, Віцебская — 29,89 % і 23,54 %. У цэлым па Віленскай вучэбнай акрузе беларускую мову назвалі роднай 52,02 % хлопчыкаў і 40,37 % дзяўчынак.

Самы высокі працэнт вучняў, назваўшых роднай рускую мову, быў у Віцебскай губерні — 47,04 % хлопчыкаў і 48,3 % дзяўчынак. Пасля ішлі Магілёўская, Віленская, Мінская, Гродзенская і Ковенская губерні. У цэлым па Віленскай акрузе гэты паказчык быў 27,12 % сярод хлопчыкаў і 30,05 % сярод дзяўчынак. Больш за ўсё ўкраінцаў навучалася ў школах Магілёўскай і Гродзенскай губерняў — каля 4 %, а ў Віленскай губерні ніводны вучань не назваў украінскую мову сваёй роднай. У адносінах да польскай мовы на першых двух месцах

ішлі Ковенская і Віленская губерні — каля 10—13 %, за імі — Гродзенская, Віцебская, Мінская і Магілёўская губерні. Самая высокая доля яўрэйскіх навучэнцаў была таксама ў Ковенскай і Віленскай губернях. Па беларускіх губернях па гэтаму паказчыку быў такі расклад (акруглена): Мінская — 4 % хлопчыкаў і 14 % дзяўчынак, Гродзенская — адпаведна 5 % і 13 %, Віцебская — 5 % і 9 %, Магілёўская — 3 % і 9 %. У цэлым па акрузе — 4,86 % і 12,99 %.

Па такому паказчыку, як размеркаванне вучняў па роднай мове сярод пачатковых школ для двух ведамстваў — Міністэрства народнай асветы і Свяшчэннага Сінода, — беларусаў была прыблізна аднолькавая колькасць у школах абодвух ведамстваў: МНА — 48,33 %, Сінода — 49,80 %. Рускіх у царкоўных школах было ў два разы больш, чым у міністэрскіх. Украінцаў было на 1 % больш у школах МНА. Пераважная колькасць палякаў, літоўцаў і яўрэяў вучылася ў міністэрскіх школах.

Ва ўзроўні развіцця народнай адукацыі паміж асобнымі беларускімі губернямі меліся даволі значныя адрозненні. Гэта можна выявіць з прыведзенага вышэй аналізу шэрага важнейшых паказчыкаў. Калі паспрабаваць абагульніць некаторыя рэгіянальныя асаблівасці і спецыфічныя рысы палітыкі царскага ўрада, кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі і губернскіх улад у вобласці асветы адносна асобных губерняў, то можна прыйсці да наступнага заключэння.

Урад у канцы стагоддзя лепш за ўсё фінансаваў адукацыю ў Віцебскай губерні, расходы на якую з разлікам на аднаго чалавека перавышалі затраты на Магілёўскую губерню ў 2,5 раза. Гэта было абумоўлена, на наш погляд, імкненнем царызму паставіць у больш выгаднае становішча губерню з самым высокім працэнтам рускага насельніцтва ва ўсім Паўночна-Заходнім краі, у той час як у Магілёўскай губерні доля рускіх была найменшай, а беларусаў — найбольшай. У Віцебскай і Мінскай губернях былі самыя высокія тэмпы росту пачатковых школ, якія павялічыліся за другую палову XIX ст. адпаведна ў 20 і 28 разоў. У Віцебску быў адкрыты першы на Беларусі настаўніцкі інстытут, пасля чаго такія інстытуты былі створаны ў Мінску і Магілёве.

Аднак узровень народнай адукацыі ў беларускіх губернях прама не залежаў ад урадавых расходаў на

яго. Так, Магілёўская губерня на пачатку XX ст. апярэджвала іншыя беларускія губерні па ахопу дзяцей навучаннем, была наперадзе па паказчыку адукацыі, у той час як Віцебская знаходзілася на апошнім месцы. У Магілёўскай губерні ў 1894 г. былі самымі высокімі: частата адукацыі (г. зн. колькасць пачатковых школ на колькасць квадратных вёрстаў), колькасць школ на на колькасць жыхароў, колькасць народных вучылішчаў і колькасць вучняў у іх. Па ўзроўню пісьменнасці насельніцтва наперадзе іншых ішла Гродзенская, апярэджваючы Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні. Па ахопу дзяцей навучаннем у 1913 г. беларускія паветы Віленскай губерні больш чым ў два разы ўступалі Магілёўскай губерні.

У 1913 г. найбольшая колькасць навучэнцаў усіх навучальных установаў на 1 тыс. жыхароў прыходзілася на Магілёўскую губерню — 67,8 %; далей ішлі Гродзенская — 60,3; Мінская — 53,6; Віцебская — 48,4 і Віленская — 31,2 %. Па колькасці сярэдніх агульнаадукацыйных вучэбных установаў лідзіравала Мінская губерня — 31, у той час як у Гродзенскай было 26, Магілёўскай — 22, Віцебскай — 6, Віленскай — 5. Па колькасці навучэнцаў у гэтых вучэбных установах наперадзе таксама была Мінская губерня — акруглена 9,5 тыс., апярэджваючы Гродзенскую — 7,5 тыс., Магілёўскую — 6,5 тыс., Віленскую — 3,5 тыс., Віцебскую — 3 тыс. чалавек. Найбольшая колькасць ніжэйшых вучэбных установаў была ў Гродзенскай губерні — у два разы большая, чым у Віцебскай. Па колькасці вучняў у іх наперадзе была Магілёўская губерня, апярэджваючы Мінскую, Віцебскую і Віленскую (даных па Гродзенскай няма). Звесткі па агульнай колькасці вучэбных установаў наступныя: Магілёўская губерня — 2763, Мінская — 2731, Гродзенская — 2528, Віцебская — 1710, Віленская — 1086. Па колькасці навучэнцаў у іх у 1913 г. мы маем наступную карціну (акруглена): Гродзенская губерня — 199 тыс., Мінская і Магілёўская — па 159 тыс., Віцебская — 92 тыс., Віленская — 63 тыс.

Прыведзеныя лічбы сведчаць аб тым, што напярэдадні першай сусветнай вайны сярод беларускіх губерняў існавалі даволі значныя адрозненні па ўзроўню развіцця пачатковай і сярэдняй адукацыі. З пэўнымі агаворкамі можна зрабіць вывад аб тым, што пачатковая адукацыя была больш за ўсё развітая ў Магілёўскай, а сярэдняя — у Мінскай губернях, пісьменнасць насель-

ніцтва была самай высокай у Гродзенскай губерні. Па развіццю сеткі навучальных устаноў усіх тыпаў наперадзе былі Магілёўская і Мінская губерні, апярэджваючы Гродзенскую і асабліва значна — Віцебскую і Віленскую губерні. Так, Мінская губерня перавышала па колькасці сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў Віцебскую і Віленскую губерні ў 5—6 разоў. Нераўнамернасць развіцця народнай асветы на Беларусі ў пачатку XX ст. з'явілася вынікам як папярэдняга яе развіцця з сярэдзіны XIX ст., так і праявай і ўзмацненнем новых тэндэнцый, характэрных для перыяду 1890—1917 гг.

У гады першай сусветнай вайны ўстановы народнай асветы Беларусі апынуліся ў цяжкім становішчы. У сувязі з акупацыяй нямецкімі войскамі значнай часткі тэрыторыі Беларусі шмат сярэдніх і спецыяльных вучэбных устаноў, вышэйшых пачатковых вучылішчаў, настаўніцкіх семінарый былі эвакуіраваны ў Магілёўскую і Віцебскую губерні альбо ў глыб Расіі, дзе працавалі другая і трэцяя змены мясцовых школ. Пачатковыя школы ў зоне ваенных дзеянняў былі закрыты альбо заняты пад шпіталь.

Беларусь уступіла ў эпоху прамысловага капіталізму, маючы нізкія зыходныя пазіцыі ў сферы народнай асветы, уступаючы па важнейшых паказчыках адукацыі цэнтральным губерням Расіі. Патрэбы развіцця капіталізму, кансалідацыі беларускай нацыі дыктавалі неабходнасць шырокай падрыхтоўкі пісьменных работнікаў і адукаваных спецыялістаў, нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыі. За паўстагоддзя пасля адмены прыгонніцкага права беларускія губерні значна прасунуліся наперад па шляху распаўсюджвання пісьменнасці, пераўзышоўшы па некаторых важных паказчыках народнай адукацыі сярэдні агульнарасійскі ўзровень. Аднак школа ў Паўночна-Заходнім краі, як і ў цэлым па краіне, не паспявала за хуткай плынню жыцця. Напярэдадні першай сусветнай вайны, нягледзячы на пэўныя рэформы, распачатыя Міністэрствам народнай асветы і кіраўніцтвам Віленскай вучэбнай акругі пад уплывам рэвалюцыі 1905—1907 гг., галоўныя задачы, што стаялі на парадку дня беларускага нацыянальна-дэмакратычнага і грамадска-педагагічнага руху, заставаліся нявырашанымі.

## Падмурак дэмакратызму

Нездавальняючы стан усёй сістэмы народнай асветы на Беларусі ў пачатку XX ст. стаў сур'ёзнай перашкодай на шляху сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-культурнага прагрэсу беларускага народа. Відавочнай была неабходнасць неадкладнай і карэннай перабудовы школьнай справы ў мэтах прывядзення яе ў адпаведнасць з узроўнем развіцця эканомікі, навукі і культуры, патрэбамі грамадства ва ўсеагульным і даступным навучанні, задачамі нацыянальнага адраджэння.

Дэмакратызацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, глыбокіх змен у школьнай палітыцы царскага ўрада патрабаваў шырокі спектр сацыяльна-палітычных сіл: буржуазна-ліберальныя колы, нацыянальна-дэмакратычны рух, дробная буржуазія, сялянства, пралетарыят і іх палітычныя партыі, інтэлігенцыя і шырокая грамадскасць. Гэты ўплывовы, хоць і разнародны палітычны лагер прывёў у дзеянне новы магутны фактар развіцця народнай асветы — грамадска-педагагічны рух, які стаў адной са складаных частак агульнай вызваленчай барацьбы. Пачынаючы з першых гадоў XX ст. упершыню ў гісторыі Беларусі сацыяльна-педагагічныя праблемы сталі прадметам шырокага грамадскага абмеркавання. І не толькі абмеркавання, але і грамадска-палітычнай дзейнасці.

Грамадска-педагагічны рух, у якім прымалі ўдзел настаўніцтва, бацькі і вучні, звязаныя з Беларуссю студэнты і выкладчыкі сталічных вузаў, грамадскасць і інтэлігенцыя, аказваў вялікі ўплыў на ўсе бакі жыцця і дзейнасці школы, на развіццё педагагічнай думкі. На пачатку XX стагоддзя ва ўмовах уздыму рэвалюцыйна-вызваленчага руху ўсенародная барацьба за дэмакратызацыю школьнай справы на Беларусі ўздымаецца на якасна новую ступень. Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух разглядаў звяржэнне самадзяржаўя як рашаючую ўмову карэннай перабудовы народнай асветы на дэмакратычных пачатках.

Процістаянне і класавая барацьба паміж трыма галоўнымі палітычнымі лагерамі Расіі ў перыяд буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый 1905—1907 гг. і 1917 г. — самадзяржаўем, буржуазіяй і рэвалюцыйнай дэмакратыяй — праявіліся і ў такім важным пытанні грамадскага развіцця, як асвета і школа.

Самадзяржаўе, якое было праціўнікам перамен, затармажвала развіццё капіталізму і культуры, стрымлівала

і скажала буржуазную эвалюцыю рускай школы. Школа з'яўлялася адной з найбольш кансерватыўных частак дзяржаўнай феадальна-прыгонніцкай надбудовы. Таму яе, як і ўсю гэтую надбудову, ахоўваў ад усялякіх радыкальных змен царскі ўрад. Асабліва рэакцыйны характар школьная палітыка царызму мела ў нацыянальных раёнах Расійскай імперыі. Як адзначалася, на Беларусі яна праяўлялася ў прымусовай русіфікацыі, забароне навучання на роднай мове, насаджэнні праваслаўя, стрымліванні развіцця вышэйшай адукацыі.

Буржуазія, інтарэсы якой у органах асветы прадстаўлялі гарадскія самакіраванні, земствы і настаўніцтва сярэдняй школы, выступала за пераўтварэнне існаваўшай сістэмы адукацыі і навучання, прывядзенне яе ў адпаведнасць з патрэбамі капіталістычнага развіцця. Буржуазныя колы выступалі за ўвядзенне ўсеагульнага навучання, перашкаджалі развіццю сеткі царкоўных школ шляхам скарачэння асігнаванняў на іх забеспячэнне, садзейнічалі пашырэнню сеткі народных вучылішчаў, патрабавалі ўстанаўлення пераемнасці паміж усімі тыпамі школ, адмены пераводных іспытаў, змякчэння ўнутрышкольнага рэжыму сярэдняй школы.

Гэтыя патрабаванні адлюстроўвалі класавыя інтарэсы буржуазных слаёў. Увядзенне ўсеагульнага пачатковага навучання забяспечыла б вялікі прыток у эканоміку пісьменнай рабочай сілы. У галіне сярэдняй адукацыі прадстаўнікі буржуазіі выступалі толькі за ўраўнаванне ў правах з мужчынскімі ўрадавымі гімназіямі ўсіх іншых тыпаў сярэдняй школы. Зацікаўленыя ў развіцці ніжэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі земствы, гарадскія самакіраванні і грамадскасць садзейнічалі распаўсюджванню прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Імкнуліся яны, як адзначалася, і да адкрыцця ВНУ на тэрыторыі Беларусі, аднак іх спробы скончыліся няўдачай з-за супрацьдзеяння царскага ўрада. У цэлым буржуазія дамагалася ўзнаўлення школьнай працы шляхам рэформы зверху.

З 90-х гадоў XIX ст. актывізаваўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, асноўнай сілай якога выступала нацыянальная інтэлігенцыя, перш за ўсё студэнцтва і настаўніцтва. Яны разгарнулі вывучэнне гістарычнага мінулага беларускага народа, яго культуры, мовы, фальклору. Ва ўмовах рэакцыі, адсутнасці масавага рэвалюцыйнага руху падобнае асветніцтва было найбольш распаўсюджанай формай праяўлення апазіцыйных, палі-

тычна не аформленых настрояў, уласцівых беларускай інтэлігенцыі.

Своеасаблівым маніфестам беларускага нацыянальнага адраджэння з'явілася апублікаванне ў 1891 г. Ф. К. Багушэвічам прадмовы да «Дудкі беларускай», у якой ён упершыню зразумела і выразна сказаў, што беларусы — гэта самастойны народ у сям'і славянскіх народаў, што, нягледзячы на шматвяковы прыгнёт, беларускі народ захаваў сваю мову, культуру, тэрыторыю, што ён павінен заняць адпаведнае месца сярод «пабрацімаў» нашых — славянскіх народаў. Ф. К. Багушэвіч першым з беларускіх пісьменнікаў выступіў у абарону роднай мовы і літаратуры, заклікаў суайчыннікаў не забываць сваю родную мову.

У 1902 г. студэнцкая моладзь з універсітэцкіх гарадоў краіны і прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі заснавалі ў Мінску партыю пад назвай «Беларуская рэвалюцыйная грамада». На I з'ездзе ў Вільні ў 1903 г. яна была перайменавана ў Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ). Праграма БСГ, прынятая ў 1903 г., патрабавала нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі як федэратыўнай рэспублікі, культурна-нацыянальнай аўтаноміі беларусаў, права свабоднага карыстання роднай мовай, у тым ліку і ў школе, выдання на ёй літаратуры і падручнікаў. З надыходам рэакцыі пасля першай расійскай рэвалюцыі БСГ прыняла рашэнне аб роспуску партыі, а яе члены ў асноўным заняліся легальнай нацыянальна-культурнай і асветніцкай работай, аб'яднаўшыся вакол рэдакцыі газеты «Наша ніва».

Ва ўмовах абвастрэння сацыяльна-класавых і нацыянальных супярэчнасцей, развіцця працэсаў беларускага нацыянальнага адраджэння ўзмацнялася ўвага і інтарэс розных сацыяльна-палітычных сіл да праблем асветніцтва і школы. У друку і педагагічнай перыёдыцы, дакументах буржуазных, дробнабуржуазных, нацыянальна-дэмакратычных і рабочых партый і арганізацый, на сходах і сходках рабочых і сялян, настаўнікаў і навучэнцаў, бацькоў, інтэлігенцыі, на педагагічных саветах, настаўніцкіх з'ездах, нарадах выстаўляліся патрабаванні ўсеагульнай пачатковай адукацыі, паляпшэння прафесійнага навучання, аддзялення школы ад царквы і перадачы царкоўных школ земствам, раўнапраўя прадстаўнікоў мужчынскага і жаночага полу на адукацыю, пераемнасці пачатковай і сярэдняй школы, дэмакратызацыі

ўнутрышкольнага рэжыму, рэформы сярэдняй школы, паляпшэння матэрыяльнага і прававога становішча настаўніка, допуску бацькоўскіх арганізацый да ўдзелу ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці школы.

Грамадска-педагагічны рух ужо не маглі ігнараваць і органы мясцовай адміністрацыі. У прыватнасці, пад уплывам шырокага руху за ўсеагульнае навучанне, які ахапіў Расію ў 90-я гады XIX ст., Мінская гарадская дума выпрацавала ў 1898 г. праект увядзення ў горадзе ўсеагульнага пачатковага навучання дзяцей ва ўзросце ад 7 да 12 гадоў. Гэтую задуму планавалася здзейсніць за кошт асобнага падатку з грамадзян (асноўны цяжар лёг бы на плечы працоўных). Аднак праект не быў рэалізаваны. Мінскаму губернатару стала вядома аб рэзалюцыі цара на справаздачы харкаўскага губернатара: «Лепш было б, каб гарадское кіраўніцтва займалася сваімі справамі, чым абмеркаваннем такога шырокага пытання, як пытанне аб усеагульным навучанні». Гэтага аказалася дастаткова, каб дух ліберальнага пражэкцёрства ў дзеячаў гарадскога кіраўніцтва знік.

У рух за ўсеагульнае навучанне ўключыліся народныя масы. Аб размаху гэтага руху сведчыць той факт, што ў канцылярыях Мінскай губерні на 1 студзеня 1904 г. знаходзілася 473 незадаволеныя патрабаванні аб адкрыцці школ, а ў Віцебскай — 250. Аб адносінах сялянства да справы народнай адукацыі дастаткова зразумела гаворыць наступная вытрымка са справаздачы мінскага губернатара за 1900 г.: «Што сялянскае насельніцтва Мінскай губерні любіць і даражыць народнай школай, даказваецца не толькі перапаўненнем вучылішчаў Міністэрства народнай асветы навучэнцамі, але і тымі дужа буйнымі затратамі, якія робяцца штогод сялянскімі таварыствамі на ўтрыманне гэтых вучылішчаў».

Эфектыўнай формай барацьбы працоўных за дэмакратызацыю школы было «тайнае» навучанне — адкрыццё насельніцтвам школ без дазволу вучэбных органаў. У іх часта выкарыстоўваліся забароненыя ўладай вучэбныя дапаможнікі, не выкладаўся закон божы, настаўнікамі нярэдка былі рэвалюцыйна настроеныя навучэнцы і педагогі. Сетка гэтых школ ахоплівала практычна ўсю Беларусь.

Масавыя палітычныя выступленні пралетарыяту садзейнічалі рэвалюцыйнаму руху навучэнцаў. Навучэнцы сярэдніх навучальных устаноў нярэдка былі ўдзельні-

камі вулічных дэманстрацый і маніфестацый рабочых. Пад уздзеяннем рабочага руху яны сталі арганізоўваць і самастойныя палітычныя выступленні. Так, у сакавіку 1902 г. антыўрадавую маніфестацыю арганізавалі навучэнцы Пінскага рэальнага вучылішча. У 1903 г. навучэнцы Горацкага земляробчага вучылішча, частка з якіх уваходзіла ў склад Горацкай сацыял-дэмакратычнай групы, правялі дзве дэманстрацыі. Да лета 1903 г. утварылася Магілёўская сацыял-дэмакратычная арганізацыя навучэнцаў, якая аб'яднала прадстаўнікоў усіх вучэбных устаноў горада. Яна выдавала два гектаграфічныя часопісы: «Абуджэнне» і «Світанне». Навучэнцы сярэдніх вучэбных устаноў Мінска 1 сакавіка 1903 г. удзельнічалі ў палітычнай маёўцы рабочых, усе ўдзельнікі якой (каля 270 чалавек) былі арыштаваны.

Рэзкае незадавальненне навучэнцаў выклікаў існуючы ўнутрышкольны рэжым. У сярэдніх вучэбных установах праследавалі самую малую праяву крытычных адносін да існуючага строю. Аб цяжкай атмасферы ў сярэдняй школе гаворыць наступны факт. У 1899 г. назначаная папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі камісія распрацавала правілы пазакласнага нагляду за навучэнцамі рэальных вучылішчаў і гімназій Мінска, згодна з якімі павінен быў кантраляваца кожны крок вучня. Сочка ўстанаўлівалася ў тэатры, на катку, трэку, дома. Зімой і летам гімназісты павінны былі насіць форменнае паліто, зашпіленае на ўсе гузікі. Без паліто дазвалялася хадзіць толькі ў белым касцюме з белай фуражкай.

Перад самай рэвалюцыяй 1905—1907 гг. і ў першыя яе месяцы папячыцель Віленскай вучэбнай акругі імкнуўся прадухіліць распаўсюджванне рэвалюцыйных настрояў сярод навучэнцаў і выдаў шэраг указанняў. Сярод іх былі такія, як: «Аб абароне навучэнцаў ад рэвалюцыйнага ўплыву», «Аб мерах па папярэджванню хваляванняў сярод навучэнцаў», «Аб штодзённым аглядзе вучэбных памяшканняў з мэтай канфіскацыі пракламацый», «Аб узмацненні нагляду за вучнямі па-за сценамі навучальных устаноў». Але гэтыя цыркуляры не прынеслі жаданага выніку.

Навучэнцы прынялі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гг. Гэта праявілася ў чытанні нелегальнай літаратуры, стварэнні сацыял-дэмакратычных гурткоў навучэнцаў, арганізацыі забастовак пратэсту, распаўсюджванні пракламацыйнай літаратуры і ўдзеле ў палітычных дэманстрацыях.

На сходцы навучэнцаў Мінскай мужчынскай гімназіі, што адбылася 17 лютага 1905 г., была прынята рэзалюцыя з 20 пунктаў, прадстаўленая затым дырэктару гімназіі. У ёй, у прыватнасці, былі патрабаванні адмены пазакласнага нагляду і тэрміновага дазволу свабоднага наведвання бібліятэк, тэатраў і іншых публічных устаноў, адмены вобыску, інстытутаў інспекцыі і педэляў (наглядчыкаў за навучэнцамі), абавязковага нашэння формы, патрабаванні свабоды арганізацыі гурткоў і публічнага абмеркавання патрэб гімназістаў, неўмяшання школьнага кіраўніцтва ў асабістае жыццё вучняў, ветлівых адносін да іх з боку настаўнікаў, памяншэння платы за навучанне. Акрамя гэтых патрабаванняў акадэмічных свабод, гімназісты выставілі і такія сацыяльна значныя і надзённыя патрабаванні, як: адмена нацыянальных абмежаванняў для навучэнцаў і настаўнікаў, выкладанне для кожнай нацыянальнасці сваёй роднай мовы як аднаго з вучэбных прадметаў, выкладанне закона божага для кожнай нацыянальнасці на роднай мове, неабавязковае наведванне богаслужэння і свабода гутарковай мовы.

Падобныя рэзалюцыі з аналагічнымі патрабаваннямі былі прыняты і на сходах іншых сярэдніх навучальных устаноў Мінска, што сведчыла, на думку папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі, аб папярэдняй падрыхтоўцы гэтых петыцый «на якім-небудзь агульным сходзе навучэнцаў...». Характэрна, што на сумесным сходзе бацькоў, навучэнцаў і педсавета Мінскай мужчынскай гімназіі, які прайшоў у той жа дзень — 17 лютага, бацькі выказалі тыя ж пажаданні, што і гімназісты ў сваіх 20 пунктах. Гэты сход, па словах папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі, паказаў, што беспарадкі ў гімназіі выкліканы агульным браджэннем сярод мясцовага грамадзянства, і з'явіўся часткова як адлюстраванне настрою бацькоў, часткова як вынік дзейнасці студэнтаў і іншых асоб, якія належаць сацыял-дэмакратычнай партыі.

Хваляванні сярод навучэнцаў не супакойваліся і ў 1906—1907 гг., аднак спад рэвалюцыйнага руху прывёў да паступовага іх затухання. Пасля разгубленасці і збянтэжанасці, якія ахапілі не толькі настаўнікаў, але і кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі, апошняе распачало рашучыя дзеянні па «навядзенню парадку». Рашэннем Міністэрства народнай асветы ад 25 кастрычніка 1905 г. былі забаронены сходкі навучэнцаў ніжэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Да студзеня 1906 г.

з сярэдніх навучальных устаноў Віленскай вучэбнай акругі было звольнена без права паступлення ў якую-небудзь навучальную ўстанову 160 чалавек «за ўдзел у беспарадках ці палітычную нядобранадзейнасць». Узмацніўся палітычны нагляд за настаўнікамі і вучнямі.

Цікавай, але ў той жа час і малавядомай старонкай у гісторыі руху сярод школьнай моладзі былі выступленні навучэнцаў духоўных семінарый. Аб гэтым амаль нічога не гаворыцца ў беларускай гісторыка-педагагічнай літаратуры. А між тым у гады першай расійскай рэвалюцыі хваляванні і незадаволенасць ахапілі духоўныя семінарыі, што рыхтавалі настаўнікаў духоўных вучылішчаў і былі прызваныя стаць, па разліках манархічна-рэлігійнай вярхушкі, апорай самадзяржаўя, праваслаўя і народнасці.

Адным з цэнтраў такіх хваляванняў стала Віцебская духоўная семінарыя. Па словах стацкага саветніка Арнацкага, які праводзіў у кастрычніку 1907 г. рэвізію гэтай семінарыі, «выпадкі захаплення навучэнцаў вызваленчым рухам» пачалі заўважацца яшчэ на пачатку 1904/05 навучальнага года. Гэта выяўлялася ў тым, што «семінарысты замест сваёй прамой справы больш займаюцца living рознымі рэфармацыйнымі пытаннямі — аб абнаўленні школы, аб лепшым сацыяльным і дзяржаўным ладзе і г. д., чытаюць ліберальныя газеты і кнігі, а некаторыя ўступаюць нават у зносіны з пражываючымі ў Віцебску завадатарамі вызваленчага руху і атрымліваюць ад іх нелегальныя выданні».

У лютым 1905 г. семінарысты правялі 4 сходкі, прычым на апошніх дзвюх прысутнічалі па даручэнню семінарскага праўлення некаторыя з выкладчыкаў для выслухвання патрабаванняў выхаванцаў. Гэтыя патрабаванні насілі акадэмічны характар і былі накіраваныя на аслабленне ўнутрысемінарскага рэжыму і дэмакратызацыю вучобы і адпачынку навучэнцаў: стварэнне гурткоў самаадукацыі, удзел прадстаўнікоў старэйшых класаў на педагагічных сходах праўлення семінарыі, адмена пераводных экзаменаў, увядзенне лекцыйнага метаду выкладання ў старэйшых класах, паляпшэнне стану семінарыі.

Усе патрабаванні, за выключэннем патрабавання семінарыстаў «звольніць рэктара і наглядчыкаў», выкладчыкі, якія прысутнічалі на сходках, прызналі «карыснымі ў справе лепшага ўладкавання семінарскага жыцця», а праўленне семінарыі вырашыла прасіць епіскапа Полацкага выканаць іх. Але той не даў дазволу і ўказаў

праўленню і выкладчыкам на «няправільнае абмеркаванне» пытанняў, пастаўленых у вучнёўскай петыцыі.

Калі параўнаць патрабаванні віцебскіх семінарыстаў з выстаўленымі ў той жа час (люты 1905 г.) 20 пунктамі навучэнцаў мінскіх сярэдніх навучальных устаноў, то кідаецца ў вочы адсутнасць у семінарыстаў патрабаванняў сацыяльна-палітычнага гучання, свабоды выкладання на роднай мове. На гэта ўплывалі, магчыма, і сам характар навучальнай установы, і пэўны нацыянальны і рэлігійны склад яго выхаванцаў, і заўважаныя вышэй асаблівасці Віцебскай губерні, у якой доля рускага насельніцтва была найбольшай, а беларускага — найменшай з усіх беларускіх губерняў. Але галоўнае заключалася ў тым, што цэнтралізаваная сістэма Рускай праваслаўнай царквы, якая была адным з асноўных сродкаў ажыццяўлення русіфікатарскай палітыкі самадзяржаўя на нацыянальных ускраінах імперыі, не магла паставіць пад сумненне пытанне аб неабходнасці выкладання на рускай мове ці аб магчымасці ўвядзення выкладання на роднай мове. Вяртаючыся да параўнання пазіцый семінарыстаў і гімназістаў, патрэбна адзначыць значна большую ступень узаемнай падтрымкі і салідарнасці паміж семінарыстамі і іх выкладчыкамі (у асноўным грамадзянамі свецкага паходжання), чым паміж навучэнцамі і выкладчыкамі гімназій.

У сувязі з пачаткам Усерасійскай кастрычніцкай палітычнай стачкі хваляванні ў Віцебскай духоўнай семінарыі ўзмацніліся. 19 кастрычніка 1905 г. семінарысты разам з яўрэйскай моладдзю прынялі ўдзел у пахаванні забітых падчас чарнасоценных пагромаў грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці. Пахаванню быў нададзены характар рэвалюцыйнай маніфестацыі. На чырвоных і чорных сцягах маніфестантаў былі надпісы: «Далоў самадзяржаўе!», «Помста тыранам», «Няхай жыве рэвалюцыя», «Няхай жыве сацыял-дэмакратычная рэспубліка!». У сувязі з хваляваннямі сярод выхаванцаў семінарыя была зачынена, а галоўныя ініцыятары «беспарадку» — семінарысты Аўтухоў, Шчарбакоў і Сянькоўскі былі звольнены з балам «4» па паводзінах. Адзначаючы цесныя сувязі паміж семінарыстамі і навучэнцамі яўрэйскай нацыянальнасці свецкіх навучальных устаноў Віцебска, Арнацкі ў сваёй справаздачы пісаў, што апошнія «сваімі ліберальнымі поглядамі ўздзейнічаюць на семінарыстаў».

У 1906—1907 гг. у семінарыі працягвалася, па словах

Арнацкага, «прапаганда вызваленчых ідэй», хоць вялася яна ўжо больш стоена, без яўных выступленняў.

Яе органам быў рукапісны штотыднёвы часопіс «Семінарскае жыццё», які выдаваў з 1906 г. мясцовы камітэт Усерасійскага агульнасемінарскага саюза, што існаваў пры семінарыі, меў блізкія і частыя зносіны з Цэнтральным камітэтам гэтага саюза (знаходзіўся ў Вяцкай семінарыі). З Вяткі ў Віцебск з 1907 г. паступалі гектаграфічныя бюлетэні з інфармацыяй аб жыцці іншых семінарый. На бюлетэнях стаяў дэвіз: «Свабодная школа ў свабоднай дзяржаве», а мэтай Усерасійскага агульнасемінарскага саюза было змяненне існуючага ў семінарыях рэжыму.

Семінарысты вялі актыўную работу па распаўсюджванню нелегальнай літаратуры. Так, у арыштаваных у кастрычніку 1907 г. выхаванцаў Віцебскай семінарыі Т. Жураўскага, С. Ражнова і С. Ціхвінскага было канфіскавана ў інтэрнаце нелегальнай літаратуры вагой каля 12 пудоў! Пры абмеркаванні на пасяджэнні праўлення семінарыі пытання аб звальненні гэтых трох выхаванцаў рэктар семінарыі канстатаваў, што іх настрой выяўляўся «ў апатыі да багаслоўскіх навук, у захапленні рэвалюцыйнай літаратурай, ва ўдзеле ў антыўрадавых маніфестацыях 1905 г., у мяцяжах супраць свайго начальства».

Хваляванні сярод навучэнцаў духоўнай семінарыі Віцебскай губерні мелі месца і ў 1908—1909 гг., аб чым сведчыла спецыяльна заведзеная вучэбным камітэтам пры Свяцейшым Сінодзе ў Пецярбургу справа. Старшыня камітэта накіраваў 7 лістапада 1909 г. канфідэнцыяльны ліст рэктару Віцебскай духоўнай семінарыі, у якім рэкамендаваў у сувязі з «настроем» сярод выхаванцаў, які ўзнік у некаторых духоўных семінарыях, і для папярэджання хваляванняў установіць «самы пільны і неаслабны нагляд за паводзінамі і настроем выхаванцаў», прытрымлівацца «цвёрдасці і паслядоўнасці ў кіраванні семінарыяй». На выпадак узнікнення «беспарадкаў» рэкамендавалася ні ў якім разе не закрываць навучальную ўстанову і працягваць заняткі хаця б з невялікай колькасцю навучэнцаў.

Актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху прымала народнае настаўніцтва — самая шматлікая катэгорыя беларускай інтэлігенцыі. Настаўніцтва Паўночна-Заходняга краю, як і ўсёй Расіі, не было аднародным слоем інтэлігенцыі. У самым цяжкім матэрыяльным і прававым

становішчы знаходзіліся настаўнікі пачатковых школ, якія атрымлівалі мізерныя аклады — ад 15—20 да 30 рублёў у месяц. Педагогі гэтых школ складалі пераважную частку беларускага настаўніцтва. У той жа час даволі высокай была зарплата настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў — ад 60 да 170 рублёў у месяц. Сацыяльна-прававыя кантрасты ў становішчы педагогаў уплывалі і на іх адносіны да існуючых у Расіі і краі парадкаў. «Нізы інтэлігенцыі», выхадцы з народа, як правіла, былі рэвалюцыйна настроены і часцей за ўсё выступалі супраць царызму, нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту, за дэмакратызацыю і абнаўленне школьнай справы.

У сувязі з ростам рэвалюцыйнага руху і ўдзелам у ім настаўнікаў узмацніўся нагляд за іх добранадзейнасцю. Педагогам забаранялася ўключацца ў якія б то ні было грамадскія справы, пісаць просьбы і скаргі ад сялян, звяртацца з якімі-небудзь асабістымі просьбамі да вышэйшага начальства ў абыход дырэкцыі вучылішчаў. Шырокія памеры прыняла сочка царкоўных служкаў за паводзінамі настаўнікаў, якая падтрымлівалася вучэбнымі ўладамі. Яны праследаваліся за самы нязначны ўдзел у грамадскім жыцці. Нават сяброўства паміж настаўнікамі суседніх школ выклікала падазронасць вучэбнага начальства, а настаўнікі, заўважаныя ў блізкіх зносінах між сабой, разводзіліся па аддаленых адна ад другой школах.

У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. частка настаўніцтва пад уплывам рэвалюцыйных падзей і дзейнасці рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый уключылася ў барацьбу супраць самаўладдзя. Многія настаўнікі падвергліся за гэта ганенням. У прыватнасці, Я. Колас (К. М. Міцкевіч) за складанне ад імя сялян прашэння да памешчыка Скірмунта быў пераведзены ў снежні 1905 г. дырэкцыяй народных вучылішчаў «у выглядзе пакарання» з Пінкавіцкага ў Вярхменскае вучылішча Ігуменаўскага павета Мінскай губерні. За ўдзел у арганізацыі нелегальнага з'езда настаўнікаў Я. Колас быў арыштаваны, пазбаўлены настаўніцкай пасады, больш як два гады знаходзіўся пад следствам, а з 1908 па 1911 г. — у турме.

У 1905—1906 гг. сярод настаўнікаў распаўсюдзілася ідэя стварэння свайго прафесійнага аб'яднання на рэвалюцыйна-дэмакратычнай платформе. Ініцыятыву склікання настаўніцкага з'езда ўзяло на сябе «Часовае бюро

Мінскай групы настаўнікаў», куды ўваходзіў і Я. Колас. Ён жа з'явіўся і адным з ініцыятараў правядзення ў чэрвені 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчына (на сваёй радзіме) з'езда настаўнікаў Мінскай губерні. З'езд прыняў рашэнне далучыцца да Усерасійскага настаўніцкага саюза. У пастанове з'езда падкрэслівалася, што паколькі пры самаўладным рэжыме немагчыма ажыццявіць рэарганізацыю народнай адукацыі, то з'езд сваёй бліжэйшай мэтай аб'явіў імкненне «да звяржэння самаўладдзя шляхам рэвалюцыйнага ўздзеяння на сялян і іх арганізацыю».

У маі 1907 г. у Вільні адбыўся першы ўстаноўчы з'езд настаўнікаў Беларусі, на якім быў створаны «Беларускі настаўніцкі саюз». З'езд сфарміраваў наступныя задачы саюза: «1) перабудова справы народнай асветы на шырокіх свабодных дэмакратычных асновах на карысць народа, каб падняць яго грамадзянскую самасвядомасць; 2) уводзіць у школе навучанне на роднай беларускай мове; 3) дабівацца незалежнасці школы і настаўніка ад align="left"познага начальства, а для гэтага выбіраць свае камітэты, якія і павінны назіраць за работай настаўніка ў школе».

Яшчэ ў ходзе рэвалюцыі 1905—1907 гг. пад напорам рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху царскі ўрад быў вымушаны пайсці на некаторыя ўступкі ў галіне адукацыі. Былі некалькі пашыраны правы вучняў, унесены змены ў вучэбныя планы і праграмы сярэдніх школ. Педагагічным саветам паводле цыркуляра МНА, які быў выдадзены ў лістападзе 1905 г., дазвалялася адступаць па ўзгадненню з папячыцелем вучэбнай акругі ад існуючых правілаў для вучняў і інструкцый для класных настаўнікаў. Было дадзена права праводзіць пры сярэдніх школах агульнашкольныя і пазакласныя нарады і выбіраць на іх бацькоўскія камітэты.

Прыватныя сярэднія навучальныя ўстановы былі прыраўнаваны ў правах з дзяржаўнымі, выпускнікам рэальных вучылішчаў пры ўмове здачы дадатковага экзамену па лацінскай мове прадстаўлялася права паступлення ва універсітэт. Папячыцелі вучэбных акруг атрымалі дазвол па хадайніцтвах насельніцтва і педсаветаў уводзіць у гарадскіх вучылішчах дадатковыя прадметы, прадметную сістэму выкладання. Для паспяваючых навучэнцаў былі адменены пераводныя іспыты, а для непаспяваючых — захаваны толькі па тых прадметах, па якіх яны не паспявалі. Былі зняты існаваўшыя ў Пау-

ночна-Заходнім краі абмежаванні на адкрыццё прыватных навучальных устаноў па нацыянальных і рэлігійных прыметах. Адмянялася забарона карыстацца навучэнцам роднай мовай у зносінах паміж сабой і з настаўнікамі, дазвалялася выкладанне беларусам-католікам закону божага на беларускай мове. Начальства Віленскай вучэбнай акругі зрабіла шэраг захадаў па паляпшэнню вучэбнай і выхаваўчай работы сярод навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў з мэтай адцягнення іх ад рэвалюцыйных ідэй і выхавання вернападданніцкіх пачуццяў.

Непасрэдную карысць ад гэтых частковых уступак атрымала перш за ўсё буржуазія, асабліва за кошт зняцця абмежаванняў на адкрыццё прыватных школ, а таксама стварэння больш спрыяльных умоў для развіцця сярэдняй і прафесійнай адукацыі. Патрабаванні шырокіх народных мас аб усеагульнай адукацыі за кошт дзяржавы, агульнадаступнасці павышанай пачатковай і сярэдняй адукацыі, аддзялення школы ад царквы не былі задаволены царызмам. Спробы правесці праз Дзяржаўную думу праект закону аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі ў аб'ёме трохгадовай школы, якія прадпрымаліся Міністэрствам асветы пачынаючы з 1907 г. і аж да 1917 г., засталіся без поспеху.

У перыяд рэакцыі царызм узмацніў рэпрэсіі супраць настаўнікаў і вучняў, якія прымалі ўдзел у рэвалюцыйным руху, а таксама ўзнавіў ранейшы ўнутрышкольны рэжым. З мэтай закрыцця каналаў доступу ў школу рэвалюцыйных ідэй ажыццяўляўся строгі кантроль за паступаючай у школу літаратурай, настаўнікам было забаронена адыходзіць ад вучэбных праграм. Значна ўзрос аб'ём заданняў, каб у навучэнцаў не было вольнага часу, былі ўзноўлены пераводныя экзамены. Для супрацьдзеяння ўплыву звонку сярэднія навучальныя ўстановы актывізавалі выкладанне спецыяльных прадметаў і пазакласную работу.

Імкнучыся не даць паўтарыцца рэвалюцыйным падзеям 1905—1907 гг., царскія ўлады і вучэбнае начальства рыхтаваліся да рашучага спынення магчымых хваляванняў сярод навучэнцаў. У лістападзе 1910 г. мінскі губернатар накіраваў сакрэтнае пасланне дырэктару Мінскай мужчынскай гімназіі, у якім у сувязі з беспарадкамі, што адбываліся ў Пецярбургу сярод студэнтаў ВНУ, рэкамендаваў «узмацніць нагляд за настроем навучэнцаў і ўсімі мерамі імкнуцца не дапусціць склі-

канне сходак». Губернатар спасылаўся на распараджэнне, атрыманае ад міністра ўнутраных спраў Расіі, якое папярэджвала, што ў «выпадку дапушчэння навучэнцамі дэманстрацый антыўрадавага характару супраць вінаватых будуць прыняты самыя строгія меры, а для спынення сходак у сценах навучальнай установы ў яе будуць уведзены атрады паліцыі». На аснове гэтага паслання дырэктар Мінскай мужчынскай гімназіі аддаў 3 снежня 1910 г. сакрэтнае ўказанне памочнікам класных настаўнікаў «узмацніць нагляд за пазашкольнымі паводзінамі гімназістаў», адзначыўшы, што настаўнікі будуць несці строгую адказнасць за паводзіны навучэнцаў.

Нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі і праследаванні, якія абрушыліся на перадавое настаўніцтва ў гады рэакцыі, у асяроддзі настаўніцкай інтэлігенцыі захоўваўся рэвалюцыйна-дэмакратычны настрой. Аб гэтым сведчыць справаздача Віленскага губернатара Д. Любімава па выніках яго паездак па губерні і размоў з настаўнікамі (1910 г.). Па словах губернатара, ён падмеціў новы тып вясковага настаўніка. На словах ён выказвае гарачы патрыятызм на нацыянальнай глебе і адданасць гістарычным асновам нашай дзяржаўнасці; на справе ж — абсалютную да іх абыякавасць. Д. Любімаў звярнуў асаблівую ўвагу вучэбнага начальства на школьныя настроі настаўнікаў.

Асцярога Віленскага губернатара не была беспадстаўнай. Настаўнікі карысталіся аўтарытэтам і павагай сярод вясковых жыхароў, якія заступаліся за іх і прыходзілі на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Калі летам 1906 г. улады выслалі з Наваградскага павета Мінскай губерні 8 настаўнікаў за агітацыйна-прапагандысцкую дзейнасць сярод сялян, то апошнія ўзялі на сябе ўтрыманне настаўніцкіх сем'яў, далі ім «ссыпку» і памяшканне да вяртання кармільцаў.

У змрочныя гады рэакцыі працягваўся сялянскі рух за адкрыццё народных школ. Гэтыя патрабаванні былі ў шматлікіх наказах сялян сваім дэпутатам I і II Дзяржаўных дум. У сялянскіх прыгаворах, зваротах, хадайніцтвах падкрэслівалася, што школа і пісьменнасць неабходныя ім і іх дзецям як важнейшы сродак пазбаўлення цемнаты і невуцтва, як найпершая жыццёвая патрэба. Так, у прыгаворы сялянскага сходу вёскі Чартоўшчына Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні ад 6 снежня 1909 г. гаварылася, што сяляне маюць «гара-

чае бацькоўскае жаданне вучыць дзяцей» і бачаць у гэтым «крайнюю патрэбу і неабходнасць». Сяляне, якія прысутнічалі на сходзе, аднадушна вырашылі хадайнічаць перад дырэктарам народных вучылішчаў Магілёўскай губерні аб адкрыцці ў вёсцы аднакласнай земскай школы ў першай палове 1909—1910 г. Як адзначалася ў прыгаворы, «калі для адкрыцця гэтай школы патрабуецца якая-небудзь грашовая падтрымка з нашага боку ў пасільных памерах, то мы з радасцю дадзім яе». У прашэнні сялян вёскі Сухое Пінскага павета Мінскай губерні ў адрас галоўнакіруючага землеробствам і дзяржаўнай маёмасцю ад 26 кастрычніка 1910 г. змяшчалася просьба, каб даць сялянам кавалак казённай зямлі пад будаўніцтва народнага вучылішча. Гэты ўчастак са згоды арандатара мог быць дадзены не раней 1924 г. «Чакаць 1924 г. мы не маем магчымасці: пісьменнасць патрэбна так, як хлеб надзённы», — заявілі сяляне. Многія з іх нават са слязьмі ўпрошвалі арандатара — свайго аднавяскоўца — даць зямлю пад будаўніцтва школы.

Прыведзеныя прыклады сведчаць аб мацнейшым жаданні сялян вучыцца, аб іх актыўным удзеле ва ўсенародным грамадска-педагагічным руху.

Прыйшоўшы да ўлады ў выніку Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г., Часовы ўрад адмяніў шэраг устарэлых, рэакцыйных, антынародных распараджэнняў царскіх улад у галіне асветы і школы. У прыватнасці, былі адменены ўрадавая і міністэрскія дырэктывы, указанні аб недапушчэнні да педагагічнай дзейнасці «палітычна нядобранадзейных» асоб, аб забароне настаўнікам і вучням прымаць удзел у палітычнай дзейнасці, аб забароне настаўнікам ствараць саюзы і праводзіць сходы, аб строгіх абмежаваннях педагагічных курсаў і з'ездаў. Былі ануляваны абмежаванні правоў на адукацыю і педагагічную работу па расавых, нацыянальных і рэлігійных прыметах, у тым ліку дыскрымінацыйныя, антысеміцкія цыркуляры афіцыйных органаў аб недапушчэнні яўрэяў да педагагічнай дзейнасці, строгім абмежаванні адукацыі дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці ў сярэдніх навучальных установах.

Часовы ўрад прыняў рашэнне аб развіцці настаўніцкіх семінарый і інстытутаў, стварыў камісію па рэформе вышэйшай школы, большасць рашэнняў і рэкамендацый якой не было, аднак, рэалізавана. Захавалася шматтыповая сістэма народнай асветы, архаізм псіхолага-

педагагічнай адукацыі. Не была праведзена і абяцаная рэформа ў змесце падрыхтоўкі настаўнікаў. Дзяржаўнай мовай па-ранейшаму заставалася руская, выкарыстанне роднай мовы дазвалялася толькі ў прыватным справаводстве і ў прыватных навучальных установах.

Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі перашкаджаў ажыццяўленню дэмакратычных пераўтварэнняў педагагічнай грамадскасцю і настаўнікамі. Кіраўніцтва акругі і дырэктары народных вучылішчаў заявілі аб лаяльнасці Часоваму ўраду, заклікалі настаўнікаў падпарадкоўвацца яго ўказанням, захоўваць парадак і спакой.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актывізаваўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Важнае месца ў праграмах і платформах розных палітычных партый і арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, занялі пытанні развіцця беларускай культуры і школы, асветы і адукацыі, выкладання на беларускай мове.

Вялікая ўвага гэтым пытанням была ўдзелена на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый, які адбыўся ў сакавіку 1917 г. у Мінску. Стан і перспектывы народнай асветы былі разгледжаны на ім у кантэксце галоўных нацыянальных і палітычных праблем — лёсу беларускай дзяржаўнасці, свабоды і незалежнасці Беларусі, нацыянальнай самасвядомасці яе народа.

Дэпутат Цівінскі сказаў, што «для свабоднага развіцця неабходна родная мова, родная школа, свае парадкі. У першую чаргу нам неабходна нацыянальная школа, каб мы не былі ні палякамі, ні расейцамі». І. Краскоўскі папрасіў з'езд абмеркаваць справу арганізацыі школы, бо адраджэнне народа можа ісці толькі праз школу. Ён прапанаваў у настаўніцкіх семінарыях і інстытутах «увесці беларускі народны дух», арганізаваць настаўніцкія курсы, дабівацца стварэння універсітэта на Беларусі, заснаваць асветніцкую суполку «Прасьвета». З'езд выбраў школьную камісію для ўсебаковага абмеркавання школьнага пытання і выпрацоўкі рэзалюцый пад кіраўніцтвам Б. Тарашкевіча. У яе склад увайшлі Краскоўскі, Будзько, Сівіцкая (Зоська Верас). Алесь Гарун, Лявіцкая, Смоліч, Станкевіч і інш.

Выступаючы з дакладам школьнай камісіі, Б. Тарашкевіч сказаў, што «справа школы беларускай — адна з самых важных і балючых спраў беларускіх». Адзначыўшы, што ніхто з членаў камісіі не выказаўся прынцыпова супраць беларускай мовы ў школе, ён паведа-

міў, што камісія прапаноўвае ажыццявіць паступовы пераход на беларускую мову, паколькі няма ні добрых падручнікаў, ні дастатковай колькасці настаўнікаў-беларусаў. Б. Тарашкевіч прывёў у гэтай сувязі словы былога інспектара народных вучылішчаў, рэдактара «Могилевского вестника» Кахановіча аб тым, што нават у такой «чыста беларускай» губерні, як Магілёўская, «амаль усе настаўнікі і настаўніцы велікарусы, якія не ведаюць мовы беларускай».

Таму школьная камісія выказалася за тое, каб перш за ўсё ва ўсе школы, асабліва народныя, увесці «дух беларускі», г. зн. імкнуцца да таго, каб «нас вучылі мясцовыя (тутэйшыя) беларусы, а не велікарусы з глыбокай Расіі, якія хоць і блізкія, але мовы і культуры нашай не ведаюць і не паважаюць».

Школьная камісія прыняла наступныя рэкамендацыі і пастановы:

I. Заснаваць суполку «Прасьвета», для чаго выбраць часовы кіруючы орган у складзе Парэчына, Станкевіча, Лявіцкай, Смоліча, Тарашкевіча. Для аказання дапамогі ў заснаванні суполкі запрасіць вядомых дзеячаў беларускай культуры: Краскоўскага, Ігнатоўскага, Мігая, Эпімах-Шыпілу, Іваноўскага, Фальковіча, Максіма Багдановіча.

II. Даручыць беларускай арганізацыі заявіць Часоваму ўраду аб тым, што справа кіраўніцтва асветы павінна быць аддадзена ў беларускія рукі.

III. Імкнуцца да таго, каб у пачатковых класах уводзіліся беларуская мова, літаратура, гісторыя з улікам магчымасці настаўніцкіх кадраў. Парадак рэалізацыі гэтай прапановы павінны вызначыць з'езды беларускіх народных настаўнікаў.

IV. Хутчэй выдаваць неабходныя падручнікі.

V. Арганізаваць летам беларускія курсы для настаўнікаў.

VI. Імкнуцца да таго, каб у настаўніцкіх, а таксама праваслаўных і каталіцкіх семінарыях былі ўведзены беларуская мова і літаратура, больш шырокае вывучэнне беларускага краю.

VII. Дапусціць у сярэднія школы, якія маюць патрэбных настаўнікаў, беларускую мову і літаратуру ў якасці факультатыўных прадметаў. Пры першай магчымасці адкрыць у адным з беларускіх гарадоў «вышэйшую школу», якая б цалкам задавальняла культурныя патрэбы цэлага краю.

VIII. Шырока развіваць пазашкольную асвету і «расшырэнне ўсялякай навукі» пры дапамозе арганізацыі курсаў чытання, народных хат і іншых асветніцкіх устаноў.

Рэкамендацыі з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый сведчылі аб тым, што на ім была прапанавана праграма пераходу пачатковых і сярэдніх школ, настаўніцкіх семінарый на родную мову навучання, выкладанне ў іх беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Беларусі. Гэта была праграма беларусізацыі школы. Вялікае значэнне ў справе дэмакратызацыі і абнаўлення школы мелі прапановы з'езда аб пераходзе спраў кіраўніцтва народнай адукацыяй на Беларусі ў «беларускія рукі», адкрыцці беларускага універсітэта, арганізацыі цеснай сувязі настаўніцкага і сялянскага руху і інш.

Выбраны з'ездам выканаўчы орган — Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) — не здолеў рэалізаваць патрабаванні беларусізацыі школы і ў выніку сваёй абмежаванай сацыяльна-палітычнай платформы не атрымаў шырокай падтрымкі працоўных. На сялянскіх і настаўніцкіх з'ездах, якія адбыліся ў 1917 г., прадстаўнікі БНК не змаглі пераканаць дэлегатаў у неабходнасці выкладання ў школах Беларусі на беларускай мове.

Па меры развіцця рэвалюцыйнага працэсу паміж Лютым і Кастрычнікам працоўныя, сяляне, салдаты, бежанцы, навучэнцы, якія прымалі ўдзел у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, сталі заяўляць аб сваім спецыфічным попыце ў сферы нацыянальнай культуры, мовы, асветы. Паколькі Часовы ўрад не хацеў прызнаваць за беларускім народам права на самавызначэнне і культурнае развіццё, а яго намеснікі на месцах тармазілі працэс дэмакратызацыі народнай адукацыі і пераход выкладання на родную мову навучэнцаў, то працоўныя ўсё больш актыўна сталі выстаўляць патрабаванні: увесці беларускую мову ў школах, стварыць ВНУ, развіваць сетку культурна-асветных устаноў.

І з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, што адбыўся ў красавіку 1917 г. у Мінску, выказаўся за тое, каб кожнай нацыянальнасці краю была дадзена поўная магчымасць культурна-нацыянальнага развіцця, а таксама за ўвядзенне ўсеагульнага, абавязковага, бясплатнага навучання, выкладання ў пачатковых школах на роднай мове. За «нацыяналізацыю школы» (навучанне на роднай мове) выступіў сялянскі з'езд Віцеб-

скай губерні, якія прайшоў у тым жа месяцы. 15 мая 1917 г. у Мінску на мітынгу салдат і афіцэраў Заходняга фронту — ураджэнцаў Беларусі — былі прыняты рэзалюцыі аб канфіскацыі панскай зямлі, увядзенні ў школах беларускай мовы, самавызначэнні беларускага народа ў складзе Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі.

У праграмах палітычных партый пытанні адукацыі і школы ставіліся і разглядаліся ў кантэксце рашэння нацыянальнага пытання. Беларуская сацыялістычная грамада выступіла за культурна-нацыянальную аўтаномію беларусаў, развіццё беларускай культуры, нацыяналізацыю школы. Кадэты не ішлі далей культурнага самавызначэння, якое разглядалі толькі як выкладанне роднай мовы ў пачатковых школах, развіццё культурна-асветных устаноў. Кадэцкі Саюз беларускай дэмакратыі не прызнаваў правы беларускага народа на самавызначэнне і нават не дапускаў развіцця яго культуры.

Эсэры і меншавікі, прытрымліваючыся кадэцкай лініі, адмаўлялі імкненне беларускага народа да нацыянальнай дзяржаўнасці, развіцця сваёй культуры, мовы, школы. Напрыклад, 8 жніўня 1917 г. на VI з'ездзе Усерасійскага настаўніцкага саюза група дэлегатаў ад Беларусі, у асноўным эсэры, прапанавала прыняць рэзалюцыю, якая адмаўляла развіццё беларускай культуры і пратэставала супраць выкладання ў школах на роднай мове. Гэтыя ж ідэі эсэры спрабавалі адстаяць і на педагагічнай нарадзе выкладчыкаў сярэдніх навучальных устаноў Заходняга краю, якая адбылася ў Магілёве 13 верасня 1917 г.

Бальшавікі Беларусі ў сваёй палітычнай дзейнасці па заваяванню мас выступалі з шырокай дэмакратычнай праграмай сацыяльных пераўтварэнняў, у тым ліку і ў галіне асветы. Так, у выбарчай платформе «сацыял-дэмакратычнага блока», якая была распрацавана па ініцыятыве Мінскага камітэта РСДРП(б) у чэрвені — ліпені 1917 г., змяшчалася патрабаванне «ўсеагульнага бясплатнага навучання для кожнай нацыянальнасці на роднай мове». Гэта азначала, што бальшавіцкія арганізацыі Паўночна-Заходняга краю, якія раней толькі фармальна прызнавалі праграмнае патрабаванне РСДРП аб адукацыі на роднай мове, летам—восенню 1917 г. улавілі змены ў настроі мас на карысць навучання на роднай мове і ўключылі гэтае патрабаванне ў якасці адной з першачарговых задач дэмакратычных пераўтварэнняў.

Праведзены аналіз сацыяльна-палітычных аспектаў усенароднага руху за дэмакратызацыю і абнаўленне школы і асветы паказвае, што гэты рух з'яўляўся састаўной часткай беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, важным фактарам нацыянальнага адраджэння Беларусі. Пытанні народнай адукацыі і школьнай справы набылі шырокае значэнне.

Ні адна з палітычных партый ці арганізацый, што дзейнічалі на тэрыторыі беларускіх губерняў і прэтэндавалі на ўплыў у масах, не магла ігнараваць або недаацэньваць важнасці пытанняў развіцця беларускай культуры і школы, асветы і адукацыі. Першымі на гэтыя праблемы адгукнуліся народніцкія гурткі студэнтаў — ураджэнцаў Беларусі, якія ўзніклі ў Маскве і Пецярбургу, а затым іх паставіла ў сваёй праграме Беларуская сацыялістычная грамада — першая нацыянальная палітычная партыя рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі Паўночна-Заходняга краю, адмаўляючы правы беларускага народа на самавызначэнне, разглядалі беларусаў як этнаграфічнае адгалінаванне рускай нацыі, а беларускую мову — як гаворку рускай мовы, рабілі акцэнт не на беларускую школу, а на ўсебаковае абавязковае і бясплатнае навучанне.

Такая пазіцыя, якая паслабляла нацыянальную прыцягальнасць бальшавіцкіх патрабаванняў, была папраўлена летам—восенню 1917 г.

Пытанні адукацыі і школы былі пастаўлены ў рад з дэмакратычнымі патрабаваннямі буржуазна-ліберальнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. Беларускія навучэнцы, студэнты, настаўнікі выступалі на баку гэтых сіл у барацьбе супраць самадзяржаўя, разглядаючы яго знішчэнне як галоўную ўмову перабудовы народнай асветы на дэмакратычных пачатках. Актыўны ўклад у рэвалюцыйны рух навучэнцаў унеслі выхаванцы духоўных семінарый.

Пад націскам рэвалюцыйна-дэмакратычнага і грамадска-педагагічнага руху царызм быў вымушаны пайсці на ўступкі, якія былі, аднак, затым ліквідаваны ў гады рэакцыі. У 1907—1917 гг. працягваўся грамадскі рух за народную школу, аб гэтым сведчыць моцная цяга сялян да адкрыцця ў іх вёсках новых школ. Фарміраваўся новы тып вясковага настаўніка, які быў настроены супраць самадзяржаўнага ладу, карыстаўся значным уплывам на сялян. Знішчэнне самадзяржаўя і прыход да ўлады буржуазнага Часовага ўрада стварылі больш

спрыяльныя ўмовы для дэмакратызацыі школьных спраў. Аднак Часовы ўрад не прызнаваў за беларускім народам права на самавызначэнне, а кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі замаруджвала дэмакратызацыю народнай адукацыі, таму працоўныя масы актыўна сталі выстаўляць патрабаванні ўвядзення беларускай мовы ў школах, стварэння ВНУ, развіцця цэлых ланцугоў культурна-асветных устаноў. Гэтыя пытанні атрымалі адлюстраванне ў сацыяльна-палітычнай барацьбе і грамадска-педагагічным руху на Беларусі ў перыяд паміж Лютым і Кастрычнікам 1917 г.

**За адукацыю на роднай мове!**

На працягу XIX ст. кансалідацыя беларускай нацыі і фарміраванне беларускай літаратурнай мовы адбываліся ў вельмі неспрыяльных умовах нацыянальнага прыгнечання, якое адчуваў беларускі народ як з боку царскага самадзяржаўя з яго палітыкай русіфікацыі, так і з боку польскай шляхты і касцёла з іх намаганнямі паланізацыі беларусаў. Пануючыя класы Беларусі — рускія памешчыкі і чыноўнікі і апалячаныя мясцовыя землеўладальнікі — разглядалі беларускую мову як «простую, мужыцкую, грубую, хамскую», якая не з'яўлялася, на іх думку, паўнацэннай і павінна была падпарадкоўвацца «панскай» мове — рускай ці польскай. Прывілеяваныя колы беларускага грамадства, у тым ліку і мясцовая інтэлігенцыя, карысталіся пераважна рускай мовай, часткова — польскай. Але сялянства, якое складала большую частку насельніцтва Беларусі, размаўляла на беларускай мове, ці, як яе тады называлі, мясцовым дыялекце.

Важнейшым напрамкам русіфікатарскай палітыкі была забарона беларускай мовы і распаўсюджванне рускай. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі афіцыйнай дзяржаўнай мовай у Паўночна-Заходнім краі стала руская мова. Гэта моцна садзейнічала яе распаўсюджанню ў самых розных сферах: дзяржаўнай, грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, культурна-асветнай і адукацыйнай, рэлігійна-культавай і бытавой. Русіфікацыя, ці, па афіцыйнай тэрміналогіі, «абрусенне» Паўночна-Заходняга краю, асабліва ўзмацнілася пасля падаўлення народнага паўстання 1863 г., якое праходзіла галоўным чынам пад польскімі нацыянальнымі лозунгамі. У барацьбу за «ўвядзенне рускага элемента» і

ператварэнне Беларусі ў «сапраўды рускі край» уключыліся не толькі царскія чыноўнікі, але і школьныя ўлады, праваслаўнае духавенства.

Па ініцыятыве Віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва адхіляліся ад службы настаўнікі-католікі, сярод якіх было нямала беларусаў. Яны замяняліся добранадзейнымі выхадцамі з унутраных губерняў Расіі, якія былі заклікаGы садзейнічаць «распаўсюджванню праваслаўна-хрысціянскага вучэння і абуджэнню ў народзе свядомасці, што ён рускі». Школа аддавалася пад кантроль праваслаўных святароў. У 1864 г. былі заснаваны спецыяльныя настаўніцкія семінарыі, дзе з беларускай моладзі рыхтавалі русіфікатараў у духу праваслаўя і адданасці прастолу. У 1867 г. быў выдадзены спецыяльны закон, які забараняў друкаваць кнігі на беларускай мове. Беларускія пісьменнікі былі прымушаны выдаваць свае творы за мяжой. На працягу XIX ст. на беларускай мове не выходзілі легальна ні адна газета, ні адзін часопіс, беларускі народ не меў сваіх культурна-асветных устаноў, школ на роднай мове.

На беларускай мове дазвалялася друкаваць толькі фальклорныя матэрыялы, гістарычныя дакументы і помнікі. За ўсё XIX ст. на ёй было выдадзена толькі 75 кніг, а з 1901 па 1916 г . — 245. Беларускія выданні да самай рэвалюцыі 1905—1907 гг. друкаваліся, як правіла, лацінкай. Аднак і выданне беларускіх твораў лацінкай праследавалася царскімі ўладамі, мэтай якіх было не дапусціць «узмацнення ўплыву польскага элемента ў Паўночна-Заходнім краі».

З беларускамоўнай вучэбнай літаратуры, што выйшла ў XIX ст., можна адзначыць выдадзены ў Вільні ў 1845 г. катэхізіс, «надрукаваны для выкарыстання ў сялянскіх школах і школах рымска-каталіцкіх». Па некаторых даных, да 60-х гадоў XIX ст. выдаваліся беларускія буквары. Самы вядомы з іх — надрукаваны ў Варшаве ў 1862 г. „Elementarz dla dzietok katolikov“. Гэты буквар быў выдадзены польска-каталіцкімі коламі.

Да 60-х гадоў XIX ст., калі руская мова яшчэ не атрымала шырокага распаўсюджвання ў пачатковых школах Беларусі, царскімі ўладамі рабіліся спробы выдаваць падручнікі для гэтых школ на беларускай мове з мэтай аблягчэння русіфікацыі. Пры М. М. Мураўёве ад такой замаскіраванай тактыкі адмовіліся і перайшлі да гвалтоўнага абрусення. Багатыя апалячаныя землеўладальнікі ў адказ пачалі адкрываць тайныя польскія

школы. Такіх тайных беларускіх школ, пісаў Я. Лёсік, нават пры вялікім жаданні не магло быць, бо для іх утрымання былі патрэбны сродкі, якіх не было ў беларускіх сялян. Разам з тым сляды беларускай літаграфаванай брашуры «Хадзіў бай па сцяне» сведчаць і пра існаванне ў канцы XIX ст. тайнага навучання на роднай мове.

Беларускія аўтары былі вымушаны друкаваць свае творы ці за мяжой, у большасці выпадкаў у Жэневе, Парыжы і Лондане, дзе былі патрэбныя шрыфты, ці размнажаць іх у рукапісным выглядзе. У Жэневе ў друкарні «Грамада» было надрукавана некалькі беларускіх кніг, у тым ліку і выдадзеная ў 1881 г. невялікая, на 32 старонках, кніжачка пад загалоўкам «Пра багацце і беднасць». Надрукаваныя за мяжой кнігі кантрабандным шляхам пераправўляліся праз расійскую мяжу і даставўляліся ў Вільню і Мінск, адкуль і распаўсюджваліся сярод беларускага народа.

Масавае адкрыццё рускіх школ пасля 1863 г. беларускае сялянства сустрэла непрыязна. Некаторыя маці ў сёлах крыжамі клаліся на парозе, калі прыходзілі забіраць ці запісваць дзяцей у школу, баючыся, што іх дзяцей «ператвораць у маскалёў». «Страх і непрыязнасць да расійскай школы выхавала ў беларускім сялянстве руская адміністрацыя палітыкай абрусення, насільным схіленнем да праваслаўя», — адзначаў Я. Лёсік.

Характэрны прыклад пра адносіны школьнага начальства да беларускай мовы прыводзіць брат Я. Лёсіка А. Лёсік. Інспектар народных вучылішчаў з Мінска ў час рэвізіі яго школы ў Койданаўскай воласці Мінскай губерні ў 1892 г. зрабіў наступны запіс у школьным журнале: «Настаўнік не толькі не выпраўляў вучняў, калі яны гаварылі па-беларуску, але і сам гаварыў па-беларуску, напрыклад: «пяць», «чытаць», «хадзіць» і г. д.». Інспектар паставіў у віну А. Лёсіку «цэканне і дзэканне, чаго не магла выбіць у семінарскіх выхаванцаў ніякая русіфікацыя». Гэты запіс дырэкцыя народных вучылішчаў пераслала ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую скончыў А. Лёсік. Яе дырэктар з-за гэтага змяніў ранейшыя добрыя адносіны да А. Лёсіка на варожыя, а самому факту запісу інспектара быў нададзены «палітычны характар».

Асаблівую ўвагу ў справе правядзення русіфікатарскай палітыкі царскія ўлады ўдзялялі падрыхтоўцы

настаўніцкіх кадраў. Для настаўніцкіх семінарый Паўночна-Заходняга краю Міністэрства народнай асветы распрацавала асобыя навучальныя планы і праграмы, правілы ўнутрышкольнага распарадку (вучэбны рэжым) з тым, каб вытравіць у выхаванцаў нацыянальную самасвядомасць. З гэтай мэтай у настаўніцкіх семінарыях пад кіраўніцтвам выкладчыкаў сістэматычна праводзілася чытанне рускай мастацкай літаратуры. Педагагічныя калектывы настойліва праводзілі работу па прывіццю выхаванцам правільнай рускай размоўнай мовы як на занятках, так і ў быце. Было вельмі строга забаронена карыстацца роднай беларускай, «мужыцкай» мовай. Я. Лёсік пісаў: «Настаўніцкія семінарыі і інстытуты былі спецыяльнымі школамі абрусення... У гэтых школах-муштрах усё роднае, мясцовае, беларускае знішчалася і ўтоптвалася ў бруд...»

Штабам русіфікатарскай палітыкі ў галіне народнай асветы было кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі. Напрыклад, В. А. Папоў — папячыцель акругі ў 1899—1906 гг., які з'яўляўся, як і ўсе яго папярэднікі, рускім па паходжанню і лічыў Беларусь «спрадвеку рускім краем», быў паслядоўным абаронцам «цара і бацькаўшчыны», шчыра клапаціўся пра развіццё адукацыі, далучэнне да ведаў мясцовага «рускага» насельніцтва».

У якасці навуковага абгрунтавання сваёй русіфікатарскай палітыкі царскі ўрад выкарыстоўваў ідэалогію «заходнерусізму», якая адмаўляла існаванне беларускай нацыі і беларускай мовы. Прыхільнікамі «заходнерусізму» з'яўляліся вядомыя рускія мовазнаўцы А. А. Патабня, І. І. Сразнеўскі, А. І. Сабалеўскі, якія разглядалі беларускую мову як адгалінаванне, дыялект ці — згодна з тагачаснай тэрміналогіяй — «гаворку» велікарускай мовы, але не як самастойную мову. Ім пярэчыў вядомы вучоны-славіст, выхадзец з Беларусі, акадэмік Я. Ф. Карскі, які адстойваў самастойны статус беларускай мовы. Тым не менш і ён быў вымушаны аддаваць даніну афіцыйнай тэрміналогіі, адступаць ад якой не дазвалялася. Таму Я. Ф. Карскі ў сваёй галоўнай працы «Беларусы» побач з тэрмінамі «беларуская народнасць», «беларуская мова» выкарыстоўваў выраз «беларускае племя», «беларуская гаворка». Ён таксама лічыў галоўнай сферай выкарыстання беларускай мовы школьнае выкладанне і меў сумненні наконт магчымасцей распаўсюджвання беларускай літаратурнай мовы, што было апраўдана

ва ўмовах, калі не было ні граматыкі, ні распрацаванай тэрміналогіі беларускай мовы.

Для беларускіх даследчыкаў была характэрна пэўная супярэчлівасць выказванняў аб статусе беларускай мовы. У сувязі з гэтым можна вылучыць пазіцыю краязнаўцы, гісторыка і грамадскага дзеяча У. К. Стукаліча. У 1898 г. ён выдаў у Віцебску брашуру «Короткая заметка о белорусском наречии», у якой, з аднаго боку, прызнаваў «беларускую гаворку» самастойнай, а з другога — сцвярджаў, што яе нельга прымаць за «цалкам асобную мову», што яна з'яўляецца «отдельным великорусским говором». У такой нелагічнасці, непаслядоўнасці аўтара адлюстравалася складанасць і вастрыня моўнай праблемы на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Грамадская думка ў беларускім грамадстве, што склалася пад непасрэдным уплывам пануючых класаў, была накіравана супраць выкарыстання роднай мовы. Я. Колас пісаў: «Беларускае слова асуджалася, высмейвалася, выганялася. Са свядомасці народа вытраўлялася сама назва яго краіны. А на таго, хто выступаў са сваім родным словам, глядзелі як на дзівака, над якім можна было толькі пасмяяцца. Такія былі ўмовы жыцця».

Барацьба за беларускую мову набыла дакладна выражаны палітычны характар. А адкрытая сімпатыя да роднага слова ва ўмовах, калі публічна, як успамінаў рэдактар-выдавец «Нашай нівы» А. Н. Уласаў, «адклікнуцца па-беларуску азначала тое ж самае, што голым паказацца на вуліцы», з'яўлялася знакам грамадзянскай мужнасці, праявай, у пэўным сэнсе, апазіцыйнасці, пратэсту супраць несправядлівага ладу.

У апошняй трэці XIX ст. за адукацыю народа на яго роднай мове выступілі В. Дунін-Марцінкевіч і Ф. К. Багушэвіч. Ф. Багушэвіч першым з беларускіх асветнікаў XIX ст. загаварыў аб беларускай мове як аб важнейшым элеменце беларускай культуры, грамадскага жыцця і нацыянальнай свядомасці беларусаў, называючы мову «ўбраннем душы». Перспектывы развіцця беларускага народа ён звязваў з захаваннем роднай мовы. Выступаючы пабornікам беларускай школы, Ф. Багушэвіч у лісце да вядомага польскага вучонага Н. Карловіча ад 2 снежня 1891 г. паставіў пытанне аб стварэнні беларускага слоўніка і беларускай граматыкі.

Спрыяльныя ўмовы для пераўтварэння «мужыцкай» мовы ў літаратурную, набыцця ёю легальнага грама-

дзянскага статусу і ўкаранення ў практыцы школьнай справы склаліся пад уплывам рэвалюцыі 1905—1907 гг. У адпаведнасці з выдадзеным царскім урадам у лістападзе 1905 г. законам «Аб свабодзе друку» дазвалялася друкаваць творы беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі на роднай мове. У 1906 г. узніклі першыя беларускія выдавецтвы: «Загляне сонца і ў наша ваконца» ў Пецярбургу і «Наша хата» ў Вільні. У тым жа годзе выйшлі і першыя легальныя газеты на беларускай мове — «Наша доля» і «Наша ніва».

Аднак гэта былі толькі частковыя ўступкі з боку царызму. Беларуская мова па-ранейшаму не мела права на паўнацэннае функцыяніраванне ў сістэме народнай адукацыі. Яна, як і раней, не дапускалася ў дзяржаўныя і царкоўнапрыходскія школы. У 1910 г. Дзяржаўная дума дазволіла навучанне на роднай мове палякам, літоўцам, немцам, татарам, эстонцам, латышам, армянам, чэхам, грузінам, буратам, калмыкам і яўрэям. Але беларусам і ўкраінцам было адмоўлена ў праве мець школу на роднай мове. Па-беларуску можна было вучыцца толькі ў прыватных школах.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. паклала пачатак новай хвалі дзейнасці беларускага нацыянальнага адраджэння, вядомымі прадстаўнікамі якой былі В. Іваноўскі і К. Каганец, Я. Купала і Я. Колас, Цётка і М. Багдановіч, браты А. М. і З. М. Луцкевічы, В. Ластоўскі і С. Палуян і інш. Яны рашуча і паслядоўна выступалі за адраджэнне беларускай літаратуры і мовы, стварэнне беларускай нацыянальнай школы, разглядаючы гэтыя патрабаванні як арганічную частку нацыянальна-вызваленчай барацьбы і адначасова як адну з галоўных нязменных умоў нармальнага развіцця культуры Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

Справу навучання на роднай мове неабходна было пачынаць з выдання вучэбнай літаратуры на беларускай мове, якой пакуль што не існавала. У Пецярбургу быў арганізаваны В. Іваноўскім «Круг народнай асветы», на базе якога была створана тайная выдавецкая суполка. У яе ўвайшлі В. Іваноўскі, М. Фальскі, С. Багушэвіч. Арганізатарам і старшынёй суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца» быў В. Іваноўскі, які напісаў і выдаў падручнік «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» на лацініцы. К. Каганец (К. Кастравіцкі) на гэтай аснове апублікаваў кірылічны варыянт лемантара. Такім чынам, В. Іваноўскі і К. Каганец з'яўляюцца стварааль-

нікамі першага беларускага буквара XX ст. Гэта кніга стала першай, выдадзенай таварыствам «Загляне сонца...». Адрасуючы яе перш за ўсё дзецям, выдаўцы мелі сваёй мэтай навучыць чытаць амаль цалкам непісьменную сялянскую масу і навучыць людзей, што ведалі рускую і польскую мовы, беларускаму друкаванаму слову. Сістэма навучання дзяцей пісьму абапіралася на літараскладальны метад, які па эфектыўнасці ўступаў больш перадавому гукавому метаду навучання чытанню. Методыка кнігі была характэрна для многіх буквароў таго часу, у тым ліку і для «Азбукі» Л. М. Талстога.

Уклад К. Каганца ў педагагічную думку не вычэрпваўся толькі выданнем першага беларускага буквара. Ён напісаў «Беларускую граматыку», спрабаваў скласці ўласна беларускую азбуку, афармляў у 1909 г. кнігу Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», распрацоўваў граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы, выкарыстоўваючы ў якасці асновы беларускую народную мову. Шматлікія граматычныя тэрміны, прапанаваныя ім, увайшлі ў сучасную граматыку. С. Я. Палуян бачыў у асобе Каганца нашчадка літаратурных дасягненняў часоў Багушэвіча і папярэдніка Цёткі і Я. Коласа.

Вялікі ўклад у стварэнне беларускамоўнай школы зрабіла таленавітая беларуская паэтэса, асветніца і педагог Цётка (А. С. Пашкевіч). Уся яе грамадска-педагагічная, літаратурная і асветніцкая работа была пранікнута пастаянным клопатам аб адраджэнні і развіцці нацыянальнай культуры і мовы, навучання на роднай мове. У першым нумары першай легальнай беларускай газеты «Наша доля», якая выйшла 1 верасня 1906 г., Цётка апублікавала артыкул, у якім патрабавала адкрыцця школ з навучаннем на беларускай мове, заклікала берагчы і развіваць родную мову, без якой не можа існаваць нацыянальная культура. Пасля таго як у 1907 г. «Наша доля» была закрыта, Цётка пачала друкавацца на старонках «Нашай нівы», дзе выступала за прызнанне беларускай мовы і стварэнне беларускамоўнага навучання ў школе, супраць праследаванняў царскімі ўладамі настаўнікаў, што вядуць навучанне на роднай мове. У 1906 г. у артыкуле «Як нам вучыцца» яна заклікала настаўнікаў новых пачатковых народных школ весці навучанне дзяцей «па-беларуску, каб тлумачылі ім усё па-тутэйшаму, па-свойму, як дзеці гавораць

у хаце з бацькамі і як ім лягчэй разумець». Аўтар падкрэслівала, што засваенне дзецьмі роднай мовы дапаможа ім хутчэй авалодаць таксама рускай і польскай мовамі; што суседнія народы — літоўцы, палякі, украінцы падтрымаюць барацьбу беларусаў за сваю мову. Цётка звярнулася з заклікам да беларускага народа і яго інтэлігенцыі дабівацца беларускай пачатковай школы.

У 1905—1906 гг. Цётка разгарнула работу па стварэнню беларускамоўных школ на сваёй радзіме — у Гродзенскай губерні. Некалькі школ арганізавала дома ў сваіх бацькоў, прыцягваючы для выкладання патрыятычна настроеную моладзь. Для новых школ былі неабходны кнігі і вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове. Цётка адна з першых узялася за іх стварэнне. У 1906 г. у мястэчку Жолкаў каля Львова пад псеўданімам «Тымчасовы» яна выдала кніжку на беларускай мове «Гасцінец для малых дзяцей», надрукаваную лацініцай. Гэта кніга ўяўляла сабой пераклад з украінскай мовы з невялікімі зменамі. У тым жа годзе ў Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца...» Цётка апублікавала «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Гэта была хрэстаматыя для чытання, разлічаная на дзяцей першага класа (яна з'яўлялася працягам лемантара).

У «Першым чытанні», якое складалася з невялікіх апавяданняў, баек, казак, прыказак і прымавак, вершаў, знайшлі адлюстраванне як з'явы навакольнага свету, так і нацыянальны каларыт, умовы жыцця, працы і быту беларускай вёскі, характар і псіхалогія беларускага сялянства. Прасякнутыя дэмакратычным духам і рэалізмам, абедзве кнігі Цёткі былі своеасаблівым выклікам школьнай палітыцы самадзяржаўя. «Лемантар», «Гасцінец» і «Першае чытанне» з'яўляліся першымі кнігамі для дзяцей у беларускай вучэбна-педагагічнай літаратуры, якія адпавядалі творчым традыцыям К. Д. Ушынскага, першай спробай комплекснага падыходу ў выхаванні і навучанні дзяцей свайго краю.

Аўтар «Першага чытання» не абышоў і складаных нацыянальна-моўных праблем, якія існавалі ў той час на Беларусі. У апавяданні «Мая вёска» прыведзены прыклад, як у вёсцы Стаўбунцы дзеці навучаліся па-руску і па-польску, у выніку чаго атрымалася «каша», паколькі ў гэтых бацькоў адзін сын гаварыў па-руску, другі па-польску. У сем'ях дзеці цураліся роднай мовы: «Мову сваю перадражніваюць, гаворкі роднай саромеюц-

ца, над бацькоўскім словам рагочуць». З гэтым не маглі прымірыцца бацькі, якім не было абыякава, на якой мове навучаюцца і размаўляюць іх дзеці. Сяляне сабраліся разам, пагутарылі і вырашылі зрабіць у Стаўбунцах сваю беларускую школу. Знайшлі добрую хату, узялі настаўніка-беларуса, накуплялі беларускіх кніг і пачалі вучыць сваіх дзяцей на роднай мове. З гэтага часу справа пайшла на лад, таму што і ў школе, і дома дзеці размаўлялі на беларускай мове.

Цётка актыўна ўключылася ў работу па арганізацыі народных школ пасля свайго вяртання з эміграцыі ў 1911 г. У. Ф. Луцэвіч, жонка Я. Купалы, якая разам з Цёткай адкрывала беларускамоўныя школы, успамінала, што ў 1912 г. на ўскраінах Вільні, у Нова-Вілейцы, на Лідчыне, у тым ліку і на радзіме Цёткі, дзейнічалі беларускія тайныя школы. Гэтыя школы побач з культурна-асветнымі гурткамі набывалі вялікае значэнне, і праз іх ішло распаўсюджванне беларускага друкаванага слова, беларускай нацыянальнай свядомасці.

Настаўніцамі ў школах, што адкрываліся, станавіліся слухачкі настаўніцкіх курсаў. Цётка пасылала іх ва ўсе куткі Беларусі, дзе толькі можна было адкрываць школы. Асабліва шмат намаганняў для адкрыцця беларускіх школ яны прыклалі ў гады першай сусветнай вайны, калі многія пачатковыя школы былі закрыты. Цётка «шукала настаўнікаў, збірала дзяцей, сама кіравала школьнай работай». Улетку 1914 г. яна разам з В. Ф. Луцэвіч адкрыла беларускі дзіцячы дом у Мінску.

У артыкуле «Шануйце роднае слова», змешчаным у літаратурна-навуковым часопісе для беларускай моладзі «Лучынка» (1914 г.), які выдавала Цётка, яна звярнулася да моладзі з заклікам не адракацца ад роднай мовы, а, наадварот, імкнуцца да яе ўзбагачэння, «бо родная мова, як цэмент, звязвае людзей», аб'ядноўваючы іх у «цэлы народ». Цётка актыўна выступала супраць існуючага меркавання, што беларуская мова з'яўляецца толькі дыялектам ці гаворкай рускай мовы. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць яе ліст да будучага аўтара першай беларускай граматыкі для школ Б. Тарашкевіча (1914 г.). У сваёй барацьбе за навучанне на роднай мове яна выступала, як успамінала У. Ф. Луцэвіч, не толькі супраць русіфікатарскай палітыкі царызму, але і супраць польскага шавінізму, што імкнуўся апалячыць беларускіх сялян, асабліва каталіцкага веравызнання.

У 1915—1916 гг. у акупіраванай немцамі Вільні Цётка разгарнула актыўную работу па адкрыццю беларускіх школ. Па яе просьбе Ю. Вітан-Дубейкоўская пераклала на нямецкую мову зварот Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны да нямецкіх акупацыйных улад па пытаннях адкрыцця беларускіх школ. Пасля таго як немцы далі згоду на адкрыццё школ, Цётка дапамагала шукаць памяшканні і інвентар для іх, вышуквала беларускія сем'і і заклікала бацькоў запісваць дзяцей у гэтыя школы. У лістападзе 1915 г. была адкрыта першая беларуская пачатковая школа ў Вільні. З мэтай забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі, намаганнямі Цёткі і Івана Луцкевіча былі адкрыты беларускія курсы, на якіх выкладалі Іван і Антон Луцкевічы, Ю. Вітан-Дубейкоўская і яшчэ некалькі чалавек. Усе яны працавалі бясплатна. Цётка на гэтых курсах не выкладала з-за недахопу часу, але выказвала сваё задавальненне тым, што з дапамогай выпускнікоў трохмесячных курсаў можна будзе адкрываць беларускія школы на ўсіх ускраінах Вільні, дзе жыло шмат беларусаў.

Адначасова з Цёткай пачаў сваю дзейнасць класік беларускай літаратуры, таленавіты настаўнік і вучоны-педагог Я. Колас (К. М. Міцкевіч). У сваёй аўтабіяграфіі Я. Колас успамінае настаўніка рускай мовы Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі Ф. А. Кудрынскага, які першым ацаніў вершы пачынаючага паэта і параіў яму пісаць на беларускай мове. Пасля заканчэння семінарыі Я. Колас пачаў сваю педагагічную дзейнасць у якасці народнага настаўніка на Палессі. За ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні нелегальнага з'езда настаўнікаў Мінскай губерні (1906 г.) ён быў затрыманы паліцыяй і звольнены з настаўніцкай пасады. Знаходзячыся пад следствам, большую частку часу жыў у лясніцтве ў свайго старэйшага брата, дзе зімой 1906—1907 гг. арганізаваў ва ўрочышчы Смалярня каля Стаўбцоў прыватную нелегальную школу, у якой навучалася 12 вучняў. Гэта была адна з першых на Беларусі школ з навучаннем на беларускай мове.

У гэтыя ж гады Я. Колас напісаў шэраг артыкулаў па пытаннях педагогікі, у якіх адстойваў права беларускага народа вучыцца ў школе на роднай мове. У артыкуле «Беларуская мова ў казённай школе» (1906 г.) ён асвяціў моўную праблему не толькі ў школе, але і значна шырэй — ва ўсім беларускім грамадстве. Пады-

ходзячы да гэтай праблемы з пункту гледжання беларускага інтэлігента, «які цураецца свайго ўсяго роднага». Аўтар адзначаў, што для адказу на пытанне, чаму беларускую мову называюць «мёртвай» мовай, неабходна ведаць гісторыю роднага краю, характар унутранай, расійскай, казённай палітыкі.

У артыкуле дадзены вострыя, дакладныя ацэнкі гістарычных, сацыяльна-ідэалагічных прычын зневажальных адносін значнай часткі беларусаў да сваёй матчынай мовы, закаранелых у іх псіхіцы комплексаў нацыянальнай непаўнацэннасці. Я. Колас адзначаў, што непрыязныя адносіны будучага інтэлігента-беларуса да роднай мовы прывіваюцца з дзяцінства, з навучання ў народнай школе, а потым у семінарыі, дзе ўсё прыстасавана дзеля таго, «каб не толькі знішчыць да канца ў беларуса ўсё тое беларускае, што яшчэ засталося ў душы яго, але і каб з яго зрабіць пакорлівую авечку, забіць мазгі, адным словам, выпусціць на свет балванчыка». Я. Колас растлумачыў, чаму беларусам так сорамна і непрыемна размаўляць на роднай мове. Гэта з'яўлялася вынікам мэтанакіраванай дзейнасці казённай школы, якая паступова, з класа ў клас вытраўляла ў беларускіх дзяцей усё роднае, выстаўляла на смех беларускую мову.

Я. Колас не абмяжоўваўся толькі заклікамі і палымянымі словамі ў абарону роднай мовы. Пры першай жа магчымасці ён накіроўваў свае сілы і майстэрства настаўніка на справу адкрыцця беларускіх школ. У 1908 г. ён па запрашэнню патрыятычна настроенага памешчыка К. Гардзялкоўскага на працягу некалькіх месяцаў працаваў настаўнікам у яго маёнтку на Магілёўшчыне, дзе дзейнічала паўлегальная беларуская школа.

Знаходзячыся пад следствам, Я. Колас пачаў працаваць над падрыхтоўкай вучэбнай кнігі для беларускіх дзяцей. Праца была скончана ў 1908 г., а ў 1910 г., калі Я. Колас сядзеў у турме, пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца...» сумесна з віленскім выдавецтвам «Наша хата» выпусціла ў свет яго кнігу «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Гэта была хрэстаматыя для вучняў пачатковых школ Беларусі.

У 1906 г., калі Я. Колас працаваў настаўнікам у прыватнай нелегальнай беларускай школе ў вёсцы Смалярня, там яму прыйшла ідэя стварэння кнігі-чытанкі для беларускіх дзяцей. Гэта думка яшчэ больш замацавалася ў перыяд яго працы ў прыватнай школе пана

Гардзялкоўскага на Магілёўшчыне. Следам за Ул. Іваноўскім і К. Каганцом («Беларускі лемантар, або Першая навука чытання», 1906 г.) і Цёткай («Першае чытанне для дзетак беларусаў», 1906 г.) будучы народны пясняр задумаў кнігу, якая павінна была садзейнічаць першапачатковаму навучанню роднай мове і чытанню ў народных школах Беларусі.

«Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа ў адрозненне ад «Першага чытання» Цёткі больш адпавядала дзіцячаму ўзросту, больш шырока адлюстроўвала падзеі і з'явы жыцця. Аднак галоўная мэта гэтых нацыянальных падручнікаў для беларускіх дзяцей была адзінай — навучанне і выхаванне на роднай мове. Як прадстаўнікі педагагічнай думкі Цётка і Я. Колас лічылі, што апісанне малюнкаў беларускай прыроды ў кнігах для дзяцей з'яўляецца крыніцай ведаў, сродкам маральна-эстэтычнага і патрыятычнага выхавання. У аснову абедзвюх кніжак пакладзены агульны дыдактычны прынцып, які заключаецца ва ўзыходжанні ад простага да складанага пры выкарыстанні звычайнага, зразумелага матэрыялу беларускага наваколля. Але ў сэнсе тэматыкі, асаблівасці стылю і мовы кніжка Я. Коласа складзена больш удала, чым «чытанка» Цёткі. Яна адрозніваецца паслядоўнасцю, адзінствам стылю, маляўнічасцю мовы. Аўтар бачыў сваю задачу ў складанні такога матэрыялу для чытання, які б садзейнічаў расшырэнню кругагляду беларускіх дзяцей, абуджаў бы нацыянальную самасвядомасць, розум, вучыў бы эстэтычнаму ўспрыманню з'яў навакольнай рэчаіснасці, абагачаў бы мысленне і мову. У «Другім чытанні» як бы зліліся ў адзінае такія працэсы, як асваенне нормаў беларускай мовы, вывучэнне лепшых твораў нацыянальнай літаратуры і асэнсаванне з'яў сацыяльнага жыцця і прыроды. На гэтых асновах Я. Колас мог вырашаць і задачу выхаваўчага навучання. Як педагог і пісьменнік ён лічыў, што галоўнай у творах для дзяцей з'яўляецца маральна-выхаваўчая ідэя, дзякуючы якой дзіця ў працэсе чытання само павінна прыходзіць да неабходнай высновы, пэўнай маральна-эстэтычнай ацэнкі. Так закладваліся асновы самавыхавання.

«Другое чытанне», якое складалася з 110 старонак аўтарскага тэксту і патрыятычнай прадмовы Л. Сеўрука, разбіта на сем раздзелаў. Матэрыялы першых частак прысвечаны порам года: вясне, лету, восені, зіме. У пятым раздзеле «Родныя вобразы» змяшчаюцца вершы і проза

пра жыццё сялян беларускага Палесся, прасякнутыя сацыяльным гучаннем. Большую частку твораў Я. Колас напісаў сам.

Вялікі выхаваўчы патэнцыял Я. Колас бачыў у фальклоры, у народнай педагогіцы. Ён разумеў, што дзеці любяць казкі, якія вабяць сваім аптымізмам і гумарам, дабрынёй і фантастычнасцю, але ў той жа час цеснай сувяззю з жыццём. Таму ў апошні раздзел увайшлі казкі, апрацаваныя таленавітым пісьменнікам і педагогам, даступныя па форме і цікавыя па зместу. Мова казак вельмі простая і даступная. Тут можна сустрэць шмат прыказак, прымавак, фразеалагізмаў і метафар, якія нясуць адпаведную выхаваўчую нагрузку.

Матэрыял у кнізе добра прадуманы з пункту гледжання патрабаванняў педагогікі, размешчаны па ступені ўзрастаючай складанасці не толькі ідэйнага сэнсу, тэматыкі, зместу, але і асаблівасцей мовы, стылю вершаў і прозы.

Пры стварэнні «чытанкі» Я. Колас шмат увагі ўдзяліў правільнай метадычнай падачы матэрыялу. Першая ж рубрыка «Вясна» пабудавана такім чынам, што кожная з яе пяці частак уяўляе сабой закончаную думку і можа быць самастойнай. Такая пабудова тэксту зручная для работы і ў класе, і дома. Пры разборы гэтага твора няцяжка выкарыстоўваць пытальна-адказную форму работы, на аснове якой можна было б даць назву кожнай частцы «Вясны». Напрыклад: 1) раставанне снегу; 2) сонца; 3) рака; 4) людзі назіраюць разліў ракі; 5) павучэнне дзецям. Гэты план можа быць з поспехам рэалізаваны ў такіх метадах навучання, як апавяданне ці гутарка. Пасля працы непасрэдна з тэкстам Я. Колас прапаноўвае дзецям заданне, якое патрабуе: 1) успомніць і паўтарыць усё, што звязана з восенню; 2) зрабіць гэта паралельна з тымі думкамі, якія навеяла ім вясна; 3) вельмі добра падумаць і адказаць: «Чаму думкі асеннія не падобны на думкі вясны?» Такі прыём дазваляе выкарыстоўваць на ўроку паўтор, параўнанне, пераказ і, як вынік, — нараджэнне ўласных думак, поглядаў на з'явы прыроды і грамадскага жыцця. Творы Я. Коласа прымушаюць самастойна мысліць, займацца самавыхаваннем, выпрацоўваць свой уласны погляд на з'явы жыцця. Пісьменнік улічыў і ўзроставыя асаблівасці дзяцей, ствараючы тэксты і вершы не толькі высокамастацкага зместу, але і цікавыя, займальныя, даступныя. Я. Колас выкарыстоўваў матэрыял беларускага сялянскага наваколля,

блізкага і зразумелага дзецям. Гэта давала яму магчымасць увесці ў абарот і новыя словы, абапіраючыся на ўжо знаёмыя з'явы («Прэд навальніцэю ў ночы», «Мурашкі і іх будова» і інш.). «Чытанка» Я. Коласа, яго іншыя творы для дзяцей і дарослых садзейнічалі нацыянальнаму адраджэнню Беларусі, актывізацыі руху за родную мову і беларускую школу.

Цэлую праграму асветы і выхавання чалавека працы змяшчала мастацкая творчасць Янкі Купалы (І. Д. Луцэвіча). Творы Я. Купалы, як і іншых прагрэсіўных мастакоў слова, былі моцнай і ледзь не адзінай агульнадаступнай крыніцай асветы і выхавання шырокіх мас насельніцтва. Ужо ў той час яго творчасць нелегальна ўвайшла ў школьныя праграмы, калі сельскія настаўнікі знаёмілі сваіх выхаванцаў з творамі беларускага песняра. «Кожны новы верш Янкі Купалы, які з'явіўся ў друку, мае вучні ахвотна вучылі напамяць», — пісаў Я. Колас, успамінаючы аб сваёй працы ў прыватнай беларускай школе ў 1908 г. у адной з вёсак Магілёўскай губерні.

Сцвярджаючы думку аб вялікім значэнні асветы і адукацыі ў жыцці народа, паэт выступаў за захаванне і развіццё беларускай мовы, за беларускую нацыянальную школу. У артыкуле «Ці маем мы права выракацца роднай мовы» (1910 г.) Я. Купала гнеўна аблічаў палітыку пануючых класаў Расіі і Польшчы, якая негатыўна адбівалася на развіцці беларускай культуры, навукі і асветы. Шматвяковае іншаземнае ярмо затрымала на доўгія стагоддзі культурнае і нацыянальнае развіццё беларускага народа. У артыкуле гаварылася пра тое, што нават у самыя цяжкія часы беларусы шанавалі сваю мову — «гэту душу яго душы». Аўтар сцвярджае, што адрадзіцца і вольна глянуць на ўвесь свет «мы зможам толькі тады, калі пад саламянымі дахамі нашых хат зойме ганаровае месца наша родная беларуская кніжка». Галоўны вынік, які робіць Я. Купала: беларускі народ не мае права выракацца роднай мовы.

У многіх сваіх вершах паэт падкрэслівае неабходнасць народнай асветы, выдання беларускіх кніг і арганізацыі народных школ з навучаннем на роднай мове («Чаго нам трэба» (1905—1907), «Вучыся» (1907), «Мой погляд і мэта» (1910), «Ці ж не доля мая?!», «У вучылішчы» (1911—1912). Я. Купала прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычнай барацьбе па праблемах беларускай мовы і беларускай школы. Прыкладам уплыву

гэтай барацьбы на яго творчасць можа быць верш «Ворагам Беларушчыны» («Чаго вам хочацца, панове?»), напісаны ў 1907 г. пасля дзікіх нападак на ўсё беларускае з боку рускіх і польскіх чарнасоценных газет.

Янка Купала праяўляў вялікую цікавасць да вучэбнай літаратуры на беларускай мове. У лісце да Б. А. Тарашкевіча ад 4 верасня 1913 г. ён цікавіўся, як ідуць справы з беларускай граматыкай. Як адказны сакратар Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні Я. Купала паведамляў аб тым, што таварыства хоча выдаць граматыку.

Значны ўклад у станаўленне і развіццё нацыянальнай школы і педагагічнай думкі Беларусі ўнёс вядомы беларускі паэт і літаратуразнаўца М. А. Багдановіч. Пасля выдання царскім урадам закону ад 1 чэрвеня 1914 г. аб дазволе беларускіх школ галоўнай задачай ён лічыў падтрымку гэтых школ з боку земства і стварэнне педагогіка-метадычных асноў працэсу навучання на роднай мове. З гэтай мэтай М. Багдановіч задумаў падрыхтаваць вучэбныя кнігі і дапаможнікі для беларускіх дзяцей. У час сваёй працы ў Мінскім губернскім харчовым камітэце і Беларускім камітэце дапамогі ахвярам вайны (кастрычнік 1916 — люты 1917 г.) ён часта сустракаўся з А. Смолічам і Зоськай Верас (Л. Войцік-Сівіцкай). М. Багдановіч і З. Верас падтрымалі прапанову А. Смоліча аб стварэнні чытанкі-хрэстаматыі для пачатковай беларускай школы. Усе ўтрох распрацавалі план, па якому будучая кніга дзялілася на чатыры часткі (па порах года). Пры раздзяленні працы М. Багдановічу даручалася падбіраць адпаведныя вершы з беларускай літаратуры, рабіць пераклады і «зразумела, пісаць самому». Паэт узяўся за справу з вялікім жаданнем. Ён склаў праект хрэстаматыі і напісаў для яе нарыс «Гарадок». Але закончыць кнігу не ўдалося.

У апошнія дні свайго жыцця М. Багдановіч працаваў над складаннем беларускага буквара (лемантара). Ён сабраў шэраг матэрыялаў, падрыхтаваў прыклады для практыкаванняў і ўжо пачаў пісаць чыставы варыянт лемантара, але смерць ад сухотаў перарвала яго працу.

Свае погляды аб месцы і ўзаемаадносінах рускай і беларускай моў у школьным навучанні на Беларусі М. Багдановіч выказаў у артыкуле «Голас з Беларусі» (1916 г.). Аўтар лічыў галоўнай задачай для беларускай нацыянальнай школы ліквідацыю недахопаў, якія ўнесла

за сабой выкладанне на велікарускай мове. Адным з такіх недахопаў было тое, што пры навучанні па-руску беларускія дзеці перасталі ўжываць вялікую колькасць адметных, чыста беларускіх слоў, вобразаў, а значыць, і зніклі ўсе звязаныя з гэтымі словамі жывыя, ясныя і звычныя ўяўленні і перажыванні, што вяло да абяднення дзіцячай псіхікі. Побач з гэтым беларускія дзеці сустракалі шмат рускіх слоў, якіх не чулі дома. Гэта, на думку аўтара, аказвала дрэнны ўплыў на іх яшчэ няўстойлівую псіхіку, часта вяло да памылковых уяўленняў. Вялікай перашкодай у працэсе славаўжывання была неадпаведнасць граматычных форм у рускай і беларускай мовах: несупадзенне роду значнай колькасці слоў, адрозненне ў рускіх і беларускіх словах націску. Асаблівую небяспеку М. Багдановіч бачыў у тым, што шэраг слоў у абедзвюх мовах гучыць аднолькава, але мае рознае значэнне. Ён з абурэннем піша: «Можна сабе ўявіць, якую блытаніну выкліча такі «пераклад» у галаве беларускага дзіцяці любая руская кніга, пачынаючы з буквара». М. Багдановіч лічыў, што ліквідацыя беларускай мовы ў школе вядзе да страты вынікаў велізарнай, шматвяковай духоўнай працы цэлага народа. Паэт выступаў за тое, каб авалоданне роднай мовай пачыналася з першага дня навучання.

Свае ўражанні аб наведванні ўвосень 1916 г. аднаго з дзіцячых прытулкаў (у Ратамцы пад Мінскам) М. Багдановіч пераказаў у артыкуле «Беларускі бежанскі прытулак». Ён асабліва падкрэсліў той факт, што гэта быў адзін з нешматлікіх дзіцячых прытулкаў, у якім вучэбна-выхаваўчы працэс вёўся на беларускай мове. Моцнае ўражанне на яго аказала атмасфера, якая панавала ў гэтай установе: напісаны дзецьмі ад рукі плакат «Шануй родную мову», родная мова, якая гучала вакол, беларускае нацыянальнае адзенне на дзецях. Адзначыў паэт і той момант, што дзеці вывучалі яшчэ і рускую мову, але толькі пасля таго, як ужо прывыклі да беларускага чытання і пісьма.

У працэсе працоўнага выхавання настаўнікі прытулку надавалі вялікае значэнне захаванню нацыянальных традыцый і звычаяў. З размовы з загадчыцай прытулку М. Багдановіч даведаўся аб вялікай зацікаўленасці беларусаў у такіх нацыянальных школах.

У захаванні роднай мовы М. Багдановіч бачыў адну з галоўных умоў развіцця беларускага народа. Сама мова з'яўляецца для народа вялікім настаўнікам: яна

вучыла народ ужо тады, калі не было ні кніг, ні школ, і працягвае вучыць яго да канца народнай гісторыі.

Новай, недастаткова асэнсаванай і ацэненай па свайму значэнню з'явай у гісторыі грамадскай і педагагічнай думкі Беларусі з'яўляецца творчасць таленавітага беларускага літаратуразнаўцы, публіцыста і крытыка С. Е. Палуяна (1890—1910). Ён распрацаваў арыгінальную канцэпцыю беларускага нацыянальнага адраджэння, у аснове якой ляжала абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларускага народа і перш-наперш адраджэнне роднай мовы. Галоўным сродкам распаўсюджвання беларускай мовы С. Палуян лічыў народную школу. Ён першым на Беларусі ў пачатку XX ст. паставіў пытанне аб «нацыяналізацыі школы», якую разумеў шырока, уключаючы сюды і дэмакратызацыю школьнай справы. Але галоўным момантам у «нацыяналізацыі» школы пісьменнік лічыў увядзенне выкладання на роднай мове, садзейнічанне школы ў развіцці нацыянальнай свядомасці вучняў.

Асноўнай працай, якая раскрывала педагагічныя погляды С. Палуяна, быў яго артыкул «Аб нацыянальнай школе на Беларусі» (у сувязі з выхадам зборніка «Белорусский учитель» у Пецярбургу), надрукаваны ў 1909 г. у часопісе «Українська хата». Аўтар пісаў: «Толькі адна гэта нацыяналізацыя (школы. — *С. С.*) можа рассекчы гордзіеў вузел беларускай неразбярыхі, яна адна можа вывесці беларускі народ з таго тупіка, у які завялі яго нашы ўласныя вышэйшыя слаі сваёй антынароднай палітыкай, і паставіць яго на шлях агульначалавечага развіцця».

Ідэі С. Палуяна аб нацыяналізацыі школы, якую ён лічыў цэнтральным момантам усёй школьнай рэформы, ролі настаўніка ў гэтым працэсе, пакінулі значны след у гісторыі грамадскай і педагагічнай думкі Беларусі пачатку XX ст.

Справу В. Іваноўскага, К. Каганца, Цёткі і Я. Коласа па стварэнню кніг на беларускай мове прадоўжыў выдатны дзеяч беларускага нацыянальнага руху Вацлаў Ластоўскі. У 1910 г. у Вільні ім была надрукавана лацініцай і кірыліцай «Кароткая гісторыя Беларусі». Гэта была першая спроба напісання падручніка па гісторыі Беларусі на роднай мове. У прадмове аўтар піша: «Працу гэту ахвярую сыном маладой Беларусі, каб хаця з гэтай кароткай і няпоўнай працы маглі пазнаваць гісторыю бацькаўшчыны ў сваёй роднай мове. У кнізе паказаны дасяг-

ненні Вялікага княства Літоўскага ва ўнутранай і знешняй палітыцы, выяўлены карані русіфікатарскай палітыкі царызму ў Паўночна-Заходнім краі. Педагагічныя ідэі аўтара, іх вострае сацыяльнае гучанне накіраваны на выхаванне грамадзянскіх пачуццяў моладзі, фарміраванне іх палітычнай культуры.

Пасля таго як беларуская мова атрымала статус дзяржаўнай, узнікла вострая неабходнасць у стварэнні новай «чытанкі» для беларускіх школ. За гэту справу ўзяўся В. Ластоўскі і ў 1915 г. у Вільні выдаў падручнік «Першая чытанка, кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытаньня». У 1916 г. у Вільні «Першая чытанка» выходзіць на лацініцы разам з «чытанкай» для 2-га і 3-га класаў. «Першая чытанка», невялікая па аб'ёму (64 с.), складалася з прадмовы, фанетычнага і лексічнага мінімуму, а таксама тэкстаў, вершаў і слоўніка. Свае педагагічныя погляды і метадычныя пажаданні аўтар выказаў у прадмове да падручніка. Ён лічыў, што «далейшая навука чытання» ў асноўным залежыць ад першапачатковага навучання, раіў звярнуць асаблівую ўвагу на развіццё вуснай мовы, прапаноўваў выкарыстоўваць дыдактычныя правілы — ад агульнага да прыватнага, ад вядомага да новага. Даючы метадычныя парады, В. Ластоўскі заклікаў настаўнікаў імкнуцца да свядомага засваення дзецьмі вучэбнага матэрыялу, выкарыстання індывідуальнага падыходу ў працэсе навучання і выхавання.

Безумоўнай заслугай аўтара ў параўнанні з вучэбнымі кнігамі В. Іваноўскага і К. Каганца, Цёткі і Я. Коласа з'яўляецца тое, што ўпершыню на старонках падручніка для пачатковай школы з'явіліся матэрыялы аб гістарычным мінулым Беларусі пад назвай «З нашай мінуўшчыны». Гістарычныя тэксты, часткова ўзятыя з «Кароткай гісторыі Беларусі» і адаптаваныя для пачатковай школы, раскрываюць гераічнае мінулае беларускага народа («Князёўна Рагнеда», «Бітва каля Магільні», «Вітаўт і Ягайла» і інш.).

Навучанне роднай мове аўтар імкнецца спалучыць з развіццём у дзяцей неабходных жыццёвых разуменняў, дзеля чаго выкарыстоўвае шэраг тэкстаў пазнавальнага характару («Асвоеныя і дзікія звяры», «Як ваўкі вучаць сваіх дзяцей», «Што значаць назвы месяцаў», «Зямля — маці-карміліца», «Бульба», «Перамены вады», «Чатыры стараны свету», «Сонечныя прамяні» і інш.), якія закліканы не толькі пашыраць кругагляд дзяцей, выхоў-

ваць прагу да ведаў, узбагачаць светаразуменне, але і садзейнічаць экалагічнаму выхаванню.

В. Ластоўскі ўзбагачае змест «чытанкі» беларускім фальклорам — прыказкамі і прымаўкамі павучальнага зместу («сваёй бяды нікому не кажы», «калі не верыш — не бажыся, калі б'юць — не прасіся», «казана мудра ў пору» і інш.). Ён дае шэраг жыццёвых парад, якія носяць біблейскі характар: «Калі ты дужы і здаровы, то старайся ўжыць свае сілы на карысць людзям; калі ты хворы — старайся не шкодзіць і не дакучаць людзям сваёй хваробай; калі ты багаты — старайся накіраваць сваё багацце на карысць людзям».

Вацлаў Ластоўскі, ствараючы падручнік, паставіў мэту: выхоўваць нацыянальную самасвядомасць у беларускіх дзяцей. Рашэнне гэтай праблемы ён бачыў двума шляхамі: па-першае, праз знаёмства з багатай, гераічнай і трагічнай гісторыяй свайго народа; па-другое, праз вывучэнне народна-педагагічнай спадчыны беларусаў, увасобленай у традыцыях, фальклоры, народнай педагогіцы.

Дзейнасць і педагагічныя ідэі В. Ластоўскага маюць вялікае значэнне для развіцця педагагічнай думкі Беларусі перш за ўсё таму, што ўпершыню ў беларускай вучэбнай літаратуры ўдалося аб'яднаць лепшыя дасягненні прадстаўнікоў афіцыяльнай педагагічнай думкі і лідэраў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху (В. Іваноўскі, К. Каганец, Цётка, Я. Колас, С. Палуян, М. Багдановіч). Узбагаціўшы свае кнігі шэрагам навукова-педагагічных ідэй і метадычных знаходак, В. Ластоўскі акрэсліў агульнапедагагічныя каштоўнасці ў спалучэнні з іх нацыянальным зместам.

У пачатку XX ст. пытанні беларускага адраджэння абмяркоўваліся ў рускім, польскім, украінскім, а зрэдку і замежным друку, а таксама міжнароднай грамадскасцю. У чэрвені 1908 г. у Празе адбыўся з'езд студэнтаў славянскіх краін, дзе ад імя беларускіх студэнтаў выступіў Каляда. Ён звязаў праблему амаль усеагульнай непісьменнасці беларусаў з іх нацыянальным прыгнечаннем. У сувязі з выступленнем Каляды з'езд прыняў пастанову, у якой адзначалася, што для свайго развіцця беларускі народ «павінен і мае права патрабаваць: 1) каб на Беларусі было ўведзена ўсеагульнае навучанне на роднай мове; 2) каб у сярэдніх школах (гімназіях) выкладалі гісторыю і вучылі мове беларускай...; 3) каб у Вільні адкрылі беларуска-літоўскі універсітэт... Ва ўсіх

гэтых справах беларусаў будзе падтрымліваць усё прагрэсіўнае славянства».

З беларускіх перыядычных выданняў больш за ўсё матэрыялаў па пытаннях мовы і школы змяшчала «Наша ніва». Газета актыўна выступала за «нацыяналізацыю» школы, разумеючы пад гэтым перш за ўсё перавод на родную мову навучання, заклікала настаўнікаў узначаліць рух за беларускую нацыянальную школу, патрабавала пашырэння кнігадрукавання на роднай мове. У 1910—1914 гг. на старонках «Нашай нівы» змяшчаліся матэрыялы дыскусіі аб графіцы (лацініца ці кірыліца) беларускай мовы, даваўся адпор рускім шавіністам і польскім нацыяналістам, якія выступалі супраць выкладання ў навучальных установах на беларускай мове, прыводзіліся шматлікія факты народнага руху за нацыянальную школу. У кастрычніку 1913 г. працоўныя-беларусы з Копыля звярнуліся ў Дзяржаўную думу з петыцыяй, у якой патрабавалі прызнаць беларускую мову, дазволіць нацыянальныя таварыствы і падтрымаць прашэнне ўрада аб адкрыцці на Беларусі універсітэта.

Праблема навучання на роднай мове ў школах Беларусі шырока абмяркоўвалася на старонках расійскага друку. Газета «Школа и жизнь» (Санкт-Пецярбург) змясціла шэраг артыкулаў, у якіх вялася палеміка па пытаннях нацыянальнага адраджэння Беларусі. Настаўнік Б. апублікаваў артыкулы «Белорусское национальное возрождение и идея введения родного языка в школу» і «Родной язык и национальное возрождение Белоруссии». Аўтар выказаў думку аб тым, што беларуская мова і культура ўзніклі раней, чым польская і велікаруская мова і культура, падкрэсліў, што велікарусы і палякі запазычылі беларускую культуру. Настаўнік Б. выступіў супраць тэзіса аб стварэнні так званай агульнарускай мовы, у якую шляхам асіміляцыі ўвайшлі б велікаруская, маларуская (украінская) і беларуская. Блізкасць беларускай мовы да велікарускай вядзе да асіміляцыі беларускай народнасці з боку велікарускай. Вынікам такой асіміляцыі першапачаткова з боку Польшчы, а потым з боку Расіі з'явіліся «почти поголовная неграмотность белорусского народа и упадок всякой культуры в белорусском крае».

Аналізуючы развіццё нацыянальнай беларускай ідэі, аўтар адзначае, што яна зарадзілася з пачатку прыгнечання Беларусі Польшчай, але на поўны голас заявіла пра сябе толькі ў 1905—1906 гг. Ён высока ацэньвае

значэнне З'езда беларускіх настаўнікаў (май 1907 г.), які вынес патрабаванне першапачатковага навучання дзяцей на роднай беларускай мове. У артыкуле прыводзяцца факты існавання прыватных школ, дзе навучанне вядзецца па-беларуску ў Магілёўскай, Мінскай і Віленскай губернях. Патрэба ў настаўніках для такіх школ расце, а беларускі край чакае толькі афіцыйнага дазволу роднай мовы ў роднай школе, піша аўтар.

Думкі настаўніка Б. аспрэчваў настаўнік з Віцебска М. Дабраведаўскі. У артыкуле «Старая и молодая школа в Белоруссии» ён выказаўся за стварэнне адзінай нацыянальнай агульнарускай школы, дзе выкладанне павінна весціся на «общерусском языке». Свой пункт гледжання ён матываваў няўдалай спробай увядзення ў школе буквара «Беларускі лемантар», хрэстаматый «Першае чытанне» і «Другое чытанне» ў Віцебскай губерні.

Упершыню афіцыйнае абмеркаванне праблемы навучання на роднай мове адбылося на I Усерасійскім з'ездзе па народнай адукацыі (Пецярбург, 1913 г.). У выніку дыскусій удзельнікі «іншародніцкай секцыі» прыйшлі да высновы: «Мацярынская мова павінна быць у школе для іншародцаў і мовай выкладання і прадметам выкладання. Руская мова ў інтарэсах іншародніцкага насельніцтва неабходна ў якасці прадмета выкладання».

Даўшы сур'ёзную навуковую ацэнку дыферэнцыяцыі славянскіх моў, дзеячы народнай асветы адзначылі негатыўны ўплыў русіфікацыі на адукацыю дзяцей іншародцаў у рускай школе, паколькі яны пазбаўлены магчымасці карыстацца сваёй роднай мовай, як «пэўным спосабам мыслення», што вядзе да зніжэння культурнага ўзроўню народа. На з'ездзе была адзначана поўная несамастойнасць іншародніцкай школы, якая і можа быць ліквідавана толькі ажыццяўленнем права на нацыянальна-культурную аўтаномію кожнага народа. Былі прыведзены даныя (1912 г.), якія сведчылі аб тым, што развіццё афіцыйнай школы садзейнічала зніжэнню пісьменнасці на Беларусі. Там, дзе найбольшая колькасць жыхароў карысталася афіцыйнай школай (Магілёўская губерня — 52 чалавекі на 1000 жыхароў), колькасць пісьменных аказалася найменшай — 17 %. Найбольшая ж колькасць пісьменных (Гродзенская губерня — 29,1 % і Віленская — 29,3 %) тлумачыцца найменшым уплывам афіцыйнай школы і значнай колькасцю прыватных школ.

Адраджэнне беларускай школьнай справы пачалося

ў час першай сусветнай вайны ў заходніх губернях Беларусі — Гродзенскай і Віленскай. Фактычна першая беларуская пачатковая школа была адкрыта ў Вільні 13 лістапада 1915 г. А ў 1916 г. дзейнічала ўжо 5 беларускіх пачатковых школ. Затым такія школы адкрываліся ў Гродне, Лідзе, Крынках і так на ўсёй тэрыторыі заходняй Беларусі.

Для адраджэння беларускай школы неабходна было вырашыць праблему забеспячэння яе нацыянальнымі настаўніцкімі кадрамі і напісання беларускіх школьных падручнікаў. Першыя настаўніцкія курсы былі адкрыты ў лістападзе 1915 года ў Вільні дзякуючы намаганням І. Луцкевіча і Цёткі, якія ўжо мелі вопыт арганізацыі беларускай асветы, работы ў прыватных школах. У 1913—1915 гг. І. Луцкевіч сам выкладаў у прыватнай школе Рыбакова.

У кастрычніку 1916 г. руская настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы Валкавыскага раёна была рэарганізавана ў беларускую, дырэктарам якой стаў Б. Пачэбка. Да 1917 г. на заходніх тэрыторыях Беларусі пад нямецкай акупацыяй дзейнічала ўжо 126 беларускіх пачатковых школ і 13 беларускіх гімназій і прагімназій. Афіцыйна першая беларуская гімназія была арганізавана ў Слуцку прафесарам Мінскага настаўніцкага інстытута Р. Астроўскім. Расчыніўшы свае дзверы 4 верасня 1917 г., Слуцкая беларуская гімназія прыняла 412 вучняў.

Вырашэнне пытання аб беларускай нацыянальнай школе стала асноўным звяном супярэчлівасці ў развіцці асветы і педагагічнай думкі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Вастрыня гэтай праблемы тлумачылася тым, што нацыянальнае прыгнечанне і дыскрымінацыя беларускага народа асабліва моцна адчувалася ім у моўнай сферы, калі яго родная мова была афіцыйна забаронена і навучанне на ёй не дазвалялася.

Дунін-Марцінкевіч і Багушэвіч лічылі адраджэнне беларускай мовы абавязковай умовай захавання беларускага этнасу. У пачатку XX ст. іх справу прадоўжылі і паднялі на новы ўзровень лідэры беларускага адраджэння Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, В. Іваноўскі, К. Каганец, В. Ластоўскі, С. Палуян і іншыя прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху. Яны стаялі ля вытокаў нацыянальнага напрамку ў развіцці педагагічнай думкі Беларусі, унеслі вялізны ўклад у фарміраванне беларускай літаратурнай мовы, заклалі навукова-педагагічныя і вучэбна-метадычныя асновы нацыянальнай

школы. Кожны з іх унёс нешта значнае і арыгінальнае ў справу выкладання на роднай мове. В. Іваноўскі, К. Каганец, Цётка, Я. Колас і В. Ластоўскі выдалі першыя буквары і чытанкі для беларускіх дзяцей. Б. Тарашкевіч падрыхтаваў першую беларускую граматыку, якая была выдадзена ў 1918 г. Купала і Колас сваімі творамі прывівалі любоў да роднага слова, заклікалі шанаваць яго і паважаць, як «душу народа». С. Палуян абагульніў канцэпцыю нацыянальнай школы на Беларусі. М. Багдановіч звярнуў асаблівую ўвагу на ўзаемасувязь у выкладанні беларускай і рускай моў і асаблівасці іх засваення ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя. Цётка і Колас былі ініцыятарамі стварэння першых нелегальных школ з навучаннем на беларускай мове. В. Ластоўскі, выкарыстоўваючы каштоўнасці афіцыйнай педагогікі, узбагаціў яе нацыянальнай адметнасцю; асноўную ўвагу ён звяртаў на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці беларускіх дзяцей.

Рэвалюцыя 1905—1906 гг. зрабіла першы пралом у русіфікатарскай палітыцы царызму на Беларусі. Але патрабавалася яшчэ амаль 10 гадоў, перш чым у чэрвені 1914 г. самадзяржаўе дазволіла беларускую школу. Першыя афіцыйна дазволеныя ўладамі нацыянальныя школы з'явіліся на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., але грамадска-палітычная барацьба вакол іх не спынялася.

## СТВАРАЛЬНАЯ, ТВОРЧАЯ ПЕДАГОГІКА

### У пошуках плёну

У канцы XIX ст. у навучальных установах Беларусі, як і ва ўсіх школах Расійскай імперыі, пад уздзеяннем грамадска-педагагічнага руху павышалася цікавасць да ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу. На пасяджэннях педагагічных саветаў гімназій і павятовых вучылішчаў актыўна абмяркоўваліся пытанні методыкі выкладання. Перадавыя настаўнікі пачатковых і сярэдніх школ Беларусі пачалі аказваць значна большую ўвагу пытанням удасканалення форм і метадаў пастаноўкі вучэбнай работы.

Настаўнікі імкнуліся забяспечыць свядомае і трывалае засваенне ведаў вучнямі, даступнасць і нагляднасць навучання. Гукавы метад навучання пісьменнасці паступова выцесніў літарaскладальны. Усё шырэй выкарыстоўвалася тлумачальнае чытанне, пісьмовыя практыкаванні. Пры тлу-

мачальным чытанні матэрыялаў па гісторыі і геаграфіі выкарыстоўваліся малюнкі, чарцяжы, карты. Пры навучанні арыфметыцы знаёмства з першапачатковымі лічбамі праводзілася на прыкладах навакольнага жыцця, уводзіліся практыкаванні на лічыльніках, што дапамагала больш асэнсаванаму і трываламу засваенню ведаў.

Арганізацыя вучэбнай работы і вучэбныя планы агульнаадукацыйных школ беларускіх паветаў у асноўным былі такімі ж, як і ў школах Цэнтральнай Расіі. Вучэбныя прадметы ў гімназіях, прагімназіях і павятовых вучылішчах вывучаліся па праграмах, якія былі зацверджаны Міністэрствам народнай асветы для ўсіх тыпаў навучальных устаноў. Выкладанне вялося на рускай мове (нават вывучэнне закону Божага ў каталіцкіх школах). На пасяджэннях педагагічных саветаў гімназій і павятовых вучылішчаў галоўная ўвага звярталася на методыку выкладання рускай мовы і літаратуры, паколькі для большасці навучэнцаў руская мова была не роднай і, акрамя гэтага, яна была абвешчана галоўным прадметам навучання. Пераход у наступны клас з нездавальняючымі адзнакамі па рускай мове забараняўся, у лік экзаменаў на атэстат сталасці быў уведзены экзамен па рускай славеснасці. Аднак, нягледзячы на прынятыя меры, і ў 90-я гады паспяховасць па рускай мове працягвала заставацца нізкай.

Выхаваўчая работа ў навучальных установах Паўночна-Заходняга краю служыла задачам ахоўнай школьнай палітыкі самадзяржаўя, барацьбы кіруючых органаў у Рускай праваслаўнай царкве з польска-каталіцкім уплывам і русіфікацыі беларускага народа. Нагляд за паводзінамі навучэнцаў, устаноўлены з моманту падаўлення паўстання 1863 г., у наступныя дзесяцігоддзі яшчэ больш узмацніўся, асабліва ў сувязі з ростам рэвалюцыйнага руху і яго ўздзеяннем на школу. У некаторых вучылішчах саветамі былі распрацаваны правілы аб спагнаннях, якія ўяўлялі сабой своеасаблівыя кодэксы пакарання. Напрыклад, у 1-й Віленскай гімназіі да 1906 г. практыкаваўся асобы прыём трыццацімінутнага ці нават гадзіннага выстойвання ў калідоры па суседству з кабінетам інспектара. Нярэдка былі выпадкі, калі педагагічныя саветы адпраўлялі навучэнцаў у карцэр.

Кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі ставіла перад навучальнымі ўстановамі задачы выхавання моладзі вернымі Рускай праваслаўнай царкве і адданымі самадзяржаўнаму ладу. Гэта павінна было знайсці сваё адлюстра-

ванне ў практыцы выкладання асобных прадметаў. Выкладанне прыродазнаўства ў сярэдніх навучальных установах павінна было навучыць дзяцей пазнаваць прыроду з тым, каб яны праніклісн «бязмернай любоўю і ўдзячнасцю да яе творцы». Пры выкладанні гісторыі, як адзначалася ў справаздачы аб стане Мінскага рэальнага вучылішча за 1897/98 навучальны год, «асобая ўвага звярталася на вызначэнне важнасці для Расіі манархічнай улады, якая стварыла моц, магутнасць і славу Расіі». Удзел навучэнцаў у літаратурных і літаратурна-музычных вечарах, калядных ёлках, царкоўных харах і іншых пазакласных мерапрыемствах таксама быў прызваны выхоўваць моладзь «вернымі і карыснымі сынамі вялікай Расіі і адданымі служкамі трона».

У адпаведнасці з указаннямі Міністэрства народнай асветы кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі настойліва ўкараняла ў навучальных установах пазакласнае чытанне. Гэтая форма пазакласнай работы, прывучаючы навучэнцаў да чытання рускай мастацкай літаратуры, абмяжоўвала чытанне пэўнымі рамкамі. Кантроль здзяйсняўся пры дапамозе строгага падбору літаратуры для вучнёўскіх бібліятэк, забароны карыстацца кнігамі па-за школьнай бібліятэкай, рэгулявання чытання з боку класных настаўнікаў. Міністэрства народнай асветы ў 90-я гады XIX ст. прадпісала класным настаўнікам складаць спісы літаратуры, абавязковай для чытання. Была ўстаноўлена вельмі строгая цэнзура кніг, якія накіроўваліся ў школьную бібліятэку.

Царскі ўрад, узмацніўшы ў 80—90-я гады XIX ст. барацьбу супраць земскай школы пры дапамозе царквы, пачаў «унутранае» наступленне на народную школу. Міністэрства народнай асветы ўсімі сіламі старалася скараціць вучэбны курс пачатковай школы, адцягнуць яе ўвагу ад вырашэння агульнаадукацыйных задач дзеля задач утылітарна-практычных, імкнучыся правесці прафесіяналізацыю пачатковай школы. Вясковым пачатковым вучылішчам навязваліся такія прадметы, як садаводства, бортніцтва і г. д., у гарадскіх школах узмоцнена ўкаранялася выкладанне розных рамёстваў.

Адначасова Міністэрства народнай асветы імкнулася фармалізаваць працэс навучання ў пачатковай школе, навязваючы ў ёй так званы фармальна-граматычны напрамак. Цэнтр увагі выкладання, адзначаў знакаміты рускі педагог В. П. Вахцёраў, пераходзіў «ад нагляднага навучання і рэальных ведаў да дыктоўкі і граматыкі, каліграфіі і рашэння арыфметычных задач».

для сумеснай распрацоўкі плана вядзення заняткаў па вучэбных кнігах». Такія з'езды былі заклiканы садзейнічаць перадачы вопыту старэйшых пакаленняў настаўнікаў іх маладым калегам, «асабліва ў адносінах да размеркавання матэрыялу для чытання».

З'езд выпрацаваў інструкцыю аб абавязках загадчыкаў двухкласных школ і ролі педагагічных саветаў школ. У ёй было зафіксавана права членаў савета, якія засталіся пры галасаванні ў меншасці, прадстаўляць свае меркаванні ў пратаколе педагагічнага савета. Падобныя «асаблівыя меркаванні» нярэдка сустракаюцца ў матэрыялах навучальных устаноў ведамства епархіі. «Асобныя меркаванні» мелі месца і ў практыцы педагагічных калектываў свецкіх навучальных устаноў, што сведчыла аб наяўнасці пэўных дэмакратычных механізмаў для забеспячэння правоў педагогаў, якія не раздзялялі меркавання большасці.

Вышэй ужо гаварылася аб удзеле вучняў і настаўнікаў у рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гг., іх палітычных і прафесійных патрабаваннях, уступках царскага ўрада ў галіне асветы і школы, зробленых пад уплывам рэвалюцыі. Вучнёўскія хваляванні, якія ахапілі разнастайныя бакі школьнага жыцця і ярка паказалі яго недахопы, паставілі на парадак дня пытанне аб правядзенні радыкальнай школьнай рэформы. Рускі педагог С. Знаменскі, праанализаваўшы ў сваёй кнізе (1909 г.) прычыны вучнёўскіх хваляванняў 1905—1907 гг. і іх значэнне, палітычныя і прафесійныя патрэбы вучняў розных рэгіёнаў Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі, падкрэсліў неабходнасць рэформы сярэдняй школы. «Грамадства, а разам з ім і вучні перараслі школу», — робіць вывад аўтар.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. аказала моцны ўплыў на змест, формы і метады вучэбна-выхаваўчай работы ў школе, характар і напрамак развіцця педагагічнай думкі. Іх развіццё на Беларусі ў значнай ступені пачало вызначацца працэсамі дэмакратызацыі, гуманізацыі, беларусізацыі.

Рэвалюцыя і актыўны ўдзел у ёй моладзі прымусілі кіраўніцтва Міністэрства народнай асветы і Віленскай вучэбнай акругі больш крытычна паглядзець на стан вучэбнай і выхаваўчай работы ў школе і больш энергічна ўзяцца за распрацоўку новых форм уздзеяння на моладзь у саміх навучальных установах. У распараджэнні Міністэрства народнай асветы ад 7 ліпеня 1907 г. былі

ўказаны неабходныя меры ўздзеяння на вучняў. Ад іх патрабавалася ўдумліва і свядома засвойваць матэрыял, звярталася ўвага на трываласць засваення ведаў. І ў той жа час патрабаванні настаўніка да вучняў павінны быць «вызначаны». Настаўнік павінен папаўняць запас ведаў вучняў, «не змешваючы таго, што яны могуць і што ім карысна ведаць, з тым, што яны павінны ведаць». У сувязі з гэтым звярталася ўвага класных кіраўнікоў на раўнамернасць размеркавання вучнёўскай работы. Выражалася думка, што раўнамернасць размеркавання работы вучняў у многім забяспечваецца кантролем за іх ведамі. Так, Міністэрства народнай асветы прызнавала важнай у высокай ступені пастаянную праверку ведаў шляхам разумных апытанняў як асобных вучняў, так і ўсяго класа, і прыняцце неадкладных мер для таго, каб вучні з самага пачатку года не запускалі заняткі. На думку Міністэрства і вучэбнага акруговага начальства, сур'ёзная ўвага педагагічнага персаналу павінна быць звернута, перш-наперш, на глыбокае вывучэнне ў школе рускай гісторыі, мовы і літаратуры.

Услед за гэтым у распараджэнні Міністэрства ад 21 жніўня 1908 г. кіраўнікам навучальных устаноў прадпісвалася звяртаць асаблівую ўвагу на вучэбную і выхаваўчую работу, рэкамендавалася ажыццявіць у гэтым напрамку канкрэтныя меры. Дырэктарам навучальных устаноў прапаноўвалася для паспяховай работы «значную частку вучэбнага дня праводзіць у класах, як мага часцей наведваць урокі выкладчыкаў, сумесна з імі абмяркоўваць пытанні, якія закранаюць выкладанне, поспехі вучняў, правільную ацэнку гэтых вучняў, абуджэнне ў вучняў самастойнасці». Рэкамендавалася бліжэй стаць да вучняў, уважліва адносіцца да іх штодзённых патрэб, улічваць іх індывідуальныя асаблівасці, «прыкладаць усе сілы для паляпшэння іх разумовага і фізічнага развіцця».

У 1907—1910 гг. кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі правяло ў Вільні настаўніцкія з'езды, на якіх абмяркоўваўся стан выкладання амаль усіх вучэбных прадметаў гімназічнага курса. У сакавіку 1907 г. адбыўся з'езд выкладчыкаў рускай мовы і гісторыі сярэдніх навучальных устаноў, у красавіку 1907 г. — замежных моў, у лютым—сакавіку 1908 г. — матэматыкі, фізікі, геаграфіі, у красавіку 1910 г. — выкладчыкаў практычных мастацтваў і рамёстваў Віленскай вучэбнай акругі. З'езды і пытанні, якія на іх абмяркоўваліся, сведчылі аб незадавальненні пастаноўкай навучання і аб неабходнасці змен у сярэдняй

школе. На з'ездах рэзка крытыкаваліся вучэбныя праграмы як устарэлыя, якія не адлюстроўваюць сучасны ўзровень ведаў аб прыродзе і грамадстве, разглядаліся найбольш вострыя праблемы вучэбна-выхаваўчага працэсу — стымуляванне самастойнай пазнаваўчай дзейнасці вучняў, ажыццяўленне міжпрадметных сувязяў, улік і ацэнка ведаў, узаемаадносіны паміж настаўнікам і вучнямі, улік іх індывідуальных асаблівасцей пры навучанні і выхаванні, выяўленне і развіццё задаткаў і здольнасцей.

На пасяджэннях гістарычнай секцыі з'езда выкладчыкаў рускай мовы і гісторыі разглядаліся пытанні аб мінімальных патрабаваннях да вучняў, аб размеркаванні матэрыялу па рускай гісторыі па асобных класах, аб месцы гісторыі Заходняй Русі ў агульным курсе гісторыі.

Выкладчыкі рускай мовы і літаратуры абмяркоўвалі пытанні аб мерах па паляпшэнню выкладання рускай мовы і славеснасці. У выніку было прызнана пажаданым расшырэнне праграмы славеснасці і замена ўстарэлых падручнікаў «больш задавальняючымі сучасным патрабаванням». Шэраг педагогаў прапанавалі выкарыстоўваць у вывучэнні літаратуры творы В. Р. Бялінскага, М. А. Дабралюбава, Д. І. Пісарава, М. Г. Чарнышэўскага і іншых крытыкаў. Большасць удзельнікаў з'езда выказалася за выключэнне царкоўнаславянскай граматы з курса рускай мовы, за навучанне на гутарковай мове.

На з'ездзе выкладчыкаў рускай мовы і гісторыі, як зазначыў А. Крукоўскі, выявілася розніца паміж настаўнікамі Вільні і правінцыі, гэта значыць астатніх беларускіх губерняў. З віленскіх настаўнікаў далёка не ўсе наведвалі пасяджэнні з'езда. Іншымі былі адносіны да з'езда настаўнікаў з правінцыі: «Сярод іх, — адзначаў А. Крукоўскі, — было імкненне высветліць наспеўшыя пытанні вучэбнай практыкі, пашырыць звычайныя рамкі выкладання. Бачна было, што для іх выкладанне, у некаторым сэнсе, жыццёвая справа, і інтарэсы школы, з якой яны цесна зжыліся, — іх асабістыя інтарэсы».

Цыркуляры Міністэрства народнай асветы, выдадзеныя ў паслярэвалюцыйныя гады, па-ранейшаму патрабавалі глыбокага і грунтоўнага вывучэння ў школах рускай мовы і рускай гісторыі, што сведчыла аб нязменнасці русіфікатарскай палітыкі царызму. Такія тэмы пісьмовых работ на экзаменах па геаграфіі, як «Значэнне Масквы і Пецярбурга як прамысловых цэнтраў», ці па грамадзянскай гісторыі — «Аб'яднальная дзейнасць маскоўскіх князёў», якія прапаноўваліся ў гімназіях беларускіх гу-

берняў, былі заклiканы дэманстраваць выключную ролю Расіі, Масквы і Пецярбурга ў гістарычным развіцці нярускіх народаў. Вывучэнню гісторыі і культуры Беларусі не надавалася значнасці, хаця асобныя зрухі ўжо прадбачыліся.

У ходзе разгорнутых дыскусій аб мерах па паляпшэнню вучэбнай і выхаваўчай работы большасць педсаветаў вучэбных устаноў прыходзіла да вываду аб неабходнасці скасавання пазакласнага нагляду, вобыскаў і іншых ганенняў на вучняў. Педсаветы нярэдка прызнавалі «сам факт прад'яўлення патрабаванняў паказальнай з'явай, якая адлюстроўвае нядобрае становішча школы». Педсаветы і настаўніцкая грамадскасць падтрымалі патрабаванні вучняў аб забеспячэнні пераемнасці паміж гарадскім вучылішчам і сярэдняй навучальнай установай, што прывяло ў канчатковым выніку да пераўтварэння гарадскіх вучылішчаў у вышэйшыя пачатковыя вучылішчы.

Пэўны інтарэс уяўляюць канкрэтныя пытанні арганізацыі вучэбнай справы ў Мінскай мужчынскай гімназіі, якія абмяркоўваліся на сходах педагагічнага калектыву гэтай установы ў 1907—1910 гг. Так, на пасяджэнні 8 красавіка 1909 г. прадметам абмеркавання сталі ўказанні дырэктара гімназіі па вучэбна-выхаваўчай частцы. Ён, у прыватнасці, лічыў, што ў канцы вучэбнага года належыць звярнуць сур'ёзную ўвагу на паўтарэнне вучэбных курсаў, зрабіўшы акцэнт не на апытанні дэталяў, а на тое, каб у навучэнцаў склалася цэласнае ўяўленне ад пройдзенага. Зыходзячы з гэтага, неабходна было высветліць сувязь паміж рознымі раздзеламі курса, якая магла недастаткова замацавацца ва ўсведамленні навучэнцаў пры падрабязным праходжанні курса на працягу года. Паўтарэнне курса не павінна з'яўляцца адпачынкам для выкладчыка, а, наадварот, патрабуе ад яго ўзмоцненай і напружанай працы. Дырэктар прасіў выкладчыкаў прыцягваць да ўдзелу ва ўроку ўвесь клас, а не толькі асобных вучняў, уносіць ажыўленне ў тлумачэнне і апытанне на ўроку.

У красавіку 1909 г. на педагагічным сходзе ў Мінскай гімназіі было разгледжана пытанне аб арганізацыі практычных заняткаў па фізіцы. Адзначыўшы, што выкладанне фізікі носіць часам схаластычны характар, настаўнікі выказаліся за ўвядзенне практычных заняткаў па гэтаму курсу і за стварэнне ў гімназіі фізічнай лабараторыі. На думку педагагічнага калектыву, мэта арганізацыі практычных заняткаў па фізіцы павінна была заключацца ў

абуджэнні навуковага інтарэсу сярод навучэнцаў і развіцця ў іх самастойнасці. Было таксама адзначана, што гэтыя заняткі дазволяць выявіць здольнасці некаторых вучняў да навуковай працы з тым, каб далей працягваць навучанне ва універсітэце па прадмету, які спадабаўся.

Выкладчык фізікі гэтай жа гімназіі Лаўрыновіч адзначаў, што ён бачыць адну з галоўных задач у выкладанні фізікі «ва ўстанаўленні заканамернай сувязі паміж самымі разнастайнымі з'явамі. Толькі ў такім выпадку прадметы будуць засвоены навучэнцамі як наладжаная сістэма, аб'яднаная адной ідэяй». Гэта выказванне настаўніка фізікі адпавядала педагагічным прынцыпам міжпрадметных сувязей і сістэмнасці. Думаецца, што яно адпавядае сучаснаму разуменню задач, якія прад'яўляюцца да выкладання фізікі ў сярэдняй школе.

У практыцы работы ў Мінскай мужчынскай гімназіі немалаважнае месца займалі пытанні падрыхтоўкі і напісання навучэнцамі сачыненняў па рускай мове, што падкрэслівае ў прыватнасці разгляд пытання «Аб падрыхтоўцы сачыненняў студэнтамі» на пасяджэнні педагагічнага сходу гімназіі ў 1907/08 навучальным годзе. Па выніках абмеркавання была выпрацавана методыка напісання класнага сачынення. Яна заключалася ў тым, што выкладчык указвае вучням усе крыніцы, з якімі яны павінны азнаёміцца на працягу вызначанага часу, ці нават аб'яўляе вучням загадзя тэму агульнага характару. Затым навучэнцам у адзін з вучэбных дзён адводзіцца дзве гадзіны, на працягу якіх яны павінны напісаць сачыненне на тэму больш вольнага характару або на канкрэтную тэму, заснаваную на крыніцах, якія напярэдадні разбіраліся навучэнцамі па ўказанню настаўніка. Выкладчык ажыццяўляў кантроль за працай навучэнцаў у працэсе падрыхтоўкі і напісання сачыненняў. З гэтай мэтай правяраліся чарнавікі, куды вучні павінны былі заносіць цытаты, вытрымкі з твораў розных аўтараў, канспекты прачытаных артыкулаў, а таксама часткі падрыхтаванага сачынення па меры яго напісання. Уся праца вучня адбывалася на вачах выкладчыка, што дазваляла яму больш аб'ектыўна ацаніць яе. На вышэйадзначаным педагагічным сходзе ў Мінскай гімназіі, які быў прысвечаны пытанню аб сачыненнях, было таксама вырашана замяніць частку дамашніх сачыненняў класнымі.

Вышэйшае школьнае кіраўніцтва выявіла пэўны неспакой адносна тэматыкі сачыненняў, рэкамендуючы максімальна аддаліць яе ад злабадзённых грамадска-палі-

тычных праблем. У цыркуляры Міністэрства народнай асветы (1907 г.) кіраўнікам сярэдніх навучальных устаноў загадвалася, што «класныя сачыненні павінны быць невялікага памеру і пэўнага, даступнага навучэнцам зместу, прычым тэмы назначаюцца пераважна літаратурныя, але не так званыя вольныя». І кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі і навучальных устаноў беларускіх губерняў выконвала гэты загад.

Затое іншую карціну даюць матэрыялы царкоўных навучальных устаноў. Вось якія тэмы сачыненняў былі рэкамендаваны кіраўніцтвам Полацкага мужчынскага духоўнага вучылішча для здачы экзамену на званне настаўніка аднакласнай і царкоўнапрыходскай школы ў 1910—1912 гг.: «Дзеці беларускіх сялян», «Рака Дрыса», «Народнае вучылішча ў сяле Новіках», «Земляробчыя прылады беларускіх сялян», «Маё дзяцінства і юнацтва». Можна сказаць, што нават павярхоўнае асвятленне дадзенай тэматыкі, блізкай розуму і сэрцу дзяцей беларускіх сялян, якія вучыліся ў духоўным вучылішчы, дазволіла ім закранаць і раскрываць глыбокі сэнс сацыяльна-эканамічных і нацыянальна-культурных умоў, у якіх яны знаходзіліся.

Зусім паказальнае і красамоўнае ў гэтых адносінах сачыненне М. Ціцянкова на тэму «Дзеці беларускіх сялян». Аўтар у няхітрай, шчырай форме сказаў аб тым, што дзеці беларускіх сялян выхоўваюцца неаднолькава, што звязана з наяўнасцю грашовых сродкаў у сям'і. Ён прыходзіць да высновы, што «ў беднага селяніна дзіця выхоўваецца дрэнна, таму што ва ўсім недахоп. Пагэтаму яму прыходзіцца з апошняй капейкі даваць выхаванне. Дзеці больш багатых сялян выхоўваюцца лепш, таму што ў іх больш сродкаў і самі яны бываюць больш адукаваныя, чым беднякі». Пазбаўлены магчымасці вучыцца беларус замыкаецца ў сабе, і таму «характар сялянскіх дзяцей бывае пануры і сарамлівы». М. Ціцянкоў лічыць, што так адбываецца з-за таго, што не бачыць беларускае дзіця ў сваім жыцці ніводнага «добрага прыкладу», бо выхавацелі — бацька і маці — «самі дрэнна выхаваны».

Сацыяльны характар мае і сачыненне І. Антановіча на тэму «Беларускі селянін». Аўтар піша́, што беларускі селянін складае «самы нізкі клас насельніцтва Расіі» і што ён «стаіць на ніжэйшай ступені развіцця... і ўсё сваё жыццё праводзіць у галечы». Горыччу, болем, спачуваннем і абурэннем напоўнены радкі гэтага і іншых юнацкіх сачыненняў.

Прыведзеная вышэй тэматыка сачыненняў выпускнікоў духоўнага вучылішча сведчыць аб тым, што царкоўнашкольныя колы, рэагуючы на зніжэнне аўтарытэту царкоўных пачатковых навучальных устаноў і імкнучыся ўзмацніць свой уплыў сярод беларускіх сялян, не баяліся звяртаць увагу сваіх выхаванцаў на вострыя сацыяльныя праблемы беларускай вёскі.

У ходзе педагагічных дыскусій важнае значэнне надавалася выпрацоўцы дыдактычных патрабаванняў да ўрока, як асноўнай формы навучання ў школе. Так, на педагагічным зборы Мінскай мужчынскай гімназіі ад 6 красавіка 1910 г. былі сфармуляваны наступныя патрабаванні, якія прад'яўляліся да работы выкладчыка на ўроку: 1) не захапляцца, а захапляць; 2) умець растлумачыць матэрыял так, каб яго разумелі ўсе навучэнцы; 3) умець зацікавіць навучэнцаў, але не красамоўствам або ведамі настаўніка, а ўласнай іх працай, працэсам гэтай працы; 4) механіка выкладання павінна заключацца ў авалоданні ўвагай усяго класа як цэлага і адзінага калектыву, а не асобных вучняў, побач з прозвішчамі якіх трэба выстаўляць адзнакі; 5) вучэбны матэрыял павінен быць настолькі добра перапрацаваны і засвоены ў класе, што «літаральны адказ па падручніку складае ўжо само па сабе нешта злачыннае». Выкладчык ні ў якім разе не павінен быць задаволены такімі адказамі. Як нам здаецца, дадзеныя патрабаванні да правядзення ўрочных заняткаў адпавядаюць прынцыпам дыдактыкі і могуць быць прыменены ў сучаснай методыцы навучання.

У 1914—1915 гг. на педсаветах сярэдніх навучальных устаноў разгарнуліся дыскусіі вакол цыркуляра папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі В. Г. Аляксеева ад 24 лістапада 1914 г. аб павышэнні якасці вучэбнай работы. Вынікі гэтых дыскусій былі сабраны і абагульнены ў «Матэрыялах па арганізацыі школьнага навучання на асновах навуковай педагогікі», выдадзеных у Вільні ў 1915 г. Гэтыя матэрыялы, якія ўяўляюць сабой яшчэ недастаткова даследаваную крыніцу каштоўных педагагічных знаходак, заслугоўваюць таго, каб прааналізаваць іх больш грунтоўна.

У цыркуляры Аляксеева гаварылася, што ў аснове педагогікі ляжаць дзве навукі: псіхалогія і этыка, якія адначасова з'яўляюцца дапаможнымі ў адносінах да педагогікі. Псіхалогія праяўляе характар педагагічных прыёмаў, пры дапамозе якіх педагогіка дасягае сваіх мэт, а мэты, да якіх павінны прывесці ўсе педагагічныя імкненні, вызна-

чае этыка, г. зн. вучэнне аб маральнасці. Аляксееў вызначае 4 стадыі навучання: 1) уяўленні і адпаведныя ім паняцці; 2) падрыхтоўка старых ведаў вучня; 3) паведамленне новых звестак; 4) высновы і дадаткі. Калі веды будуць паведамляцца ў такой паслядоўнасці, то «будуць сграваць душу і заахвочваць вучня да самастойных заключэнняў, да прымянення засвоеных ім ведаў, г. зн. выклічуць цікавасць». Прычым інтарэс павінен быць выкліканы рознымі прадметамі навучання, тады ён будзе шматбаковы.

Далейшыя разважанні прывялі В. Г. Аляксеева да ідэі «канцэнтрацыі выкладання», якая ўпершыню была выказана Я. А. Каменскім. Гэта канцэнтрацыя дасягаецца хутчэй за ўсё тады, калі з класам працуе адзін выкладчык, г. зн. у пачатковай школе. У сярэдняй школе ёсць неабходнасць аб'яднання розных прадметаў выкладання і адпаведна каардынацыі планаў і дзеянняў розных выкладчыкаў класа, што дасягаецца шляхам нарад выкладчыкаў дадзенага класа.

Зыходзячы з уласнага вопыту наведвання розных вучэбных устаноў акругі, папячыцель заключае, што «найбольш педагагічна ідзе выкладанне ў пачатковых школах. Некаторыя адступленні ад гэтых патрабаванняў педагогікі дапускаюцца ў вышэйшых пачатковых школах і амаль зусім не карыстаюцца дадзенымі навуковай педагогікі выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў».

Цяжка сказаць, чым былі выкліканы падобныя вывады Аляксеева. Вядома, захаванне фармальных патрабаванняў педагогікі лягчэй кантраляваць у пачатковай школе. Значна цяжэйшай была справа з сярэднімі навучальнымі ўстановамі, з іх духам вальнадумства і бунтарства, настаўнікамі-наватарамі, якія не жадалі прытрымлівацца ўстарэлых педагагічных падыходаў.

Ідэі і палажэнні, выказаныя В. Г. Аляксеевым, як і ў цэлым надзённыя праблемы вучэбна-выхаваўчага працэсу, актыўна абмяркоўваліся на пасяджэннях педагагічных саветаў сярэдніх навучальных устаноў. Так, дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута Д. А. Сцяпура лічыў, што ажыццяўленню навуковага падыходу ў педагагічным працэсе перашкаджаюць шматпрадметнасць і перагрузка вучэбнага плана інстытута, які неабходна выканаць за 3 гады. Ён пагадзіўся з меркаваннем Аляксеева ў тым, што канцэнтрацыя выкладання можа быць дасягнута толькі ў выпадку ўзаемадапаўнення сумежных прад-

метаў і ўстанаўлення ўнутранага адзінства паміж прадметамі, якія выкладаюцца; гэта будзе садзейнічаць стварэнню ў навучэнцаў цэласнага светаўспрымання.

Дырэктар Вілейскай гімназіі М. А. Клімантовіч у сваім выступленні на пасяджэнні педагагічнага савета гімназіі ад 27 студзеня 1915 года заявіў, што сярэднія навучальныя ўстановы павінны атрымліваць самастойнасць. На яго думку, трагізм педагога сярэдняй школы, яго незадаволенасць заключаецца ў тым, што кіраўнік можа дзейнічаць толькі «ў межах устаноўленых форм школы». Выпрацаваныя навуковай педагогікай прыёмы навучання нельга ажыццявіць пры цяперашнім становішчы сярэдняй школы. Перашкодай для іх рэалізацыі з'яўляецца перш за ўсё памылковае разуменне прызначэння школы, якая павінна быць перш за ўсё навучальнай установай, а не дзяржаўнай (для набыцця грамадзянскіх правоў). М. А. Клімантовіч назваў і такія вядомыя хібы школы, як яе перапоўненасць, пастаяннае змяненне саставу класаў, неаднароднасць гэтага саставу ў сэнсе здольнасцей вучняў і іх развіцця, перагрузка вучэбнымі прадметамі, няўзгодненасць курсаў, абмежаванасць гадзін на праходжанне вучэбнага матэрыялу.

Дырэктар Мінскага рэальнага вучылішча І. В. Папоў з мэтай дасягнення канцэнтрацыі навучання выказаў меркаванне педагагічнага савета па пытаннях «аб'яднання выкладання, у прыватнасці, геаграфіі, гісторыі і рускай мовы». Ён абгрунтаваў гэта тым, што выкладанне розных прадметаў можа быць аб'яднана з боку метаду выкладання вучэбнага матэрыялу, з боку задачы, мэты навучання і выхавання. Цікавая думка Папова аб тым, што сярэдняя школа, кіруючыся ў сваёй дзейнасці навуковым падыходам, павінна тым не менш на першы план ставіць інтарэсы навучэнцаў, а не інтарэсы навукі. Ён падкрэсліў, што ў аснову вывучэння такіх прадметаў, як гісторыя, геаграфія, руская мова і часткова прыродазнаўства «павінна быць пакладзена развіццё нацыянальнага пачуцця, любові да свайго роднага краю, роднай прыроды, роднай мовы». Для беларусаў, чые нацыянальныя пачуцці, культура, мова ўсяляк прыцясняліся, падобная заява магла стаць маніфестам нацыянальнага адраджэння. Аднак Папоў, рускі па нацыянальнасці, ураджэнец Уладзімірскай губерні, меў на ўвазе патрыятычныя інтарэсы адзінай і непадзельнай Расіі, якая ўступіла ў цяжкую вайну з германскім блокам.

На педагагічным сходзе выкладчыкаў Віцебскай жано-

чай гімназіі пад старшынствам яе кіраўніка К. І. Ціхамірава было прапанавана настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў мэтах лепшага засваення дзецьмі важнейшых гістарычных і геаграфічных дат паведамляць выкладчыкам арыфметыкі гэтыя даты як матэрыял для складання арыфметычных задач, што надасць большую шырыню і жыццёвасць гэтым задачам і вылічэнням.

Педагагічны савет Быхаўскай мужчынскай гімназіі пад старшынствам дырэктара Д. І. Очкіна выпрацаваў комплекс мер па паляпшэнню вучэбна-выхаваўчага працэсу. Па пытаннях выхавання яны зводзіліся да таго, каб пры парушэнні навучэнцамі дысцыпліны карыстацца перш за ўсё маральным уздзеяннем і толькі ў пэўных выпадках прыбягаць да дысцыплінарных спагнанняў. Па пытаннях навучання было прапанавана прымаць усе меры, каб зацікавіць вучняў прадметам выкладання і зрабіць яго засваенне лёгкім, канцэнтраваць увагу навучэнцаў на найбольш важным, галоўным, не абцяжарваць іх празмернымі другараднымі падрабязнасцямі, каардынаваць кожны дзень работу настаўнікаў-прадметнікаў і такім чынам дасягнуць канцэнтрацыі выкладання.

Рэдакцыйны артыкул 4-га выпуску «Матэрыялаў па арганізацыі школьнага навучання на пачатках навуковай педагогікі» прысвечаны выкананню ўмоў, якія садзейнічаюць ажыццяўленню ў школе педагагічнага ўздзеяння на вучня. Галоўнейшая з іх — гэта разуменне асобы вучня на аснове вывучэння яго індывідуальных уласцівасцей і асаблівасцей. Адзначаецца, што сродкі вывучэння навучэнца, якія прымяняюцца ў сучаснай школьнай практыцы, недастатковыя і аднабаковыя. У артыкуле падвяргаюцца крытыцы кандуітныя часопісы, якія зневажаюць годнасць навучэнцаў, адлюстроўваюць толькі іх правіннасці, а не станоўчыя якасці. Аўтары артыкула са спачуваннем адзначаюць, што практычна галоўнай крыніцай вывучэння асобы навучэнца служыць рэгістрацыя яго негатыўных дзеянняў.

У вачах педагога-выхавацеля вучань павінен быць не падсудным, не пацыентам, а жывой чалавечай асобай. Вучнёўскія хібы ў вачах педагога — гэта не правіннасць, не хвароба, а перш за ўсё такая педагагічная з'ява, якая мае педагагічную прычыну і патрабуе сваіх педагагічных сродкаў. Значная ўвага ў артыкуле ўдзяляецца аналізу псіхалагічных асноў і сродкаў выхавання. Цікавыя ідэі і прапановы выказваліся ў 6-м выпуску матэрыялаў, прысвечанаму абмеркаванню цыркуляра па-

пячыцеля Віленскай вучэбнай акругі аб сутнасці выхаваўчых ідэй (ад 14 лютага 1915 г.).

У цэлым «Матэрыялы па арганізацыі школьнага навучання на пачатках навуковай педагогікі» карысталіся ўвагай педагагічнай грамадскасці за межамі Віленскай вучэбнай акругі. Яны ўтрымлівалі securitynabakovyя ідэі, прапановы, рэкамендацыі, абагульненні педагагічнага вопыту вучэбных устаноў Паўночна-Заходняга краю. Дадзеныя матэрыялы з'яўляюцца калектыўным укладам у развіццё педагагічнай думкі, які быў здабыты намаганнямі і творчай работай кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі, кіраўнікоў педагагічных саветаў сярэдніх вучэбных устаноў, шматлікіх педагогаў і настаўнікаў-наватараў.

Другой змястоўнай крыніцай педагагічнага вопыту, здабытага настаўніцтвам Беларусі ў пачатку XX ст., была кніга А. І. Шэстава «Навуковая педагогіка і руская школа», выдадзеная ў Юр'еве ў 1916 г. Прааналізаваўшы і абагульніўшы недахопы вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдніх навучальных установах Віленскай вучэбнай акругі, аўтар прыйшоў да высновы, што гэтыя ўстановы не змаглі стаць «самастойнай школай для жыцця», а былі толькі «дрэннымі падрыхтоўчымі класамі для вышэйшай школы». У мэтах выйсця школы з крызіснага становішча А. І. Шэстаў прапанаваў: выпрацаваць нацыянальную сістэму выхавання і навучання; галоўную ўвагу надаваць педагагічнай навуцы і асабліва павышэнню яе ўзроўню ў педагагічным асяроддзі; ажыццявіць збліжэнне школы з сям'ёй і ўдзел усіх здаровых сіл грамадства ў арганізацыі школьнай сістэмы.

Пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі выдала шэраг цыркуляраў і распараджэнняў аб актывізацыі выхаваўчай дзейнасці навучальных устаноў. У 1908 г. у Вільні была створана акруговая вучэбная камісія па знаходжанню мер садзеяння фізічнаму, маральнаму і разумоваму развіццю навучэнцаў. Камісія прыняла шэраг пастаноў аб фізічным выхаванні, аб экскурсіях, аб уздзеянні школы на навучэнцаў у час канікул, аб вучнёўскіх летніх дачах, аб ручной працы, аб дрэвапасадцы, аб наведванні навучэнцамі царквы, аб выкладанні спеваў і музыкі і г. д. Няцяжка зразумець, што мэтай гэтых выхаваўчых мерапрыемстваў было імкненне запоўніць вольны час навучэнцаў, узмацніць кантроль за выкарыстаннем імі свайго вольнага часу, адцягнуць увагу ад чужога «шкоднага» ўплыву. З боку вучэбнага кіраўніцтва, асабліва ў гады новага рэвалюцый-

нага ўздыму, наглядаўся адыход ад рэпрэсіўных форм да «гуманных» метадаў уздзеяння на навучэнцаў. Аб гэтым сведчыла цыркулярнае распараджэнне папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі ад 16 красавіка 1916 г. «Аб неабходнасці ў школе далікатнасці з боку выкладчыкаў і павагі ў адносінах да навучэнцаў».

Адным з галоўных сродкаў выхаваўчага ўздзеяння на навучэнцаў па-ранейшаму заставалася пазакласнае чытанне. Педагагічны савет Мінскай мужчынскай гімназіі, разгледзеўшы ў 1914 г. пытанне «Аб пазакласным чытанні вучняў», адзначыў, што ўзровень пазакласнага чытання стаў прыкметна зніжацца, у сувязі з чым было прапанавана скласці камісію з настаўнікаў-прадметнікаў для перагляду каталогаў бібліятэкі. Напэўна, размова ішла аб пашырэнні кола чытання для навучэнцаў. Вялікае значэнне, асабліва пасля пачатку першай сусветнай вайны, стала надавацца фізічнаму выхаванню навучэнцаў. Так, педагагічны сход Мінскага настаўніцкага інстытута 2 мая 1916 г. прыняў рашэнне аб тым, што на першы план павінна быць пастаўлена фізічнае выхаванне моладзі. Новай формай выхаваўчай работы сталі экскурсіі. З'яўляючыся важным сродкам нагляднасці, яны былі заклікаsuccessfully ўмацаваць сувязь школы з жыццём, практыкай. Экскурсіі дазвалялі навучэнцам дэманстраваць сваю самастойнасць, шырэй знаёміцца з прыродай, насельніцтвам, эканомікай і культурай Беларусі.

Ключавой фігурай у справе пераўтварэння школы, перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу павінен быў стаць настаўнік. Між тым прафесіянальны і культурны ўзровень многіх настаўнікаў вучэбных устаноў Беларусі пакідаў жадаць лепшага. Аб гэтым адкрыта гаварылася на пасяджэнні педагагічных саветаў, у друку. У прыватнасці, педагагічны савет Мінскай мужчынскай гімназіі 6 красавіка 1910 года адзначыў: сучасная школа пакутуе ад таго, што «на працягу доўгіх гадоў у ёй вучылі не педагогі», што наносіла школе непапраўнае зло і давяло яе да крызісу. Крукоўскі, які добра ведаў жыццё і норавы настаўніцкага асяроддзя ў Віленскай вучэбнай акрузе, пісаў, што «знаёмства выкладчыкаў з часопісамі і кнігамі было з'явай даволі рэдкай, у некаторых навучальных установах Вільні, можна сказаць, выключным». Настаўнікі-падзвіжнікі пакутавалі ад дробязнай апекі, казёншчыны і фармалізму. Педагагічная грамадскасць выступала за паляпшэнне прававога і матэрыяльнага становішча педагогаў, патрабавала даць ім большую свабоду ў раз-

меркаванні вучэбнага матэрыялу, прызначэнні часу для розных самастойных і іншых работ, пазбаўленне ад дробязнай апекі.

На ніве народнай асветы Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. выраслі і сталі сапраўднымі майстрамі сваёй справы сотні высокапрафесійных настаўнікаў, якія сеялі ў народзе «разумнае, добрае, вечнае». Гэта былі людзі высокіх маральных і дзелавых якасцей, яны карысталіся аўтарытэтам і павагаю як у настаўніцкім асяроддзі, так і ў народзе. Яны няспынна працавалі над павышэннем свайго навуковага і культурнага кругагляду, удасканальваннем педагагічнага майстэрства, прымалі ўдзел у розных навуковых і педагагічных форумах. За перыяд ад 1861 да 1917 г. больш чым 350 прадстаўнікоў Беларусі прынялі ўдзел у рабоце 22 расійскіх навуковых і педагагічных з'ездаў. Сярод іх 242 чалавекі былі выкладчыкамі сярэдніх навучальных устаноў. Беларускія педагогі прымалі ўдзел у рабоце I і II Усерасійскіх з'ездаў фізікі, хіміі, касмаграфіі, шэрага з'ездаў рускіх даследчыкаў прыроды і ўрачоў, 1 і 2 Мендзялееўскіх з'ездаў і інш. На некаторых з гэтых з'ездаў прадстаўнікі настаўніцтва Беларусі выступалі з дакладамі.

Выкладчыкі гімназій і іншых навучальных устаноў Беларусі рыхтавалі і выдавалі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для пачатковых і сярэдніх школ. У канцы XIX — пачатку XX ст. настаўнікамі матэматыкі вучэбных устаноў Беларусі ў друкарнях беларускіх гарадоў было апублікавана 56 кніг па матэматыцы. Падрыхтаваныя і выдадзеныя імі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі атрымалі распаўсюджванне ў Расіі і неаднаразова перавыдаваліся. Найбольш вядомымі беларускімі аўтарамі вучэбных дапаможнікаў былі А. К. Жбікоўскі , выкладчык матэматыкі Мінскай гімназіі, і Б. П. Чыханаў, выкладчык матэматыкі і дырэктар Мінскага камерцыйнага вучылішча. Б. П. Чыханаў напісаў і выдаў у пачатку XX ст. падручнікі для сярэдніх навучальных устаноў па арыфметыцы, алгебры, трыганаметрыі і элементарнай тэорыі імавернасці, склаў табліцы пяцізначных функцый. Найбольшае прызнанне і адзнаку спецыялістаў атрымаў яго падручнік арыфметыкі, які вытрымаў у пачатку XX ст. 9 выданняў; 6-е выданне падручніка было дапушчана вучэбным камітэтам Міністэрства народнай асветы ў якасці кіраўніцтва для сярэдніх навучальных устаноў, а 7-е выданне атрымала высокую ацэнку на I Усерасійскім з'ездзе выкладчыкаў матэматыкі.

Адной з прыметных праяў працэсу дэмакратызацыі вучэбнай справы ў сярэдніх навучальных установах Беларусі з'явілася ўвядзенне курса беларусазнаўства. Пачатак гэтаму быў пакладзены ў Мінскім настаўніцкім інстытуце, выхаванцы якога, як адзначалася на пасяджэнні педсавета 17 красавіка 1917 г., «пазналі жывы інтарэс да вывучэння роднага Беларускага краю». Але гэты інтарэс не мог быць задаволены з-за крайняй беднасці матэрыялаў у бібліятэцы інстытута, таму педсавет звярнуўся да выкладчыка гісторыі У. М. Ігнатоўскага (у будучым вядомага беларускага гісторыка) з просьбай: пры паездцы ў Маскву набыць неабходныя кнігі па вывучэнню Беларусі. Значную ролю ў ажыццяўленні ідэі беларусізацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе адыграў дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута Д. А. Сцяпура.

Такім чынам, у перыяд, які разглядаецца, у змесце, формах і метадах вучэбна-выхаваўчага працэсу ў навучальных установах Беларусі адбыліся даволі значныя змены. К пачатку XX ст. ужо ў значнай ступені дыскрэдытавалі сябе ўстаноўкі Міністэрства народнай асветы аб тым, што пачатковая школа павінна даваць вузка прафесійную, а сярэдняя — класічную адукацыю. Былі зроблены важнейшыя крокі па рэалізацыі прагрэсіўных ідэй аб адзінай адукацыйнай школе. Аднак у цэлым вучэбна-выхаваўчы працэс у навучальных установах Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, не адпавядаў патрабаванням часу. Школьная адукацыя перажывала крызіс і патрабавала радыкальнай рэформы. Гэта яскрава прадэманстраваў удзел вучняў і настаўнікаў Беларусі ў рэвалюцыі 1905—1907 гг., вылучэнне імі комплексу палітычных і прафесійных патрабаванняў.

Кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі, начальнікі навучальных устаноў зрабілі пэўныя высновы з рэвалюцыйных падзей. У 1907—1917 гг. у педагагічным працэсе ўсё больш выразна сталі праяўляцца рысы дэмакратызацыі, гуманізацыі адносін паміж настаўнікамі і навучэнцамі, беларусізацыі (уліку нацыянальнай спецыфікі) у выкладанні асобных прадметаў, перш за ўсё гуманітарнага цыкла. Актывізавалася дзейнасць педсаветаў сярэдніх навучальных устаноў, якія разглядалі на сваіх пасяджэннях многія актуальныя пытанні навучання і выхавання, развіцця педагагічнай думкі. Педагагічныя калектывы, настаўнікі-наватары выступілі з цікавымі ідэямі, меркаваннямі і планамі, накіраванымі на перабудову школьнай справы на асновах навуковай педагогікі. Асаблівая ўва-

га звярталася на рэалізацыю педагагічных прынцыпаў (пераймальнасці, сістэмнасці, міжпрадметных сувязей), што знайшло сваё адлюстраванне ў ідэі «канцэнтрацыі навучання». У практыцы выхаваўчай работы ажыццяўляўся пераход ад «рэпрэсіўнай» да «гуманнай» педагогікі, заснаванай на ўліку індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў, даных псіхалогіі, этыкі і іншых навук. Укараняліся новыя формы выхавання — экскурсіі, паходы, дрэванасаджэнні, павышалася роля фізічнага выхавання.

Але радыкальнага абнаўлення педагагічнага працэсу не адбылося. Царскі рэжым, Міністэрства народнай асветы не маглі, ды і не хацелі ажыццявіць рэформы, накіраваныя на пераўтварэнне школы ў сапраўды вольны і дэмакратычны інстытут грамадства, які б функцыянíраваў на асновах навуковай педагогікі.

## Па старонках педагагічных часопісаў

Важнейшым праяўленнем грамадска-педагагічнага руху на Беларусі канца XIX — пачатку XX ст., значным фактарам развіцця педагагічнай думкі з'явілася стварэнне перадавымі коламі настаўніцтва педагагічных таварыстваў і выданне імі часопісаў і зборнікаў. Педагагічныя таварыствы ў Беларусі ўзніклі на аснове «Нарматыўнага Статута таварыства ўзаемнай дапамогі навучэнцам і настаўнікам» ад 5 ліпеня 1894 г. У 1897 г. было створана «Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам народных вучылішчаў Віцебскай губерні», у 1901 г. узніклі таварыствы народных настаўнікаў Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў, у 1907 г. — Гродзенскае педагагічнае таварыства выкладчыкаў сярэдніх навучальных устаноў. Педагагічныя таварыствы мелі даволі разгалінаваную сетку. Напрыклад, Магілёўскае педагагічнае таварыства мела філіялы ў 9 павятовых гарадах — Быхаве, Гомелі, Горках, Клімавічах, Мсціслаўлі, Оршы, Рагачове, Чавусах, Чэрыкаве (адкрыты ў 1909—1910 гг.).

Стварэнне педагагічных таварыстваў дыктавалася неабходнасцю аб'яднання настаўніцкіх сіл на абарону сваіх матэрыяльных і прафесійных інтарэсаў. Настаўніцкія таварыствы аказвалі тым, хто адчуваў патрэбу, матэрыяльную дапамогу для лячэння, выхавання дзяцей, асігноўвалі срокі на адкрыццё бібліятэк, выдзялялі дапаможнікі слухачам агульнаадукацыйных і педагагічных курсаў у Маскве, Пецярбургу, Кіеве. Грашовы бюджэт кожнага

таварыства складаўся ў асноўным з членскіх узносаў. Таму вялася работа па далучэнню як мага большай колькасці настаўнікаў да правадзейных членаў таварыства. Так, педагагічнае таварыства Мінскай губерні ў 1912 г. складалася з 1325 правадзейных членаў — гэта былі амаль усе настаўнікі міністэрскіх і народных вучылішч губерні.

Важнай задачай таварыстваў было пашырэнне, распаўсюджванне эфектыўных метадычных прыёмаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе, перадавых педагагічных ідэй, абмен вопытам выкладання і выхавання ў навучальных установах Віленскай вучэбнай акругі, папулярызацыя падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў перадавых рускіх педагогаў, павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў. У прыватнасці, Гродзенскае педагагічнае таварыства шырока практыкавала правядзенне агульных сходаў, на якіх слухаліся даклады і рэфераты па пытаннях педагогікі, гісторыі, гісторыі педагогікі, псіхалогіі; сістэматычна арганізоўвалася чытанне публічных лекцый, якія раней у горадзе не наладжваліся.

Пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. дзейнасць педагагічных таварыстваў узбагацілася такім важным напрамкам, як выданне педагагічных часопісаў і зборнікаў. У 1905—1907 гг. у Вільні выдаваўся часопіс «Педагогические записки» (выйшла 18 нумароў) як дадатак да часопіса для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту «Зорька». У 1908 г. выйшаў у свет зборнік групы настаўнікаў і настаўніц Віцебскай губерні «Голос учителя». У 1909 г. у Пецярбургу быў выдадзены зборнік віцебскіх настаўнікаў «Белорусский учитель». У 1910—1911 гг. Магілёўскае педагагічнае таварыства выпусціла 6 нумароў часопіса «Белорусский учительский вестник». З 1911 па 1914 г. выходзіў часопіс Гродзенскага педагагічнага таварыства «Педагогическое дело».

Грамадска-палітычная і нацыянальна-культурная арыентацыя гэтых выданняў была рознай, што адбілася на іх лёсе. «Голос учителя» і «Белорусский учитель», якія адлюстроўвалі прагрэсіўныя настроі беларускага народнага настаўніцтва, былі забаронены пасля выхаду першых жа нумароў у сувязі з антыўрадавым характарам сваіх выступленняў. «Белорусский учительский вестник», нягледзячы на тое, што ўхіляўся ад ацэнкі грамадска-палітычных пытанняў, тым не менш быў закрыты пасля выхаду шостага нумару ў 1911 г. Да мясцовых акцябрыстаў прымыкаў часопіс «Зорька», які выдаваўся ў 1905—

1912 гг., як і яго працяг «Педагогические записки». Крыху больш за іншыя змог пратрымацца часопіс «Педагогическое дело» (выйшла 12 нумароў), які па цэнзурных прычынах пазбягаў вострых грамадска-палітычных матэрыялаў, абмяжоўваўся пытаннямі педагагічнай асветы і распаўсюджвання вопыту настаўнікаў-наватараў. Па сваёй арыентацыі гэта быў часопіс ліберальна-асветніцкага накірунку.

Якія ж мэты і задачы ставілі перад сабой органы педагагічных таварystваў і гурткоў, у чым яны бачылі сваё прызначэнне? У рэдакцыйным звароце зборніка «Голос учителя» адзначалася, што з'яўленне яго выклікана даўно наспелымі патрэбамі. Ва ўмовах, калі на чарзе стаяць пытанні ўвядзення ўсеагульнага навучання і карэннага пераўладкавання пачатковай школы, асабліва важным і неабходным з'яўляецца голас самога настаўніка. Рэдакцыя лічыла, што настаўнік абавязаны быць праваднікам асветы, кіраўніком народа, весці энергічную пазашкольную асветніцкую і грамадскую дзейнасць. Але для гэтага настаўніку неабходна быць у поўным узбраенні ведамі і вопытам. Звярталася ўвага на неспрыяльныя ўмовы жыцця настаўнікаў, у прыватнасці на немагчымасць сучаснага азнаямлення «з навейшымі плынямі ў галіне педагагічнай думкі». «Аб'яднанне настаўніцтва вакол ідэалаў вольнай дэмакратычнай школы і вакол ідэалаў настаўніка як кіраўніка народа , з'яднанне на глебе разумовай узаемадапамогі і маральнай падтрымкі — вось задача зборніка», — гаварылася ў рэдакцыйным артыкуле. Зборнік меў намер удзяліць асобнае месца жыццю царкоўнапрыходскіх школ. Рэдакцыя заявіла пра тое, што неабходна ўстанавіць адзіны тып пачатковай школы, школы свецкай, свабоднай, якая знаходзіцца ў распараджэнні органаў грамадскага самакіравання.

Рэдакцыйны зварот, якім быў адкрыты зборнік «Голос учителя», уяўляў сабой своеасаблівую праграму грамадска-педагагічнай дзейнасці прагрэсіўных колаў народнага настаўніцтва Беларусі. Зборнік разглядаўся рэдакцыяй як адзін са сродкаў кансалідацыі прыхільнікаў радыкальнага пераўтварэння школьнай справы.

«Голос учителя», заявіўшы ў рэдакцыйным звароце пра адмоўныя адносіны да канфесіянальных школ, выступіў супраць царкоўнапрыходскіх школ, паказваючы на іх надзвычай нізкую адукацыйна-выхаваўчую ролю.

У артыкуле настаўніцы адной са школ давалася негатыўная ацэнка «Книге для чтения в народных училищах

Северо-Западного края», выдадзенай М. Адзінцовым і В. Багаяўленскім у 1896 г., якая была асноўным падручнікам па чытанню для пачатковай школы Віленскай вучэбнай акругі да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Настаўніца адмоўна выказвалася аб арганізацыі навучання ў аднакласнай царкоўнапрыходскай школе. Антыцаркоўнай накіраванасцю адрозніваецца змешчаны ў «Голосе учителя» артыкул «Из жизни церковноприходской школы», у якім адлюстравана вострая незадаволенасць педагагічнай грамадскасці і насельніцтва спробай царскага ўрада ўзаконіць царкоўнапрыходскія школы шляхам ўключэння іх у сетку пачатковых школ у праекце закону аб усеагульным навучанні.

Важныя і адказныя задачы ў галіне выхавання, навучання адукацыі школьнікаў, павышэння кваліфікацыі настаўніка паставіла перад сабою і рэдакцыя зборніка «Белорусский учитель», першы і адзіны нумар якога выйшаў у Пецярбургу ў лютым 1909 г. У рэдакцыйным артыкуле гаварылася пра тое, што на Беларусі ўжо даўно наспела неабходнасць у органе друку для ўсебаковага асвятлення патрэб і інтарэсаў народнага настаўніка, і ў сувязі з гэтым успаміналася пра выхад у Віцебску зборніка «Голос учителя», выданне якога, як адзначалася, было адразу ж спынена. Паказвалася, што ў Магілёўскім настаўніцкім таварystве ўзнята пытанне пра стварэнне перыядычнага настаўніцкага органа для Магілёўскай і суседніх губерняў.

Рэдакцыя зборніка падкрэслівала, што настаўнікі павінны прыняць удзел у абмеркаванні такіх важных пытанняў, якія стаяць на парадку дня, як увядзенне ўсеагульнага навучання і рэформа школы, устанаўленне тыпаў школ, распрацоўка вучэбных праграм, метадаў навучання і выхавання, педагагічная і агульнаадукацыйная падрыхтоўка настаўніка. Рэдакцыя заявіла аб сваім намеры змяшчаць артыкулы, прысвечаныя культурна-асветным задачам настаўніка, які з'яўляецца амаль адзіным інтэлігентам, знаходзячыся ў пастаянных зносінах з народам... Не быў абдзелены ўвагай і працэс «абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў», які назіраўся на працягу гадоў, што знайшло сваё адлюстраванне ва ўзмацненні інтарэсу да беларускай мовы, нацыянальнай беларускай школы. «Да вырашэння гэтых пытанняў, — гаварылася ў заключэнні рэдакцыйнага артыкула, — бліжэй, чым хто іншы, стаіць беларускі настаўнік, таму яго абавязак выказваць аб гэтым сваё аўтарытэтнае меркаванне».

У зборніку былі змешчаны артыкулы аб мове выкладання ў школах Беларусі, пакараннях і заахвочваннях, мастацтве ў пачатковай школе, матэрыялы «Записки учителя», «Из дневника курсиста». У раздзелах «В белорусских организациях» і «В учительских обществах Белоруссии» змяшчалася інфармацыя аб дзейнасці выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца», беларускіх культурна-асветных арганізацый.

У артыкуле «На каком языке учить в школах Белоруссии? (по поводу платформы Белорусского общества)», напісаным С. Ф. Русавай — украінскім грамадскім дзеячам, публіцыстам і педагогам — адным з заснавальнікаў і рэдактараў украінскага педагагічнага часопіса «Світло», выкрываецца разыходжанне поглядаў наконт недасканаласці і багацця беларускай мовы.

С. Ф. Русава крытыкуе платформу «Белорусского общества» — рэакцыйнай арганізацыі вялікадзяржаўна-шавіністычнага накірунку, — якая была апублікавана ў кадэцкай газеце «Речь» і перадрукавана «Белорусским учителем». Платформа адмаўляла беларускую мову як мову навучання ў школе з прычыны таго, што яна быццам бы недастаткова распрацаваная, бедная. С. Ф. Русава зусім рэзонна задавала пытанне, навошта гэта грамадства называе сябе «беларускім», калі без беларускай мовы не можа быць і беларускага народа. Аўтар заклікае беларускіх народных настаўнікаў падзяліцца сваімі назіраннямі над беларускай школай і сваімі думкамі наконт таго, ці патрэбна беларускаму народу школа з выкладаннем на яго «сялянскай» мове або ён павінен далучыцца да агульначалавечай культуры на «панскай» рускай ці польскай мове. Як падкрэслівае аўтар, толькі голас беларускіх народных настаўнікаў можа праўдзіва адказаць на гэта пытанне.

Артыкул украінскага педагога ў «Белорусском учителе» ўяўляе сабой адметны факт супрацоўніцтва прадстаўнікоў беларускай і ўкраінскай педагагічнай думкі, сведчыць аб адзінстве поглядаў перадавых прадстаўнікоў беларускага і ўкраінскага нацыянальнага адраджэння на ролю і значэнне роднай мовы ў працэсе навучання.

Асаблівую цікавасць з пункту погляду педагагічнай думкі выклікае змешчаны ў зборніку артыкул «О наказаниях и поощрениях...». Яе аўтарам быў беларускі культурны дзеяч, рэдактар газеты «Наша ніва» А. М. Уласаў. Пачынаючы артыкул эпіграфам Д. Лока «Рабская дысцыпліна стварае рабскі характар», ён дзеліцца сваімі по-

глядамі і назіраннямі адносна пакарання і заахвочвання ў беларускай пачатковай школе.

Зыходзячы са спецыфічнага становішча беларускага народа, А. М. Уласаў канстатуе, што адвечная прыгнечанасць беларуса зрабіла яго баязлівым, прыніжаным і хітрым, што адбілася перш-наперш «на зялёных усходах» Беларусі — яе дзецях. Галоўную задачу школы і настаўніка ён бачыць у тым, каб даць магчымасць падняць вышэй галаву дзіцяці, прымусіць вучня быць гордым, смелым, сумленным. І адным з галоўных сродкаў школы ў гэтых адносінах з'яўляецца «звядзенне да мінімуму і нават поўны адказ ад пакаранняў і заахвочванняў у школе».

На думку аўтара, шкода строгіх пакаранняў у тым, што яны прыгнятаюць асобу дзіцяці, расслабляюць яго волю і душэўныя сілы. Аўтар адзначае, што паводзіны вучня, яго адносіны да школы і ведаў залежаць ад настаўніка, які павінен карыстацца аўтарытэтам і павагай у вучняў. Прыводзяцца спосабы заваявання настаўнікам аўтарытэту ў дзяцей: неабходна быць справядлівым і шчырым з вучнямі, ласкава абыходзіцца з дзецьмі, паважаць у іх чалавека.

Калі настаўнік хоча, каб на яго ўроку не было рэзкіх парушэнняў дысцыпліны, а значыць, і неабходнасці пакаранняў, ён абавязаны жыва, цікава і захапляюча весці ўрок. Аўтар прапаноўвае скараціць працягласць урока да паўгадзіны, а ў час перапынкаў і ў пазаўрочны час вучням павінна быць дадзена як мага больш свабоды. Настаўнік павінен даць вучню магчымасць задаволіць сваю патрэбу ў руху, смеху і шуме і можа толькі ўмела накіроўваць характар іх гульняў.

А. М. Уласаў заклікае настаўнікаў з большай асцярожнасцю выкарыстоўваць паняцце «правіннасць» да таго ці іншага дзеяння вучня. Ён лічыць адным з лепшых сродкаў барацьбы з эксцэсамі ў школе «добрае слова ўгавору», якое робіць больш карысці ў сэнсе выпраўлення, чым усе рэпрэсіі разам узятыя. Артыкул А. М. Уласава прасякнуты любоўю да беларускіх дзяцей, глыбокім разуменнем іх псіхалогіі, умоў жыцця ў сям'і і школе, верай у іх добрыя намеры і пачынанні. Разам з тым у ім можна заўважыць уплыў распаўсюджанай у той час тэорыі «свабоднага выхавання».

Выхаду ў свет зборніка «Белорусский учитель» прысвяціў свой артыкул «О национальной школе в Беларуси» беларускі літаратуразнаўца і крытык С. Е. Палуян. Арты-

кул быў надрукаваны ў 1909 г. у часопісе «Українська хата». Адзначыўшы неабходнасць выдання беларускім настаўніцтвам уласнага органа друку і зробленыя ў сувязі з гэтым спробы, якія былі не вельмі ўдалымі, ён пісаў, што зборнік «Белорусский учитель» недасканалы, не адпавядае сваёй мэце. Галоўным яго недахопам з'яўляецца адсутнасць вядучай ідэі, ідэі беларускага адраджэння, якая аб'яднала б усе часткі зборніка ў адно цэлае. С. Е. Палуян адзначае, што беларускага ў зборніку няшмат, сам ён выдадзены на рускай мове.

Аналізуючы рэдакцыйны артыкул зборніка, крытык адзначае, што ў самой яго пабудове бачна карэннае неразуменне рэдакцыяй асобных пытанняў. Для яе школьная рэформа і народная асвета стаяць зусім у іншай плоскасці, чым нацыяналізацыя школы. А без нацыяналізацыі школы на Беларусі немагчыма рэфармаваць гэтую школу; тут не дапаможа ніякае ўдасканальванне школьных праграм.

Пры характарыстыцы зместу зборніка С. Палуян станоўча адзначае артыкул А. М. Уласава аб пакараннях і заахвочваннях у школе, напісаны «зыходзячы са спецыфічных асаблівасцей беларускага жыцця». Больш С. Палуян не бачыць нічога цікавага ў зборніку.

Увогуле крытык адзначае, што рэдакцыя зборніка не заручылася падтрымкай шырокіх колаў свядомага настаўніцтва і зрабіла выданне органам гуртка настаўнікаў Віцебскай губерні. С. Палуян бачыў задачу беларускага настаўніка ў стварэнні свайго нацыянальнага зборніка, які б выдаваўся не маленькім гуртком нікому не вядомых людзей, а нацыянальнай арганізацыяй. Толькі такі орган друку адпавядаў бы задачам і ўмовам народнай асветы на Беларусі. Рэцэнзія С. Палуяна на зборнік «Белорусский учитель» сведчыла пра высокія патрабаванні, якія прад'яўляліся інтэлігенцыяй Беларусі да педагагічных органаў друку. Праўда, час ад часу, на наш погляд, занадта рэзка ацэньвае крытык некаторыя матэрыялы зборніка, строга разглядаючы іх праз прызму нацыяналізацыі школы.

Зборнік «Белорусский учитель» напаткаў той жа лёс, што і «Голос учителя»: яго выданне было забаронена пасля выхаду першага нумару. Тады справу віцебскіх настаўнікаў па выданню настаўніцкага органа друку прадоўжылі іх магілёўскія калегі. У 1910—1911 гг. «Обществом взаимного вспомоществования учащим и учившим в народных училищах Могилевской губернии» выпускаўся «Белорусский учительский вестник». Часопіс ставіў задачу няўхіль-

на садзейнічаць «аб'яднанню настаўнікаў у школьнай справе і паляпшэнню іх становішча». Рэдакцыя часопіса лічыла, што ў асвятленні і абмеркаванні шматлікіх пытанняў школьнай і пазашкольнай адукацыі павінны прыняць удзел самі настаўнікі.

Як адзначалася ў першым нумары часопіса, ён меў сваёй мэтай даць магчымасць усім настаўнікам прыняць удзел у распрацоўцы пытанняў навучання і выхавання, заявіць аб сваіх набалелых патрэбах, падзяліцца з таварышамі па працы сваімі думкамі, назіраннямі, парадамі, папрасіць указанняў у цяжкіх выпадках школьнага жыцця, асвятліць умовы настаўніцкай працы і вызначыць меры да іх паляпшэння. Рэдакцыя паведаміла пра свой намер шырока знаёміць з дзейнасцю настаўніцкага таварыства Магілёўскай губерні, каб прыцягнуць у яго члены спачуваючых задачам таварыства.

Шэраг цікавых матэрыялаў быў змешчаны ў першым нумары «Белорусского учительского вестника». У артыкуле «Зависимость успеха школы от обучения и развития детей» адзначалася неабходнасць вывучэння настаўнікам індывідуальных асаблівасцей сваіх вучняў, прапагандаваць педагагічныя ідэі К. Д. Ушынскага. Аўтар напомніў запавет пра тое, што «злачынец і чалавеказабойца той, хто бярэцца за выхаванне і не ўмее выхоўваць»; ён звяртаў увагу на важнасць і неабходнасць вывучэння дзяцей як індывідаў па перыядах іх псіхалагічнага развіцця.

Праблема арганізацыі пазакласнага чытання знайшла сваё адлюстраванне ў артыкуле «К вопросу о внеклассном чтении». У ім падкрэслівалася, што адна з галоўных задач школы заключаецца ў тым, каб прывіць вучню любоў да кнігі, навучыць яго карыстацца кнігай як сродкам самаадукацыі і самавыхавання. Адзначалася, што ў школе адводзіцца мала месца пазакласнаму чытанню, чытанню не асобных урыўкаў, а цэлых твораў. Ананімны аўтар артыкула лічыць, што школа, як добра не было б пастаўлена ў ёй навучанне, без належнай пастаноўкі пазакласнага чытання выконвае толькі палову справы. У артыкуле звярталася ўвага на нездавальняючае ў большасці школ кіраўніцтва пазакласным чытаннем, дрэнны стан вучнёўскіх бібліятэк, фармуляваліся педагагічныя патрабаванні, якія прад'яўляліся да дзіцячай кнігі, змяшчаліся рэкамендацыі па арганізацыі дзіцячай бібліятэкі. Аўтар лічыць: дзеці павінны знаёміцца з кнігамі самай разнастайнай тэматыкі, што дапаможа ўзбудзіць у іх інтарэс да

розных пытанняў, розных галін ведаў. Задача настаўніка — разумна накіроўваць чытанне вучняў.

У артыкуле «Школа и наказания в ней», змешчаным у № 2—3 часопіса за 1910 г., крытыкавалася заганная практыка фізічных пакаранняў у школе. Аўтар адзначаў, што ў цяперашнім выглядзе школа з'яўляецца не выхаваўчай установай, а падабенствам шавецкіх майстэрняў, дзе пануе самавольства, здзек і ўтоптванне ў бруд асобы вучняў. Звяртаючыся да гісторыі педагогікі, ён гаворыць, што прыклад жыватворнага ўздзеяння любві на дзяцей уяўляе сабой Песталоцці.

Настаўнік Д. Стэфаненкаў у пісьме да «таварышаў-настаўнікаў» дзеліцца сваімі разважаннямі аб задачах часопіса. Ён лічыць, што часопіс не павінен даваць педагагічных артыкулаў і аглядаў навуковага і практычнага характару, таму што гэту задачу выконваюць сталічныя педагагічныя часопісы. На яго думку, «Белорусский учительский вестник» павінен быць органам абмену думкамі, дзе кожны можа пісаць па пытаннях жыцця школы.

Трэба адзначыць, што часопіс прытрымліваўся лініі, якая была рэкамендавана настаўнікам Д. Стэфаненкавым. Сапраўды, у ім было мала артыкулаў агульнапедагагічнага характару, што не ўзнімала часопіс вышэй правінцыяльнага ўзроўню, затое было многа хронікі, матэрыялаў пра дзейнасць мясцовых настаўніцкіх таварыстваў. Былі і цікавыя публікацыі пра вопыт Даніі па стварэнню і развіццю так званых «Вышэйшых школ для сялян», пра дзейнасць Магілёўскага земскага кіраўніцтва па развіццю народнай асветы.

У «Белорусском учительском вестнике» публікаваліся артыкулы пра арганізацыю вучнёўскіх экскурсій, праблемы школы павышанага тыпу, эстэтычнае выхаванне вучняў, інтэрв'ю з настаўнікамі народных вучылішчаў аб праграме і задачах часопіса, інфармацыя пра школьнае і настаўніцкае жыццё, успаміны настаўнікаў, кароткія бібліяграфічныя заметкі на педагагічныя тэмы.

Пасля закрыцця «Белорусского учительского вестника» місію педагагічнага органа друку прадоўжылі гродзенскія настаўнікі. Гродзенскае губернскае педагагічнае таварыства пачало выдаваць са снежня 1911 г. часопіс «Педагогическое дело», каб «служыць інтарэсам сям'і і школы». Часопіс выходзіў у дзвюх частках. Першая частка прызначалася настаўнікам і бацькам і складалася з трох раздзелаў: педагагічнага, бібліяграфічнага і хранікальна-школьнага. Тут змяшчаліся артыкулы па пытаннях педа-

гогікі, псіхалогіі, методыкі выкладання вучэбных прадметаў, рэцэнзіі на падручнікі, расказвалася пра вопыт працы настаўнікаў. Другая частка прызначалася вучням і выходзіла асобным выданнем. У ёй узнімаліся пытанні маральнага самавыхавання вучняў, публікаваліся першыя літаратурныя спробы школьнікаў, матэрыялы пра выдатных вучоных, беларускія народныя песні, якія былі запісаны вучнямі ў вёсках.

Мэты, звязаныя з самаадукацыяй і самаўсведамленнем, паставіў перад сабою «Беларускі гурток», створаны ў г. Гродна (1913 г.). Гурток складаўся выключна з дзяцей беларускіх сялян, якія выпусцілі рукапісны зборнік вучнёўкай літаратуры «Kołas našaj niwy». На ідэйным змесце зборніка адчуваўся ўплыў «Нашай нівы». Жывыя і цікавейшыя «творы вучнёўскай прадукцыі» расказвалі аб прыгнечаным становішчы беларусаў, заклікалі «рвацца з нядолі». Гурток і яго зборнік «Kołas» адыгралі вялікую ролю ў ідэйным выхаванні беларускай моладзі. Цераз год пасля выхаду зборніка на Гродзеншчыне ўжо дзейнічалі новыя гурткі моладзі такога тыпу.

Педагагічныя часопісы і зборнікі, якія выходзілі на Беларусі ў 1908—1914 гг., нягледзячы на кароткачасовы тэрмін іх выдання і вельмі невялікую колькасць нумароў, адыгралі значную ролю ў аб'яднанні настаўніцкіх сіл у складаных умовах паслярэвалюцыйнай рэакцыі, актывізавалі педагагічную думку беларускага настаўніцтва. Але ні адно з гэтых выданняў не стала сапраўды нацыянальнай трыбунай абмеркавання набалелых праблем школы і педагогікі, якія хвалявалі настаўніцтва і педагагічную грамадскасць Беларусі. Выданні, якія ўжо ўпаміналіся, выходзілі невялікімі тыражамі і фінансаваліся за кошт саміх педагагічных таварыстваў і мясцовых настаўніцкіх сіл. Хоць якой-небудзь падтрымкі афіцыйных вучэбных улад яны не атрымлівалі, а толькі трапілі пад строгі кантроль.

Афіцыйным органам друку кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі быў часопіс «Народное образование в Виленском учебном округе», які выдаваўся ў Вільні з 1901 г. у якасці дадатку да «Циркуляра по Виленскому учебному округу». Першапачаткова ён выходзіў 6 разоў на год, а з 1907 г. — 10—12 разоў. Выданне часопіса было спынена ў 1915 г. у сувязі з акупацыяй Вільні. Доўгі час рэдактарам часопіса і аўтарам шэрага артыкулаў, у тым ліку і па гісторыі педагогікі, быў беларускі гісторык, археолаг і педагог Д. І. Даўгяла. У звароце да настаўнікаў, змешчаным у пер-

шым нумары часопіса, да ўдзелу ў публікацыі матэрыялаў запрашаліся ўсе мясцовыя педагагічныя сілы і асабліва асобы, якія блізка стаялі да справы народнай адукацыі.

Часопіс «Народное образование в Виленском учебном округе» меў наступныя пастаянныя рубрыкі: урадавыя распараджэнні ў галіне народнай адукацыі; артыкулы па методыцы навучання; артыкулы і заметкі пра сучасны стан народнай адукацыі і яе патрэбы, агульныя і мясцовыя; школьныя ўрачыстасці, экскурсіі, выставы, юбілеі, некралогі; хроніка, якая ахоплівала інфармацыю як па Віленскай вучэбнай акрузе, так і па ўсёй Расіі; агляд педагагічных часопісаў; бібліяграфія, якая падзялялася па тэматыцы і ў якой змяшчаліся рэцэнзіі на выдадзеныя кнігі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі. Часопіс меў афіцыйны характар і праводзіў лінію Міністэрства народнай асветы і кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі ў Паўночна-Заходнім краі. Ён прызначаўся галоўным чынам народным і іншым пачатковым вучылішчам акругі. Падпіска на яго была для настаўнікаў абавязковай.

Гэты часопіс стаў аўтарытэтным педагагічным органам на тэрыторыі Беларусі і Літвы. На яго старонках друкаваліся такія вядомыя педагогі-даследчыкі і арганізатары народнай асветы, як К. В. Ельніцкі, Ф. А. Кудрынскі, С. А. Лосеў, К. І. Ціхаміраў, Д. А. Сцяпура, А. І. Шэстаў, настаўнікі-наватары А. Багдановіч, А. Лукашэвіч, С. Аршанцаў, Д. Руткевіч, В. Тычынін і інш., рускія педагогі і крытыкі.

У першых нумарах часопіса ўвагу чытачоў звярнуў на сябе артыкул К. І. Ціхамірава «Обучение грамоте (дидактические заметки)», у якім аўтар прапагандаваў аналітыка-сінтэтычны гукавы метад навучання дзяцей грамаце. Укараненне гэтага новага, прагрэсіўнага метаду заставалася актуальнай задачай у пачатку XX ст., паколькі ў многіх школах, асабліва царкоўнапрыходскіх, яшчэ прымяняўся літараскладальны метад, які К. І. Ціхаміраў справядліва назваў архаічным. Аўтар адзначае ўзроставыя асаблівасці малодшых школьнікаў і заклікае настаўнікаў суадносіць свае метады з гэтымі асаблівасцямі пры навучанні грамаце, дае шэраг абгрунтаваных парад па навучанню тэхніцы чытання і пісьму. У артыкуле педагог-даследчык адстойваў і папулярызаваў важныя дыдактычныя правілы: усякае навучанне пачынаць з вывучэння ўжо вядомых фактаў; пераходзіць да невядомага толькі пасля добрага засваення вучнямі папярэдняга матэрыялу; на-

стаўніку неабходна выхоўваць у сябе пачуццё меры пры падачы матэрыялу.

Д. А. Сцяпура ў артыкуле «Экспериментальная теория обучения правописанию в начальной школе» (1907) крытыкаваў так званую «педагогіку дзеяння» нямецкага педагога В. А. Лая. Адстойваючы гукавы метад К. Д. Ушынскага, Д. А. Сцяпура пераканаўча даказваў, што галоўным недахопам метаду, які рэкамендаваў Лай для навучання правапісу, з'яўляецца механічнасць, адсутнасць свядомага мыслення.

Навучанню грамаце па гукавому метаду прысвечаны і артыкул настаўніка І. Сінякова, надрукаваны ў 1910 г. Аўтар адзначае несумненную перавагу гукавога спосабу і канстатуе, што яго выкарыстанне на практыцы далёка не заўсёды вядзе да поспеху, таму што вучні недастаткова знаёмыя з прыродай гукаў. Падкрэсліваецца, што для правільнай пастаноўкі навучання грамаце неабходна ведаць асновы фанетыкі.

Г. Руткевіч у некалькіх нумарах часопіса за 1913 г. апісвае класіфікаваныя ім метады навучання пераказу думак у пачатковай школе, выдзяляючы сярод іх практыкаванні, розныя віды вусных і пісьмовых сачыненняў, пераказы і пераклады артыкулаў (рэферыраванне), апавяданні, апісанні і інш. (усяго 13 метадаў). У якасці дадатку аўтар дае 40 тэм для самастойных работ у пачатковай школе. Методыцы правядзення ўрокаў па расійскай мове прысвяціў свой артыкул вядомы педагог-даследчык К. В. Ельніцкі.

Пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. часопіс звярнуў увагу на праблему навучання расійскай мове так званага «іншародніцкага» насельніцтва, трактуючы яе з пазіцыі русіфікатарскай палітыкі царскага ўрада. У артыкуле В. Пляшкевіча адзначалася, што пры навучанні расійскай мове ў іншародніцкіх школах для больш хуткага дасягнення пастаўленай мэты «неабходна адказацца зусім ад роднай мовы вучняў і не ўжываць яе без крайняй неабходнасці, нязменна і няўхільна прытрымлівацца натуральнага метаду навучання». Аўтар толькі ў выглядзе выключэння дазваляў настаўніку звяртацца да роднай мовы вучняў, калі іх родная мова з'яўлялася для настаўніка адзіным сродкам быць зразумелым. У артыкуле П. Казлоўскага апісвалася методыка навучання дзяцей літоўскай і беларускай нацыянальнасці расійскай гутарковай мове пры дапамозе вуснага слова.

Аднак пасля першай расійскай рэвалюцыі царызм ужо

не мог будаваць сваю палітыку на Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах імперыі, на грубых русіфікатарскіх падыходах. Беларускае нацыянальнае адраджэнне прабівала сабе дарогу, і гэта знаходзіла адлюстраванне на старонках афіцыйнага органа Віленскай вучэбнай акругі. У 1913 годзе часопіс апублікаваў артыкул М. Мачульскай «Пропаганда белорусского языка», у якім звяртаецца ўвага на ігнараванне ў школьных праграмах выкладання гісторыі роднага краю, адзначаецца неабходнасць увядзення ў школах папулярнага падручніка і гістарычнай хрэстаматыі. У артыкуле зроблены вывад пра тое, што трэба бліжэй стаяць да жывой асветы беларускага народа.

Значны ўплыў на ўзбагачэнне зместу часопіса, набліжэнне яго да патрабаванняў жыцця і школы аказала рэвалюцыя 1905—1907 гг. На старонках часопіса друкаваліся артыкулы аб неабходнасці рэформы сістэмы народнай адукацыі, удасканалення метадаў навучання і выхавання, увядзення ў народнай школе працоўнага навучання, сувязі школы з жыццём, супрацоўніцтва сям'і, школы і грамадскасці. Стала друкавацца больш матэрыялаў аб ужыванні настаўнікамі-наватарамі перадавых прыёмаў і метадаў у педагагічным працэсе. У публікацыях прапагандаваліся ідэі і дасягненні перадавых рускіх і замежных педагогаў: Я. А. Каменскага, І. Г. Песталоцці, Д. Лока, А. Дыстэрвега, М. В. Ламаносава, К. Д. Ушынскага, М. І. Пірагова, Л. М. Талстога і інш.

У 1911 г. часопіс змясціў артыкул «Рэформа народнай школы», падпісаны «В. Ш.», у якім аўтарам быў прапанаваны свой план перабудовы вясковай школы. На яго думку, яна павінна быць пераўтворана ў школу, якая разам з навучаннем чытанню, пісьму, лічэнню, гісторыі і геаграфіі «галоўным чынам вучыла б сялянскіх дзяцей разумець навакольнае жыццё».

Прапанаваная аўтарам праграма пераўтварэння вясковай школы ўключала 9 пунктаў. Школьнікаў павінны былі навучаць правільнай апрацоўцы зямлі, травасеянню, унясенню ўгнаенняў, пчалярству, жывёлагадоўлі, барацьбе са шкоднікамі пасеваў, развядзенню дрэў, будаўніцтву і іншым сельскагаспадарчым звычкам. Аўтар не пісаў таксама аб неабходнасці авалодвання ведамі аб грамадскім уладкаванні вёскі, правах і абавязках членаў вясковай грамады. Меркавалася мець пры школе надзел зямлі, на якім вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вялі б розныя сельскагаспадарчыя работы. Настаўнік у такіх блізкіх да сялян абставінах будзе цэнтрам вёскі, а дзеці і іх

бацькі палюбяць школу. Дзеці такой школы ператворацца ў сялян са светлымі галовамі, што ў выніку будзе садзейнічаць паляпшэнню дабрабыту вёскі. Праграма прафесіяналізацыі вясковай школы не была арыгінальнай, яна пераклікалася з распаўсюджанымі на рубяжы XIX—XX стст. поглядамі аб неабходнасці ўзмацнення працоўнага навучання ў школе, набліжэнні школы да жыцця, да практыкі. Уяўленні аўтара аб вузкай прафесійнай накіраванасці вясковай школы, нягледзячы на ўсю іх прывабнасць, не адпавядалі прагрэсіўным ідэям педагагічнай навукі аб адзінай агульнаадукацыйнай школе.

Часопіс прапагандаваў новыя метады ў выкладанні асобных вучэбных прадметаў. Пры навучанні чытанню і літаратуры апісваўся прагрэсіўны настаўніцкі вопыт у пастаноўцы пазакласнага чытання, методыка вядзення гісторыка-літаратурнай работы ў школе, фармуляваліся патрабаванні, прад'яўляемыя да дзіцячай кнігі. С. Аршанец у часопісе за 1913 г. выкладае розныя метады вывучэння мастацкіх твораў на ўроках літаратуры. Ён падкрэслівае, што гісторыку літаратуры даводзіцца быць і біёграфам, і псіхолагам, і гісторыкам, і сацыёлагам, і эстэтыкам, але больш за ўсё філосафам, які ўмее і падзяліць мастацкі твор на асобныя часткі, і ўявіць яго як арганічнае цэлае, звязаць яго з жыццём, светапоглядам аўтара і сваім асабістым светаўспрыманнем.

У 1910—1911 гг. на старонках часопіса разгарнулася абмеркаванне праблем методыкі выкладання арыфметыкі і геаметрыі ў школе. Ф. А. Лукашэвіч указваў, што асноўнай мэтай рашэння арыфметычных задач у пачатковай школе павінна быць прывучэнне вучняў да лагічнага мыслення. Тэму, узнятую Ф. А. Лукашэвічам, прадоўжыў настаўнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі А. С. Багдановіч, які на аснове свайго шматгадовага настаўніцкага вопыту прыйшоў да высновы, што ў спосабах і прыёмах рашэння задач няма ніякіх развіваючых пачаткаў. З рашэння задач выкідваецца самае галоўнае — аналіз, які павінен служыць штуршком да развіцця дапытлівага розуму вучня пачатковай школы. Аўтар піша, што з 56 настаўнікаў, якія былі летам 1910 г. на курсах у Маладзечне, 3/4 не валодалі зусім аналізам задачы і не чулі аб такім метадзе. А. С. Багдановіч згодны з меркаваннем Ф. А. Лукашэвіча ў тым, што ўвага вучняў павінна быць накіравана на рашэнне задач шляхам аналізу і сінтэзу.

У артыкулах А. С. Багдановіча і А. Таўкача, апублі-

каваных у 1911 г., ішла размова аб метадах выкладання геаметрыі ў двух- і чатырохкласных вучылішчах. Аўтары, параўноўваючы славесны і наглядны метады навучання геаметрыі, даказваюць практычную і тэарэтычную перавагу нагляднага метаду. Разважанне А. Багдановіча аб навуковым метадзе геаметрыі прывяло яго да важнай тэарэтыка-пазнавальнай і педагагічнай высновы: «Справа навучання становіцца плённай для навучэнцаў тады, калі набыванне ведаў разумовым шляхам асноўваецца на пачуццёвым успрыманні ўяўленняў, ідзе поплеч з апошнім».

У пачатку 90-х гадоў на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі, узрасла цікавасць да праблем псіхалогіі. Настаўнікі і псіхолагі А. Ф. Кудрынскі, К. В. Ельніцкі, М. Белацэрковец, К. І. Ціхамiраў актыўна выступалі ў перыядычным друку з артыкуламі па пытаннях дзіцячай псіхалогіі. У часопісе «Народное образование в Виленском учебном округе» змяшчаліся артыкулы аб развіцці цікавасці да вучобы, выхаванні валявых якасцей асобы, пераадольванні страху. К. І. Ціхаміраў у 1905 г. у артыкуле аб галоўных выніках вывучэння памяці асвяціў фізіялагічныя і псіхалагічныя працэсы памяці, адзначыўшы, што нагляднае навучанне выхоўвае ўвагу, дапамагае добраму запамінанню вучэбнага матэрыялу. У 1912 г., ужо будучы дырэктарам Віцебскага настаўніцкага інстытута, К. І. Ціхаміраў выступіў з вельмі змястоўным артыкулам, у якім звяртае ўвагу настаўнікаў і педагагічнай грамадскасці на неабходнасць глыбокага вывучэння школьнай псіхалогіі, выкарыстання ў педагагічнай практыцы даных эксперыментальнай псіхалогіі і педагогікі. У часопісе «Народное образование в Виленском учебном округе» змешчаны рад важных педагагічных прац вядомага беларускага педагога, гісторыка, філолага і публіцыста Ф. А. Кудрынскага (Багдана Сцепанца). Ён актыўна друкаваўся ў афіцыяльным органе Віленскай вучэбнай акругі, нягледзячы на падазронасць яго з боку наглядчыка акругі ў «неблаганадзейнасці». У адной са сваіх асноўных педагагічных прац «Аб выхаванні і навучанні», змешчанай у некалькіх нумарах часопіса за 1911 г. і выдадзенай кнігай, Ф. А. Кудрынскі адстойвае выхавацельскі характар навучання, неабходнасць уліку асабістых якасцей навучэнцаў, раскрывае псіхалагічныя асновы навучання. У яго артыкулах важнае месца ўдзяляецца ролі настаўніка, яго падрыхтоўцы і творчай працы, фармулююцца патрабаванні, якім павінен адпавядаць народны настаўнік. Важнай задачай народнай школы педагог лічыў развіццё ў дзяцей цікава-

васці да чытання, у якім бачыў дзейсны сродак маральнага ўдасканалення асобы.

У артыкуле «Педагагічныя размовы» Ф. А. Кудрынскі першым з педагогаў Беларусі ўздымае праблему псіхалагічных зносін паміж настаўнікам і вучнем у вучэбна-выхаваўчым працэсе. У ім падкрэсліваецца пэўная роля педагога ў гэтым працэсе, яго ўменне валодаць сабой, захоўваць педагагічны такт, праяўляць педагагічнае чуццё. Закранаючы такую вострую праблему школьнай справы, як ацэнка ведаў па балах, аўтар піша аб навучальнай і выхаваўчай яе ролі, адзначыўшы, што ў шэрагу выпадкаў матэматычная ацэнка павінна ўступаць месца псіхалагічнай. Неабходнасці ўліку ў школьнай справе псіхалагічных тыпаў мыслення прысвечаны артыкул Ф. А. Кудрынскага «Тыпы мыслення». Некаторыя дыдактычныя і псіхалагічныя прыёмы арганізацыі практычных урокаў у настаўніцкіх семінарах раскрыты ў яго артыкуле аб методыцы правядзення гэтых урокаў. У гісторыка-педагагічнай літаратуры Беларусі, у якой творчай спадчыне Ф. А. Кудрынскага адведзена важнае месца, абойдзены ўвагай яго артыкул «О национальном воспитании», апублікаваны ў часопісе «Народное образование в Виленском учебном округе» ў 1909 г. У ім аўтар развівае свае думкі аб народным выхаванні, патрыятызме, у аснове якога ляжыць усведамленне цеснай сувязі з народам і яго мовай. Адзначаецца, што «выхаванне павінна быць нацыянальным», што народ «павінен фарміраваць духоўныя сілы маладога пакалення абавязкова на глебе нацыянальнай». Аўтар высока ставіць выхаваўчае значэнне роднай «айчыннай» мовы: «Айчынная мова — сэрца народа, якое ахоўвае і прыводзіць у рух увесь яго арганізм». Ф. А. Кудрынскі лічыць развіццё нацыянальнага пачуцця магутным сродкам маральнага выхавання, засцерагаючы адначасова ад фарміравання «эгаіста на нацыянальнай падкладцы». Істотным недахопам школы з'яўляецца беднасць сродкаў нацыянальнага выхавання, у выніку чаго са школы выходзіць шмат людзей «без пэўных нацыянальных прызначэнняў». Аўтар заклікае настаўнікаў развіваць у сваіх вучняў нацыянальнае пачуццё, выкарыстоўваючы для гэтага перш за ўсё ўласны прыклад, настрой і ўвесь свой жыццёвы вопыт. У часопісе паявілася колькасць публікацый па праблемах выхавання. Пачалі з'яўляцца артыкулы і па такой новай праблеме, як эстэтычнае выхаванне ў школе. Гэтай тэме прысвяціў у 1910 годзе свой артыкул крытык, пісьменнік і педагог М. А. Бентштэйн, які выступіў пад псеўда-

7. Зак. 927.

німам «Мік. Кубанскі». Аўтар адзначае, што эстэтычнае выхаванне ў пачатковай школе застаецца «цёмным і спрэчным» пытаннем, якое яшчэ не набыло сацыяльнага гучання і не ўвайшло ў лік абавязковых задач школы. Вызначаюцца задачы эстэтычнага выхавання. Аўтар прапануе цесна звязаць вывучэнне натуральных навук з эстэтычным выхаваннем. Мік. Кубанскі апісвае сродкі эстэтычнага выхавання, якія знаходзяцца ў руках настаўніка: знаёмыя абставіны класа і школы, экскурсіі, чытанне вершаў, спевы, маляванне, захаванне вучнямі норм гігіены і іх чысты знешні выгляд. Каштоўныя педагагічныя парады даваў артыкул В. М. Тычыніна «Аб выхаванні», апублікаваны ў часопісе восенню 1914 г. Адказваючы на пытанне «Хто каго выхоўвае?», ён падкрэслівае, што ў выхаванні ўзаемна выхоўваюцца вучань і выхавацель.

В. М. Тычынін разглядае ўзаемадзеянне сям'і, школы і грамадства ў працэсе выхавання і адзначае важную ролю сям'і ў станаўленні чалавечай асобы. Патрыятызм сям'і заключаецца ў жыцці і працы на карысць роднага народа і краіны. В. М. Тычынін, узняўшы ў сваім артыкуле шырокія праблемы выхавання, праявіў глыбокае разуменне гэтага складанага, дыялектычнага працэсу, паказаў узаемасувязь і ўзаемадзеянне сям'і, школы і грамадства ў працэсе станаўлення чалавечай асобы. Аўтар выказаў надзвычай важныя і актуальныя сёння думкі аб маральным выхаванні дзяцей, вялікай ролі сямейнага выхавання, значэнні спадчынных фактараў у выхаванні, патрыятызме сям'і, складаных задачах школы ў выхаванні дзяцей, адказнасці настаўніка, яго педагагічным прызванні і таленце. Як нам уяўляецца, у асобе аўтара артыкула «Аб выхаванні» мы бачым таленавітага педагога-мысліцеля і вопытнага настаўніка-практыка, які пакуль не атрымаў прызнання ў гісторыка-педагагічнай літаратуры Беларусі. Праведзены агляд педагагічнай журналістыкі Беларусі адзначанага перыяду дазваляе зрабіць вывад аб тым, што яна была адным з галоўных фактараў развіцця метадычнай думкі і педагагічнай навукі Беларусі. Дзякуючы выданню педагагічных зборнікаў і часопісаў настаўнікі, педагагічная грамадскасць, бацькі, інтэлігенцыя змаглі пазнаёміцца з рознымі праблемамі навучання, адукацыі і выхавання ў пачатковых і сярэдніх школах Беларусі, Літвы, як і ў цэлым у Расіі, і асобных замежных краін. Яны таксама маглі мець уяўленне аб шырокай палітры поглядаў і распрацовак педагогаў-наватараў і народных настаўнікаў-практыкаў па пытаннях школа-

знаўства, педагогікі, псіхалогіі, эстэтыкі, методыкі выкладання асобных вучэбных дысцыплін, гісторыі, педагогікі, навейшых айчынных і замежных тэорый педагагічнага працэсу. Кіруючым, самым аўтарытэтным педагагічным выданнем на тэрыторыі Беларусі быў часопіс «Народное образование в Виленском учебном округе». Гэты часопіс меў самыя спрыяльныя, калі параўноўваць яго з іншымі педагагічнымі друкаванымі органамі, магчымасці для ператварэння ў аўтарытэтную трыбуну беларускага настаўніцтва: афіцыйны характар і фінансавая падтрымка з боку ўрада і мясцовага вучэбнага кіраўніцтва; самы працяглы выдавецкі «стаж» — з 1901 па 1915 г.; рэгулярнасць выхаду нумароў і іх нармальны аб'ём. Але важным дасягненнем гэтага часопіса быў аўтарскі калектыў. У ім друкаваліся самыя вядомыя тады на Беларусі педагогі: Ф. А. Кудрынскі, К. І. Ціхамiраў, Д. А. Сцяпура, К. В. Ельніцкі. Намаганнямі многіх настаўнікаў-наватараў у часопісе распрацоўвалася методыка выкладання вучэбных прадметаў.

За 14 год свайго існавання часопіс прайшоў пэўную эвалюцыю, важнейшай вяхой у якой з'явілася рэвалюцыя 1905—1907 гг. Пасля рэвалюцыйных хваляванняў узбагацілася тэматыка і змест часопіса, з'явіліся матэрыялы, праўда, вельмі стрыманыя, аб рэформе школы. У цэлым часопіс заставаўся верным правадыром русіфікатарскай палітыкі самадзяржаўя ў галіне асветы беларускага народа. На яго старонках вядомыя педагогі, выказваючы радыкальныя і цікавыя погляды па пытаннях педагогікі і дыдактыкі, абыходзілі такую жыццёва важную для беларусаў праблему, як пытанне аб беларускай нацыянальнай школе, аб выкладанні на роднай мове. У гэтым быў карэнны недахоп часопіса. Але зразумела, што іншым гэты афіцыёз быць не мог.

Перыядычныя выданні і зборнікі педагагічных таварыстваў Віцебска, Гродна і Магілёва, якія выходзілі ў 1908—1914 гг. («Голос учителя», «Белорусский учитель») па розных прычынах, аб якіх ужо гаварылася, таксама не змаглі стаць нацыянальнай трыбунай беларускай настаўніцкай інтэлігенцыі. Задачы, якія ставілі перад сабой рэдакцыі гэтых выданняў, сведчылі аб разуменні імі праблем, якія хвалююць народнае настаўніцтва. «Белорусский учитель» нават імкнуўся звязаць беларускае нацыянальнае адраджэнне з асветай і школай, з роднай мовай вучняў, разам з «Голосом учителя» крытыкаваў стан школьнай справы на Беларусі, школьную палітыку царызму.

Даследаванне педагагічнай журналістыкі пачатку XX ст. на Беларусі паказвае, што сярод мясцовага настаўніцтва і дзеячаў народнай асветы сфарміраваліся два напрамкі педагагічнай думкі: афіцыйны, які стаяў на пазіцыях «заходнерусизма» і быў прадстаўлены галоўным чынам часопісамі «Народное образование в Виленском учебном округе», «Белорусский учительский вестник», «Педагогическое дело» і нацыянальны («Наша доля», «Наша ніва» і інш.). Прадстаўнікі афіцыяльнага напрамку плённа распрацоўвалі агульнапедагагічныя і метадычныя пытанні навучання і выхавання. Нацыянальны напрамак, прадстаўлены лідэрамі беларускага нацыянальнага адраджэння, школьнае пытанне звязваў з нацыяналізацыяй школы. Абодва напрамкі развіваліся паралельна. Але супрацоўніцтва, узаемадзеянне, сувязь паміж імі адсутнічалі.

## На карысць навукі і школе

Асвета і народная адукацыя на Беларусі, развіццё прагрэсіўнай педагагічнай думкі ажыццяўляліся дзякуючы самаадданай працы і творчым пошукам многіх народных настаўнікаў, настаўнікаў сярэдніх вучэбных устаноў, педагогаў-наватараў. Педагагічная думка прабівала сабе шлях у сценах пачатковых школ, гімназій і рэальных вучылішчаў, настаўніцкіх семінарый, настаўніцкіх інстытутаў, на педагагічных курсах, нарадах, канферэнцыях, з'ездах настаўнікаў і дзеячаў народнай асветы. Настаўніцкі корпус беларускіх губерняў быў разнастайны па свайму сацыяльнаму і прафесійнаму саставу, прытрымліваўся рознай сацыяльна-палітычнай арыентацыі. Настаўнікі пачатковых народных школ па свайму сацыяльнаму і матэрыяльнаму становішчу адрозніваліся ад выкладчыкаў сярэдніх школ, што абумоўлівала іх розныя адносіны і ступень удзелу ў рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гг. Настаўніцкая інтэлігенцыя адносілася да розных саслоўяў, канфесійных і нацыянальных груп насельніцтва. Але ў цэлым настаўніцкія кадры аб'ядноўвала жаданне плённа працаваць на ніве народнай асветы, удасканальваць методыку навучання і выхавання, вырошчваць маральна здаровае пакаленне.

Значны ўклад у збліжэнне школы з жыццём, з неабходнасцямі грамадскага развіцця ўнеслі такія вядомыя педагогі, як Ф. А. Кудрынскі, К. І. Ціхаміраў, Д. А. Сцяпура, К. Е. Ельніцкі, А. Я. Багдановіч і інш. Яны былі прызнаны ў настаўніцкім асяроддзі, іх публікацыі вызы-

валі шырокі рэзананс, іх педагагічная спадчына заняла важнае месца ў беларускай гісторыка-педагагічнай літаратуры, што тым не менш не вызваляе сучасных даследчыкаў ад больш глыбокага вывучэння педагагічнай дзейнасці і поглядаў гэтых вядомых дзеячаў народнай адукацыі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст.

У ходзе вывучэння архіўных матэрыялаў і літаратуры аўтар сутыкнулася з радам іншых цікавых педагогаў і дзеячаў народнай асветы, імёны якіх яшчэ мала вядомы нават вузкаму колу спецыялістаў па гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі.

Вывучэнне педагагічнай дзейнасці і поглядаў гэтых людзей, якіх шанавалі і паважалі іх сучаснікі і калегі, але імёны якіх потым як бы сцерліся, зніклі з гістарычнай памяці, з'яўляецца важнай і высакароднай справай для гісторыкаў нацыянальнай педагогікі. Тым больш, што размова ідзе аб яркіх, неаднародных фігурах, якія ўнеслі свой уклад у вывучэнне педагагічнага мінулага беларускага народа, распрацоўку асобных пытанняў тэорыі і практыкі школьнага навучання і выхавання. У шэрагу гэтых новых, вяртаемых сучаснай гісторыка-педагагічнай навуцы, імён варта назваць у ліку першых выдатнага педагога, гісторыка, краяведа, этнографа **Яўстафія Філарэтавіча Арлоўскага** (1862—1913 гг.). Выхадзец з сям'і свяшчэнніка, Я. Ф. Арлоўскі пасля заканчэння гісторыка-філалагічнага факультэта Санкт-Пецярбургскага універсітэта ў званні кандыдата быў назначаны ў Гродзенскую мужчынскую гімназію настаўнікам грэчаскай мовы і гісторыі. Аднак настаўніцкай дзейнасцю яго прафесійныя і творчыя інтарэсы далёка не вычэрпваліся. Я. Ф. Арлоўскі глыбока займаўся вывучэннем гісторыі і культуры Гродзеншчыны, з'яўляўся членам праўлення Гродзенскай публічнай бібліятэкі, Гродзенскага педагагічнага таварыства (з 1907 па 1913 г.), Гродзенскага археалагічнага камітэта і статыстычнага камітэта, друкаваў свае артыкулы ў «Гродненских губернских ведомостях».

Я. Ф. Арлоўскі напісаў рад кніг, прысвечаных гісторыі народнай адукацыі і гістарычнаму мінуламу Гродна. Да 100-годдзя ўтварэння Віленскай вучэбнай акругі, якое адзначалася ў 1903 г., яму было даручана напісаць «Гістарычны нарыс Гродзенскай гімназіі», які быў своечасова падрыхтаваны і выдадзены ў Гродне ў 1901 г., атрымаўшы высокую адзнаку ў Міністэрстве народнай асветы і Упраўленні Віленскай вучэбнай акругі. Гэта кні-

га з'яўляецца адной з першых фундаментальных прац па гісторыі народнай адукацыі і педагогікі асобна ўзятага рэгіёна Беларусі. Аўтар з дэмакратычных пазіцый прасачыў гісторыю Гродзенскай мужчынскай гімназіі, арганізацыю вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы сярод вучняў, апісаў цікавы вопыт правядзення пазакласных і пазашкольных мерапрыемстваў. Я. Ф. Арлоўскі даў ацэнку педагагічным поглядам і дзейнасці настаўнікаў і дырэктараў, працаваўшых у гімназіі ў XIX — пачатку XX ст., паказаў ролю педагагічных саветаў у арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. У кнізе адзначалася, што з 1897 вучэбнага года ўвага педагагічнага савета была накіравана на паляпшэнне дамашняй падрыхтоўкі вучняў гімназіі «з мэтай папярэдзіць перагружванне і ператамленне іх працай». Так, вучні падрыхтоўчых 1-га і 2-га класаў не павінны былі мець больш за тры, а вучні ўсіх астатніх — больш як чатыры падрыхтовак па прадметах. А астатнія так званыя «педагагічныя ўрокі» павінны былі «прысвячацца пісьмовым працам, класнаму паўтарэнню».

Значнае месца ў сваёй працы Я. Ф. Арлоўскі ўдзяліў дзейнасці А. Ф. Пігулеўскага (дырэктара гімназіі з 1896 г.), які неаднойчы выступаў ініцыятарам педагагічных пачынанняў. Па яго прыкладу з мэтай павышэння эфектыўнасці пазнавальнай дзейнасці вучняў настаўнікі ўсіх прадметаў першую палову ўрока прысвячалі разбору новага ўрока (пакуль увага вучняў параўнальна менш стомлена) і толькі другую палову — апытанню.

Жывой і даступнай мовай аўтар раскрывае методыку правядзення такіх мерапрыемстваў, як «Літаратурна-вакальная раніца», прысвечанаму 100-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна, а таксама «Школьнае свята дрэвапасадкі» і інш. Падобныя святы, стаўшыя традыцыйнымі, рыхтаваліся загадзя не толькі кіраўніцтвам гімназіі, настаўнікамі і вучнямі, але і бацькамі, роднымі вучняў. За некалькі дзён да пачатку свята дрэвапасадкі раздаваліся брашуры аб дрэвапасадцы, старэйшым вучням чыталіся лекцыі на гэтую ж тэму. У 1900 г. у свяце прынялі ўдзел 1550 дзяцей навучальных устаноў Гродна. Цікавым момантам у працы педагагічнага савета гімназіі, на які звяртае ўвагу Я. Ф. Арлоўскі, з'яўляецца арганізацыя і правядзенне літаратурных чытанняў для вучняў сярэдніх і старэйшых класаў. Гэтыя чытанні, на думку аўтара, павінны былі папаўняць веды, засвоеныя ў гімназіі, азнаёміць юнацтва з рознымі бакамі народнага жыц-

ця. Чытанні рыхтаваліся і праводзіліся пры ўдзеле саміх вучняў, суправаджаліся дэманстрацыяй светлавых карцін (пры дапамозе чароўнага ліхтара) і тлумачэннямі настаўнікаў адпаведных прадметаў.

Кніга Я. Ф. Арлоўскага «Исторический очерк Гродненской гимназии» ўяўляе сабой свайго роду педагагічную энцыклапедыю па гісторыі арганізацыі педагагічнага працэсу ў Гродзенскай гімназіі. Гэта адна з першых кніг па гісторыі народнай адукацыі на Беларусі, яна служыць каштоўным навуковым даследаваннем і вучэбна-метадычным дапаможнікам.

Сваёй педагагічнай дзейнасцю, педагагічнымі поглядамі, нястомнай працай Я. Ф. Арлоўскі здабыў вялікі давер і аўтарытэт сярод настаўнікаў гімназіі. Ён з'яўляўся заслужаным настаўнікам гісторыі і геаграфіі, стацкім саветнікам, што ў табелі аб рангах адпавядала ваеннаму чыну — генерал-маёр. У 1910 г. у азнаменаванне 25-годдзя бездакорнай педагагічнай дзейнасці Я. Ф. Арлоўскаму была прапанавана пасада старэйшага настаўніка і пенсія ў памеры 600 рублёў у год, акрамя забеспячэння па службе. Аб вялікай павазе гімназістаў да свайго настаўніка сведчаць архіўныя матэрыялы, у якіх знаходзіцца перапіска былых вучняў.

У студзені 1908 г. ён хадайнічаў перад папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі аб прадастаўленні яму пасады дырэктара адной з вучэбных семінарый акругі. Аднак яго просьба была адкладзена «за адсутнасцю вакансій». Як нам уяўляецца, гэта адмова была звязана перш за ўсё з тым, што Я. Ф. Арлоўскі не адрозніваўся нізкапаклонствам і часта выступаў супраць агульнапрынятых русіфікатарскіх поглядаў аб тым, што Беларусь з'яўляецца «спрадвечна рускім краем». З вялікай увагай ён адносіўся да беларускага народа і імкнуўся аб'ектыўна даследаваць яго гісторыю. У сваіх працах Я. Ф. Арлоўскі паказаў вялікую ролю беларусаў у развіцці культуры і гісторыі Вялікага княства Літоўскага. Выступаючы на IX Археалагічным з'ездзе ў г. Вільні ў 1891 г. з рэфератам «Заснаванне г. Гродна і яго гісторыя да 1241 г.», Я. Ф. Арлоўскі пераканаўча адхіліў думку гісторыка М. М. Карамзіна аб прычыне ўзнікнення г. Гродна і даказаў, што датай яго заснавання з'яўляецца 1128 г., якая і стала агульнапрынятай. Гэта гістарычнае адкрыццё было высока ацэнена вядомым савецкім вучоным М. М. Вароніным.

Я. Ф. Арлоўскі не скрываў сваіх патрыятычных настрояў і рабіў практычныя крокі да вывучэння Беларусі,

што даказвае яго ўдзел у з'ездзе настаўнікаў матэматыкі, фізікі, прыродазнаўства і геаграфіі сярэдніх устаноў Віленскай вучэбнай акругі, які праходзіў у Вільні з 21 лютага па 2 сакавіка 1908 г. Пры абмеркаванні пытання аб геаграфічных кабінетах ён выказаў думку, што неабходна набыць для іх «кнігі па геаграфіі Паўночна-Заходняга краю, напрыклад, матэрыялы, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба, памятныя кнігі паветаў. Гэта дае настаўніку магчымасць больш падрабязна пазнаёміцца з геаграфіяй мясцовага краю і даваць навуковыя адказы на ўсялякія пытанні». З'яўляючыся прыхільнікам «выхавання ў вучняў патрыятычнага і нацыянальнага пачуцця», ён выступаў з крытыкай існуючых падручнікаў па курсу геаграфіі з-за іх вялікага аб'ёму і агульнага, неканкрэтнага характару, што ўскладняла працу настаўнікаў і вучняў.

Я. Ф. Арлоўскі надаваў вялікую ўвагу экскурсіям, разглядаючы іх не толькі як важнейшы сродак нагляднага навучання, але і як крыніцу набыцця ведаў. Падарожнічаючы па Гродзенскаму павету разам са сваімі вучнямі, узбагачаў іх веды новымі краязнаўчымі матэрыяламі, а галоўнае — мог праверыць свае меркаванні на практыцы. Невыпадкова на з'ездзе настаўнікаў матэматыкі, фізікі, прыродазнаўства і геаграфіі пры абмеркаванні пытання аб экскурсіях ён выказаўся за тое, каб беднейшым вучням у першую чаргу была дадзена магчымасць удзельнічаць у экскурсіях за кошт гімназіі.

Я. Ф. Арлоўскі напісаў шэраг падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і гісторыка-краязнаўчых кніг, прысвечаных Гродзенскаму павету, якія былі надрукаваны ў Гродне. Гэта такія працы, як: «Очерк истории гор. Гродно, составленный на основании печатных источников» (1899 г.), «К истории народного образования в Гродненской губернии» (1899 г.), «Учебное описание Гродненской губернии» (вытрымала 5 выданняў — 1901, 1902, 1904, 1906, 1909 гг.); «Гродненская старина» (1910 г.), «Гродненская губерния в 1812 г. Исторический очерк» (1912 г.).

Асобнай увагі заслугоўвае дапаможнік для навучальных устаноў Гродзенскай губерні «Учебное описание Гродненской губернии». Гэта невялікае выданне, складзенае з 44 старонак, карысталася вялікай папулярнасцю сярод настаўнікаў і вучняў Гродзеншчыны. Дапаможнік адрасаваны, у першую чаргу, вучням. Магчыма, пагэтаму для зручнасці вучняў некаторыя статыстычныя даныя падаваліся ў круглых лічбах. Характарызуючы геаграфічнае становішча і межы Гродзенскай губерні, аўтар адзначае,

што яна ўваходзіць у склад Паўночна-Заходняга краю, а затым удакладняе гэту назву — Беларуска-Літоўскі край.

Падрабязна і дакладна апісаўшы межы павета, ён расказвае «пра прастору» і «канструкцыю паверхні», прыводзіць даныя аб вадзяной сістэме, надвор'і, расліннасці. Характарызуючы нацыянальны састаў губерні, аўтар падкрэслівае, што «большая частка жыхароў — беларусы», апісвае асноўныя заняткі беларусаў — земляробства, агародніцтва, пчалярства, жывёлагадоўля, гандаль. У раздзеле «Народное образование» ёсць статыстычныя даныя, даведачны матэрыял, якія раскрываюць стан і тэндэнцыі развіцця адукацыі ў Гродзенскай губерні. Аналізуюцца асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця асобных паветаў.

Педагагічная дзейнасць і погляды Я. Ф. Арлоўскага сведчаць аб тым, што ён быў выдатным прадстаўніком педагагічнай думкі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст., педагагічная і гістарычная спадчына якога яшчэ не ацэнена па заслугах і патрабуе спецыяльнага даследавання.

Да ліку таленавітых людзей, працаваўшых у Беларусі, можна аднесці **Апалона Мікалаевіча Макарава** (1840—пасля 1917), рускага настаўніка і пісьменніка. Пачаўшы свой жыццёвы шлях 16-гадовым мічманам, затым закончыўшы курс «афіцэрскіх класаў», ён у 1864 г. быў прыкамандзіраваны да 2-й Санкт-Пецярбургскай ваеннай гімназіі на пасаду выхавацеля. Ацэнены па заслугах, як «прыроджаны настаўнік», ён быў накіраваны за мяжу для знаёмства з навучальнымі і папраўча-выхаваўчымі ўстановамі Прусіі, Бельгіі і Швейцарыі. Служыў «наглядальнікам», дырэктарам 2-й Маскоўскай ваеннай гімназіі і дырэктарам 2-й Санкт-Пецярбургскай гімназіі.

У 1891 г. быў назначаны дырэктарам Педагагічнага музея ваенна-навучальных устаноў. Адначасова з 1900 г. А. М. Макараў кіраваў педагагічнымі курсамі «для падрыхтоўкі афіцэраў-выхавацеляў да педагагічнай дзейнасці», з'яўляўся ганаровым прэзідэнтам Педагагічнай акадэміі. У 1903 г. у Санкт-Пецярбургу ён арганізаваў настаўніцкія курсы, куды змог прыцягнуць выдатных настаўнікаў. Як адзначалася ў Ваеннай энцыклапедыі, выдадзенай у 1917 г., у гісторыі развіцця педагагічнай думкі імя А. М. Макарава дастойна заняць месца побач з імёнамі М. І. Пірагова, К. Д. Ушынскага. Пайшоўшы на пенсію, А. М. Макараў выехаў у Беларусь, у сваю родавую сядзібу Кацігград (Віцебская губерня) і на сабра-

ныя прыхільнікамі сродкі ў сувязі з 50-гадовым юбілеем яго педагагічнай дзейнасці адкрыў там народную школу для сялянскіх дзяцей. Уражанне, вынесенае з гэтай дзейнасці, А. М. Макараў выклаў у дакладзе, з якім выступіў 16 студзеня 1909 г. на сходзе агульнапедагагічнага аддзела вучэбна-выхаваўчага камітэта Пецярбургскага педагагічнага музея. Гэты даклад быў надрукаваны ў часопісе «Русская школа».

Настаўнік лічыў, што для падняцця ўзроўню народнай адукацыі, ажыццяўлення рэформы школы неабходна вывучэнне асноў народнага жыцця, характару беларускага сялянства. Жаданне на практыцы праверыць тыя погляды, якія склаліся ў настаўніка ў адносінах да сялянскага саслоўя, заахвоціла яго заняцца пабудовай, а затым адкрыццём сельскага двухкласнага прыходскага вучылішча.

У першую чаргу А. М. Макараў выясніў, што пачатковая адукацыя мясцовага насельніцтва адсутнічала, тых, хто ўмеў неяк чытаць і пісаць, быў самы малы працэнт. Кантактуючы з дзецьмі, ён не ўбачыў варожых адносін да вучобы, але і «жывога спачування» таксама. Многія дзеці цікавіліся вучылішчам, якое будавалася. Былі выпадкі, калі яны самі прыходзілі да настаўніка з прапановай прыняць іх у школу, не пытаючыся дазволу бацькоў. Па назіраннях настаўніка, «рэзкае ўзрастанне цікавасці дзяцей да навучання пачалося з лета 1904 г.». Гэта ён матываваў тым, што з развіццём капіталістычных адносін гораду патрабаваліся пісьменныя працаўнікі, і моладзь, якая прыходзіла з вёсак, зазнавала цяжкасці ў пошуках працы.

Выкарыстоўваючы дыферэнцыраваны падыход да навучання, А. М. Макараў падзяліў дзяцей на 2 аддзяленні 1-га класа. У 1-е аддзяленне былі залічаны дзеці, не знаёмыя з граматай, а ў 2-е — тыя, хто слаба ўмелі чытаць і пісаць і былі крыху знаёмыя з лічэннем. Заняткі пачыналіся ў 9 гадзін раніцы, і да 12 праходзіла 3 урокі з пяціхвіліннымі перапынкамі. У 12 гадзін — снеданне. Пасля гэтага з 13 да 15 гадзін — 4-ы і 5-ы урокі.

Важная роля ў сістэме самавыхавання адводзілася самаабслугоўванню вучняў. Дзеці з задавальненнем прыбіралі за сабой, мылі падлогу, дзяўчынкі шылі для сябе, вышывалі. У выніку чаго «пасля кароткага часу знаходжання ў вучылішчы яны гублялі сваё дзікунства, у іх не заўважалася панурасці». І, як вынік, амаль за 2 гады

існавання вясковага вучылішча не было разбіта ніводнай шыбы, на сценах не астаўлена надпісаў. Пры характарыстыцы паводзін вучняў на ўроках А. М. Макарава больш за ўсё ўразіла «ўзорная школьная дысцыпліна. Адсутнасць свавольнасці, якіх-небудзь перамоў аднаго з другім, поўная ўвага — вось што прыходзіцца назіраць у час заняткаў. Вучні і вучаніцы праяўляюць сур'ёзныя адносіны да справы».

Запрашаючы вучняў, якія закончылі 2-е аддзяленне 1-га класа, на працягу ўсяго лета па 2 разы на тыдзень займацца чарчэннем, А. М. Макараў паставіў задачу выпрацаваць у іх свядомыя адносіны да плана будынка і ўменне начарціць яго з мэтай набыцця «навыкаў да мыслення ў галіне адцягненых паняццяў». Настаўнік быў упэўнены, што не вучыць трэба, а дапамагаць вучыцца. Лепшым сродкам выклікаць цікавасць у вучняў да працы і разумовай дзейнасці ён лічыў нагляднасць. Пры такіх умовах не трэба будзе прымушаць вучыцца, а дысцыпліна ў сэнсе прымусовага ўздзеяння будзе непатрэбнай. Шырока выкарыстоўваючы прынцып нагляднасці ў навучанні, А. М. Макараў лічыў, што само навучанне будзе найбольш выхоўваючым і развіваючым у тым выпадку, калі вучню дадуць «магчымасць найбольшай самастойнасці».

Важным фактарам развіцця маральнасці А. М. Макараў лічыў працоўнае выхаванне. Ён адзначаў, што сялянскае дзіця ў параўнанні з гарадскім тут у больш выгадным становішчы, паколькі яно адносіцца да працы «сур'ёзна і з павагай» і іншы шлях да існавання яму невядомы. Зыходзячы са сваіх педагагічных назіранняў, аўтар піша, што «дзеці, якія не вучацца ў дашкольны перыяд жыцця пры паступленні ў народнае вучылішча, нясуць з сабой мазгавы апарат, што валодае вялікай пластычнасцю, а з прычыны гэтага і вялікай здольнасцю да ўспрымання глыбокіх уражанняў, якія лягчэй утрымліваюцца ў іх памяці, калі навучанне ідзе правільна».

Падводзячы вынікі вопыту сваёй настаўніцкай дзейнасці ў сядзібе Кацігрaд, А. М. Макараў прыйшоў да пэўных высноў, якія, на яго думку, будуць карыснымі ў сувязі з выпрацоўкай Міністэрствам народнай асветы новага палажэння аб народных вучылішчах. Настаўнік лічыў, што народныя вучылішчы патрабуюць больш правільнай пастаноўкі ў іх вучэбна-выхаваўчай справы для таго, каб даць магчымасць здольным вучням прадоўжыць сваю адукацыю. Ён таксама адзначаў неаб-

ходнасць падрыхтоўкі настаўнікаў для двухкласных народных вучылішчаў, вучэбных праграм для іх, паколькі існуючыя праграмы «патрабуюць карэннай перапрацоўкі ў адпаведнасці з праграмамі больш высокага тыпу і ўмовамі жыцця сялянскага насельніцтва». А. М. Макараў выступіў за павелічэнне дзяржаўных расходаў на ўтрыманне бібліятэк народных вучылішчаў, на набыццё падручнікаў. Ён лічыў, што навучанне ў народных вучылішчах павінна насіць выхаваўчы характар, і быць «дэманстратыўным», «даючы навучэнцам не толькі веды, але і адпаведныя навыкі». Абавязак інтэлігентных людзей у адносінах да народа настаўнік бачыў у тым, каб дапамагаць справе адукацыі сялянскіх дзяцей «і маральна, і матэрыяльна».

Вопыт асветніцкай дзейнасці рускага настаўніка А. М. Макарава на Віцебшчыне з'яўляецца высакародным прыкладам служэння інтэлігенцыі, народу, укладам расійскага дэмакратычнага настаўніцтва ў справу адукацыі беларускага сялянства. Абнародаванне вынікаў дырэктарства А. М. Макарава ў сядзібе Кацігpaд у часопісе «Русская школа» дазволіла педагагічнаму грамадству Расіі бліжэй пазнаёміцца з умовамі жыцця і вучобы беларускіх дзяцей, а самому аўтару — выкласці свае педагагічныя погляды і выказаць прапановы, накіраваныя на паляпшэнне працы народных вучылішчаў.

Прадстаўніком педагагічнай думкі ў Беларусі, адным з першых гісторыкаў педагогікі канца XIX—пачатку XX ст. быў **Іван Аляксандравіч Глебаў** (1864 — пасля 1917 г.). Ён прадоўжыў сямейную дынастыю педагогаў, у прыватнасці справу свайго бацькі А. Глебава, які служыў памочнікам класных настаўнікаў паралельных аддзяленняў Магілёўскай гімназіі. І. А. Глебаў бліскуча скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта і быў назначаны настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Магілёўскім рэальным вучылішчы. У 1886 г. ён быў пераведзены выкладчыкам гісторыі і геаграфіі ў Слуцкую гімназію. Тут І. А. Глебаў працаваў натхнёна і сумленна, аб чым сведчаць думкі прафесараў Санкт-Пецярбургскага універсітэта, якія адзначалі «добрую падрыхтаванасць па гісторыі выхаванцаў Слуцкай гімназіі».

З мэтай напісання гісторыі Слуцкай гімназіі І. А. Глебаў пераязджае ў Вільню, паколькі мясцовы школьны архіў з'яўляўся вельмі бедным для напісання такой працы. У 1902 г. ён становіцца выкладчыкам гісторыі і геаграфіі Віленскага настаўніцкага інстытута. Тут скончыў

працу па напісанню гісторыі Слуцкай гімназіі, якая выйшла ў 1903 г. у Вільні пад назвай «Историческая записка о Слуцкой гимназии с 1617—1630—1901 гг.». Кніга з'яўляецца адным з першых падрабязных даследаванняў па гісторыі педагогікі Беларусі. Яна змяшчае багаты фактычны матэрыял аб заснаванні і дзейнасці вучылішча і гімназіі ў Слуцку, звесткі аб настаўніках і выпускніках да 1901 г., таксама выпіскі з пратаколаў сходаў педагагічных саветаў. У верасні 1906 г. І. А. Глебаў быў назначаны дырэктарам Шавельскай гімназіі, дзе праслужыў да верасня 1907 г., пасля чаго быў пераведзены на пасаду дырэктара Гродзенскай мужчынскай гімназіі. Тут ён працаваў да 1917 г.

І. А. Глебаў быў актыўным прыхільнікам перабудовы і дэмакратызацыі школьнай справы, нястомна працаваў над удасканаленнем вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдняй школе. Ён удзельнічаў у рабоце Усерасійскага сходу выкладчыкаў старажытных моў (Санкт-Пецярбург, 1911 г.), сходу дзеячаў Віленскай вучэбнай акругі (г. Вільня, 1917 г.). У ліпені 1914 г. выязджаў у Быхаў «для прыняцця мер да своечасовага адкрыцця ў гэтым годзе гімназіі». У 1908 г. удзельнічаў у рабоце сходу выкладчыкаў матэматыкі, фізікі, прыродазнаўства і геаграфіі сярэдніх навучальных устаноў Віленскай вучэбнай акругі. Ён удзельнічаў у рабоце секцыі геаграфіі. Пры разглядванні пытання аб метадах і сродках выкладання геаграфіі разгарэлася спрэчка аб тым, які метад мэтазгодна выкарыстаць — аналітычны ці сінтэтычны. І. А. Глебаў прапанаваў выкарыстаць у працэсе выкладання геаграфіі «метад змешаны аналітыка-сэнтэтычны», які і прымірыў абодва меркаванні.

У кастрычніку 1907 г. І. А. Глебаў прыняў прапанову аб кіраўніцтве вучэбна-выхаваўчай часткай Гродзенскай жаночай яўрэйскай гімназіі Астрагародскай і Вальдман. Па іх прызнанню, І. А. Глебаў, з'яўляючыся старшынёй педагагічнага сходу гэтай гімназіі, адыграў вялікую ролю ва ўстараненні недахопаў у выкладанні вучэбных прадметаў. Строга і аб'ектыўна ён падыходзіў да ацэнкі ведаў выхавальніц, адначасова звяртаючы ўвагу на падрыхтоўку настаўнікаў да сваіх заняткаў. І. І. Глебаў вядучую ролю ў навучальна-выхаваўчым працэсе адводзіў дзейнасці педагагічных саветаў, часта выказваў цікавыя думкі наконт рэформы сярэдніх навучальных устаноў. У той жа час ён прытрымліваўся вернападданніцкіх поглядаў, разглядаў грамадскія і культурныя працэсы ў Паўночна-

Заходнім краі з пункту гледжання барацьбы рускага праваслаўя з польскім каталіцызмам.

I. А. Глебаў на працягу 10 гадоў (з 1907 па 1917 г.) працаваў дырэктарам Гродзенскай гімназіі, выкладчыкам якой быў Я. Ф. Арлоўскі. Дырэктар гімназіі ў многім садзейнічаў развіццю творчай дзейнасці Я. Ф. Арлоўскага, паважаў яго педагагічныя погляды і думкі. Магчыма, што такі тандэм вучоных-педагогаў і садзейнічаў таму, што вучэбна-выхаваўчы працэс у гімназіі быў пастаўлены на высокім узроўні і заслужыў адабрэнне з боку кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі.

Імя беларускага выкладчыка, гісторыка і археографа **Арсенія Восіпавіча Турцэвіча** ў гісторыі педагагічнай думкі Беларусі звязана перш за ўсё з напісаннем падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Заходняй Расіі.

А. В. Турцэвіч (1842 — пасля 1915 г.), выхадзец з сям'і беларускага вясковага свяшчэнніка, скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Санкт-Пецярбургскага універсітэта са званнем кандыдата. Доўгі час выкладаў гісторыю і геаграфію ў сярэдніх навучальных установах Віленскай вучэбнай акругі. У аснову выкладання ставіў прынцып сістэматычнай працы, дзякуючы якой і меней здольныя вучні маглі добра засвоіць вывучаемы матэрыял.

А. Крукоўскі адзначаў, што ў 1-й Віленскай гімназіі выкладчыкі гісторыі — «лепшыя настаўніцкія кадры», у шэрагу якіх першым ён ставіў імя А. В. Турцэвіча. «Цудоўны знаўца Заходнерускай старадаўнасці, нястомны працаўнік у мясцовым цэнтральным архіве (г. Вільня — С. С.), акты якога выдаваліся пад яго рэдакцыяй, складальнік адзінай хрэстаматыі па гісторыі Заходняй Расіі і добрага элементарнага падручніка па рускай гісторыі, ён увесь пранік у Заходнерускую старадаўнасць». Разам з тым, па словах А. Крукоўскага, «Хрестоматия по истории Западной России», надрукаваная ў Вільні ў 1892 г., была вельмі мала вядома нават у найбольш цікавых яе частках . Магчыма, афіцыйнае вучэбнае ведамства не было ў захапленні ад таго, што створаная А. В. Турцэвічам фундаментальная праца змяшчала не толькі гісторыю рускага народа, але і беларускага, украінскага і літоўскага. Варта адзначыць, што тыя раздзелы, дзе выкладалася гісторыя Вялікага княства Літоўскага, друкаваліся ў падручніку дробным шрыфтам і лічыліся для вучняў неабавязковымі. Аднак ва ўводзінах да хрэстаматыі аўтар

заклікаў настаўнікаў уважліва аднесціся да матэрыялаў па заходнерускай гісторыі ў курсе сярэдняй школы, паколькі гэтыя даныя маюць такое ж значэнне, як і паўночнаруская гісторыя. Гэта кніга не згубіла свайго значэння і ў наш час. У ёй раскрыты карані русіфікатарскай палітыкі самадзяржаўя ў Паўночна-Заходнім краі, роля рэлігіі ў гэтым працэсе.

Падручнік А. Турцэвіча «Русская история (в связи с историей Великого княжества Литовского) . Курс городских и уездных училищ», выдадзены ў Вільні ў 1911 г., змяшчае карты, шмат малюнкаў і пытанні для паўтарэння, ён вытрымаў 15 выданняў, а падручнік па рускай гісторыі для пачатковай школы — 9. Навуковыя артыкулы А. Турцэвіча друкаваліся ў Цыркулярах па Віленскай вучэбнай акрузе, а таксама ў «Віленскім календары» за 1901, 1902 гг.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. унесла ў настроі, у навукова-педагагічныя погляды вучонага значныя карэктывы. Калі да рэвалюцыі яго працы поўнасцю насілі вернападданніцкі характар, то пасля яе А. Турцэвіч ужо выказаў крытычныя меркаванні да палітыкі русіфікацыі. У «Кратком историческом очерке Виленской комиссии для разбора и издания древних актов. 1864—1906», выдадзеным у Вільні ў 1906 г., ён асуджае русіфікатарскія погляды камісіі аб тым, што Беларусь «спрадвечна рускі, праваслаўны край». У сваёй працы «Русские крестьяне под владычеством Литвы и Польши» (1911 г.) аўтар прыходзіць да вываду, што пасля аб'яднання Беларусі з Расіяй становішча сялян станавілася ўсё горшым.

Навуковая і педагагічная спадчына А. В. Турцэвіча ўнесла ўклад у фарміраванне гістарычнай асветы беларускага народа. Дзякуючы яго падручнікам, хрэстаматыям і даследаванням па гісторыі Заходняй Расіі і Вялікага княства Літоўскага, вучні, як і дарослае насельніцтва, прылучыліся да глыбокай і багатай гісторыі Беларусі.

Імя выдатнага беларускага гісторыка, вучонага і педагога, краязнаўцы Віцебшчыны **Аляксея Парфёнавіча Сапунова** пакуль яшчэ мала сустракалася ў гісторыі педагагічнай думкі Беларусі.

А. П. Сапуноў (1852—1924) нарадзіўся ў Віцебскай губерні ў небагатай сялянскай сям'і. Пасля паспяховага заканчэння Віцебскай мужчынскай гімназіі ў якасці стыпендыята Міністэрства народнай асветы быў накіраваны ў Санкт-Пецярбургскі універсітэт на гісторыка-філалагічны

факультэт. Пасля паспяховага напісання кандыдацкага сачынення яму было прапанавана застацца на кафедры прафесара Ламанскага. Але ў сувязі са сваім статусам стыпендыята Міністэрства народнай асветы ён вымушаны быў вярнуцца назад у Віцебск. Ён стаў выкладчыкам мужчынскай гімназіі, у якой працаваў на працягу 15 гадоў. З гэтага моманту А. П. Сапуноў амаль поўнасцю прысвяціў сябе справе народнай адукацыі і беларускай культуры. А. П. Сапуновым напісана і выдадзена больш як 200 навуковых прац: артыкулаў, дакладаў, рэцэнзій і інш., якія датычацца выключна вывучэння гістарычнага мінулага Беларусі. Яго працы змяшчаюць каля 7 тысяч друкаваных старонак, якія ён выдаваў у асноўным на свае сродкі. Непасрэднае дачыненне да педагагічнай справы маюць такія яго працы, як «Историческая записка 75-летия Витебской гимназии» (Віцебск, 1884 г.), «Речь, произнесенная 8 июня в актовом зале Витебской мужской гимназии» («Полоцкие епархиальные ведомости», 1889 г.), «Университет в Полоцке» («Витебские губернские ведомости», 1908 г.). Працу вучонага для развіцця беларускай гістарычнай навукі і асветы цяжка пераацаніць.

Галоўная праца А. П. Сапунова — «Витебская старина», якая ўяўляе сабой энцыклапедыю-даведнік па гісторыі Паўночнай часткі Беларусі. У 1893 г. ён апублікаваў кнігу «Западная Двина», якая прынесла яму заслужаную славу не толькі ў Расіі, але і за мяжой. Гэта праца атрымала высокую навуковую ацэнку ў краінах Заходняй Еўропы: Германіі, Францыі, Англіі.

У 1897 г. А. П. Сапунова запрасілі на працу ў Маскоўскі універсітэт, там ён працаваў да 1901 г., а потым зноў вярнуўся ў Віцебск, дзе быў выкладчыкам гімназіі, займаючыся адначасова навукова-педагагічнай дзейнасцю. А. П. Сапуноў з'яўляўся сакратаром губернскага статыстычнага камітэта, членам Віцебскай вучэбнай архіўнай камісіі, а таксама прымаў удзел у шматлікіх Расійскіх таварыствах.

А. П. Сапуноў, як і шматлікія іншыя дзеячы навукі і асветы, працаваўшыя ў той час на тэрыторыі Беларусі, лічыў яе «спрадвечна рускім краем». Але і ён падымаў свой голас супраць русіфікатарскай палітыкі самадзяржаўя, са спачуваннем і горыччу канстатаваў: «Я — беларус. Але ні ў гімназіі, ні ва універсітэце ні слова я не пачуў пра Беларусь, быццам бы яе і на свеце не было».

Кароткі агляд даследчай дзейнасці і педагагічных поглядаў Я. Ф. Арлоўскага, А. М. Макарава, І. А. Гле-

бава, А. В. Турцэвіча, А. П. Сапунова паказвае, што гэтыя дзеячы народнай адукацыі ўнеслі ўклад у развіццё асветы і педагогікі Беларусі. Іх педагагічная дзейнасць і погляды яшчэ не зусім вывучаны, не раскрыта іх уздзеянне на стан школьнай справы ў тых гарадах і губернях, дзе яны працавалі. Тым не менш, як нам уяўляецца, можна канстатаваць, што як настаўнікі гісторыі і геаграфіі, як аўтары гістарычных даследаванняў і вучэбных кніг па гісторыі Беларусі Я. Ф. Арлоўскі, І. А. Глебаў, А. В. Турцэвіч, А. П. Сапуноў самым непасрэдным чынам садзейнічалі гістарычнай асвеце і адукацыі насельніцтва беларускіх губерняў. У прыватнасці, напісаныя Я. Ф. Арлоўскім і І. А. Глебавым нарысы педагагічнага мінулага Гродзенскай губерні і гісторыі Слуцкай гімназіі ўяўляюць сабой каштоўныя крыніцы інфармацыі аб развіцці народнай адукацыі, школы і педагогікі ў Беларусі на працягу некалькіх стагоддзяў. Цікавы і вопыт педагагічнай дзейнасці А. М. Макарава ў Віцебскай губерні, укараненне ім у школьную практыку перадавых ідэй, якія актыўна абмяркоўваліся ў педагагічных колах Расіі.

Названыя дзеячы народнай асветы Беларусі выкарыстал і ў сваёй педагагічнай практыцы прагрэсіўныя прыёмы і метады вучэбна-выхаваўчага працэсу. У прыватнасці, вялікую ўвагу ўдзялялі нагляднаму метаду навучання, падарожжам, працоўнаму навучанню, самавыхаванню, нястомна працавалі над удасканаленнем методыкі выкладання вучэбных прадметаў. Я. Ф. Арлоўскі, І. А. Глебаў, А. В. Турцэвіч, А. П. Сапуноў удзельнічалі ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі настаўніцкіх кадраў для народных школ Віленскай вучэбнай акругі.

Нацыянальнае адраджэнне Беларусі садзейнічала ўзмацненню інтарэсу настаўніцкай інтэлігенцыі да вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа, яго багатых гістарычных традыцый. Ажывілася этнаграфічная і краязнаўчая дзейнасць настаўнікаў і педагогаў-даследчыкаў, асноўнае месца ў якой займала вывучэнне быту і вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, народнай педагогікі.

Народная педагогіка як сродак выказвання самасвядомасці беларусаў адлюстравала складаны і супярэчлівы працэс фарміравання беларускай нацыі, стала яскравым сведчаннем росту духоўнай, сацыяльнай і нацыянальнай культуры народа. Узнікнуўшы як выражэнне грамадскай духоўнай патрэбы сцвярджэння канцэптуальнага погляду на сусвет (прыроду, грамадства, чалавека), на-

родная педагогіка развівалася як арганічная састаўная частка беларускай педагагічнай культуры. Народна-педагагічныя ідэі, звычкі і традыцыі, фальклор аказалі значны ўплыў на развіццё педагагічнай думкі на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Паколькі палітыка царызму вызначалася перш за ўсё русіфікатарскімі падыходамі ў галіне народнай асветы, народная педагогіка заставалася адзіным сродкам выхавання нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, таму што яна захавала самы галоўны сродак выказвання народна-педагагічных ідэй беларусаў — беларускае слова.

Найбольш вядомымі даследчыкамі быту, культуры, мовы беларускага народа канца XIX стагоддзя былі вучоныя-этнографы, фалькларысты Ю. Ф. Крачкоўскі, П. В. Шэйн, М. Я. Нікіфароўскі, Е. Р. Раманаў, А. Я. Багдановіч, Я. Ф. Карскі, П. М. Дземідовіч, У. М. Дабравольскі, А. К. Сержпутоўскі, М. Я. Янчук, М. В. Доўнар-Запольскі і іншыя. У большасці сваёй гэтыя вучоныя не займаліся ўласна праблемамі педагагічнай навукі, але амаль што ўсе яны з'яўляліся настаўнікамі ці мелі дачыненне да настаўніцкай працы. Вынікі іх навуковых пошукаў, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў стварэнні фундаментальных збораў твораў народнай творчасці, слоўнікаў беларускай мовы, сцвярджаюць і сёння жыццяздольнасць, багацце і самабытнасць беларускай нацыянальнай культуры, садзейнічаюць яе распаўсюджванню ў асяроддзі настаўніцтва, вучняў.

**М. Я. Нікіфароўскі** (1848—1910) — настаўнік рускай мовы народных вучылішчаў Віцебскай і Гродзенскай губерняў, а потым выкладчык Віцебскай мужчынскай гімназіі. Разам з педагагічнай дзейнасцю вёў вялікую работу па вывучэнню народна-педагагічнай спадчыны беларусаў. За 20-гадовы перыяд навуковай дзейнасці падрыхтаваў і надрукаваў каля 20 работ па этнаграфіі, фальклору, гісторыі Віцебшчыны, стану народнай асветы ў гэтым краі. Нават і сёння вялікую цікавасць выклікаюць этнаграфічныя працы Нікіфароўскага: «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности» (1895 г.), «Очерки Витебской Белоруссии» (1892—1899), «Простонародные предметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах» (1897), фальклорныя зборы «Простонародные загадки» (1898), «Белорусские песни-частушки» (1911), «Полупословицы и полупоговорки, употребляемые в Витебской Белоруссии» (1911—1913). Сабраныя і

сістэматызаваныя ім узоры народнай педагогікі з'яўляюцца сапраўднай энцыклапедыяй народнага жыцця і ўяўляюць сабою каштоўную спадчыну беларускага народа.

Значны ўклад у этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ўнёс асветнік і педагог, вучоны ў галіне этнаграфіі, фалькларыстыкі і археалогіі **Е. Р. Раманаў** (1855—1922). Настаўнік расійскай мовы і гісторыі ў школах Магілёўскай і Віцебскай губерняў, потым інспектар народных вучылішчаў Віцебскай губерні, Е. Р. Раманаў надрукаваў каля 200 работ, якія змясцілі звыш 10 тысяч фальклорных твораў. Яго цэнтральнай этнаграфічнай працай з'яўляецца «Белорусский сборник», які выдаваўся 9 разоў (з 1886 па 1912 г.). Значную ўвагу настаўнік надаваў дзіцячаму фальклору, таму што бачыў у ім магутны выхаваўчы сродак. Ён нават прапанаваў праграму па збору звестак аб гульнях, цацках і іншых дзіцячых захапленнях, звярнуў увагу на неабходнасць фізічнага выхавання. Педагог адстойваў права беларускага народа на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, навукі, літаратуры.

Значны ўплыў на асвету і педагагічную думку Беларусі аказалі педагагічная дзейнасць і погляды **А. Я. Багдановіча,** бацькі выдатнага беларускага паэта. Вядомы ў Расіі, Беларусі і Польшчы беларускі этнограф і фалькларыст, мовазнаўца і педагог, сын былых прыгонных, вучонысамавучка гэты чалавек увайшоў у лік энтузіястаў беларускай навукі.

Асабліва вылучаецца яго праца «Педагогические воззрения белорусского народа» (1886 г.), дзе ён адзін з першых беларускіх педагогаў робіць спробу аналізу і абагульнення ідэй і традыцый народнай педагогікі ў гісторыі беларускай педагагічнай думкі.

Аддаючы прыярытэт сямейнаму выхаванню, А. Я. Багдановіч адзначыў, што клопаты аб выхаванні сваіх дзяцей лічыліся галоўным бацькоўскім абавязкам. Беларусы разглядалі выхаванне перш за ўсё праз люстэрка працоўнага выхавання — прывіцця працоўных уменняў і навыкаў. Выхаванне працоўных якасцей асобы пранізвае ўсю сістэму народнай педагогікі Беларусі, і А. Я. Багдановіч прыходзіць да высновы, што галоўная народна-педагагічная ідэя — «усе павінны працаваць». Мэтам сямейнага выхавання адпавядалі традыцыі і звычаі, існаваўшыя ў беларускай сям'і, якія шанаваліся і перадаваліся ад старэйшага пакалення малодшым. А. Я. Багдановіч адзначае, што ў сялянскай сям'і асабліва апаэтызавана было

прыгатаванне хлеба, які з'яўляецца святыняй для беларуса. А калі трэба было выказаць нешта непрыстойнае, то беларус абавязкова папярэдзіць сваё паведамленне прыказкай: «Не пры хлебе святым кажучы».

Найлепшыя жаночыя якасці выхоўваліся ў працэсе працы, дзе важным момантам з'яўлялася навучанне ткацтву. Такая старажытная традыцыя суправаджалася мілагучнымі народнымі песнямі, жыццёвымі парадамі, выхоўвала пачуццё прыгожага, густ, фантазію.

Ідэю выхавання сродкамі народнай педагогікі Багдановіч панёс праз усё сваё жыццё. Скончыўшы Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, свой уласны летні адпачынак ён праводзіў з вучнямі, збіраючы этнаграфічныя матэрыялы, аб чым ён паведамляў дырэктару народных вучылішчаў Мінскай губерні яшчэ ў 1887 г. Так, стаўшы актыўным карэспандэнтам вядомага па Беларусі збіральніка фальклору П. В. Шэйна, Адам Ягоравіч падрыхтаваў дакладныя запісы помнікаў народнай творчасці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У склад кнігі «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края», выдадзенай у 1890 і 1893 гг. у Пецярбургу, уваходзяць вясельныя абрады, звычаі, павер'і, заручыны, запевіны, прыказкі, прымаўкі. Няцяжка ўбачыць, што ўсе гэтыя сродкі народнай педагогікі выхоўваюць станоўчыя якасці чалавека і высмейваюць адмоўныя. У выніку народная мараль прыходзіць да высновы:

«Да 20 не вырас, да 30 не умен,
Да 40 калі не жанаты, а да 50 не багаты,
То нічога ад яго не чакай, — так і памрэ».
(Барысаўскі павет, вёска Халопенічы, 1889 г.)

Сярод педагагічнай спадчыны Багдановіча вялікае месца займаюць яго мемуары, якія ўяўляюць сабою сур'ёзнае навуковае даследаванне не толькі па сацыялогіі, філасофіі, народнай адукацыі, але і па этнаграфіі, фальклору, культуры Беларусі другой паловы XIX ст.

З вялікай цеплынёю аўтар узгадвае пра сваю першую выхавацельніцу і настаўніцу, непісьменную бабулю Рузалю Казіміраўну Осьмак, якая з'яўлялася сапраўднай захавальніцай беларускага фальклору, традыцый, звычаяў і г. д. Дзякуючы гэтай «цудоўнай апавядальніцы», Адам Ягоравіч зразумеў хараство беларускага народнага слова, яго вялікі выхаваўчы сэнс. Асабліва ўдаваліся бабулі Рузалі казкі, якіх яна ведала мноства, і якія мелі, па словах Адама Ягоравіча, «вялікае адукацыйнае значэнне». Менавіта адтуль настаўнік Багдановіч чэрпаў прын-

цыпы дэмакратызму, грамадзянскай адказнасці, маральнага абавязку.

У сэнсе беларускіх народных традыцый кожнаму ў хаце Багдановічаў было месца і адпаведная справа: бабуля — вядома, казку кажа, матка — песню пяе, бацька — падае прыклад сціпласці і працавітасці.

Менавіта захоўванне беларускага фальклору, народных звычаяў і традыцый дапамагло стварыць сапраўдную беларускую атмасферу, у якой раслі і гадаваліся дзеці Адама Ягоравіча, калі сям'я жыла ў Яраслаўлі і Ніжнім Ноўгарадзе. Так, Максім Багдановіч ад свайго бацькі і цётак упершыню пачуў беларускае слова, заўважыўшы шматлікія колеры, гукі і пахі народна-выхаваўчай скарбніцы. Усё роднае прываблівала Максіма, успамінаў Адам Ягоравіч, таму ўвесь вольны час ён праводзіў у цётак, «тут жа вырывалася беларуская прымаўка, меткія, крылатыя словы». Відавочна, што жаданне пісаць творы на роднай мове, жывучы далёка ад Беларусі, з'явілася ў Максіма дзякуючы не толькі спадчыннасці, але і той беларускай атмасферы ў сям'і, што стваралася праз захаванне беларускіх народных традыцый, розных жанраў фальклору. Таму А. Я. Багдановіч асабліва сачыў за чытаннем Максіма. Беларускія народныя казкі, кнігі І. І. Насовіча і Е. Р. Раманава былі першымі настаўнікамі будучага паэта.

Так, сярод узораў беларускай народнай педагагічнай спадчыны заззяла зорка Максіма:

Ды красна беседа не ўзорамі,  
А ласкавымі прыгаворамі,  
Не ядвабнымі абрусамі,  
А ласкавымі прымусамі.  
(«Беседная».)

А. Я. Багдановіч — бацька сапраўднага народнага паэта. У гэтым — заслуга таленавітага педагога. Ёсць яшчэ адно яго высокае прызначэнне як вучонага, які яшчэ ў канцы XIX ст. паклаў пачатак даследаванню ўзаемадзеяння, узбагачэння народнай і навуковай педагагічнай думкі, што ствараюць агульнае ядро беларускай нацыянальнай культуры. Таму варта адзначыць, што Багдановіч заклаў асновы пераемнасці паміж вучонымі і педагогамі-этнографамі XIX ст. — прадстаўнікамі афіцыйнай педагагічнай думкі — і нараджаючымся нацыянальным напрамкам народнай інтэлігенцы. Тым самым быў зроблены крок для надання народнай педагогіцы належнага месца ў

вучэбна-выхаваўчым працэсе беларускай нацыянальнай школы.

Педагогі-этнографы XIX ст. дзейнічалі ва ўмовах афіцыйнай педагогікі, вядомай сваімі русіфікатарскімі падыходамі. Многія з іх былі шчыра перакананы, што Беларусь — гэта «спрадвечна рускі край». Але яны зрабілі шмат каштоўнага для «тутэйшых людзей» тым, што вывучалі нашы народна-педагагічныя ідэі, распаўсюджвалі іх, выкарыстоўвалі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Яны, часам падсвядома, шукалі шляхі да збліжэння навуковай і народнай педагогікі. Тым самым педагогі-вучоныя, этнографы ўзбагачалі школу і педагагічную думку на Беларусі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

На рубяжы XIX—XX стст. у Расійскай імперыі выразна праявіліся супярэчнасці паміж растучымі патрэбамі грамадскага развіцця ў пісьменных, адукаваных працаўніках і нізкім узроўнем народнай адукацыі, агульнай культуры працоўных. Школьная палітыка самадзяржаўя была накіравана не на задавальненне растучых грамадскіх патрэб у адукацыі, а на ўмацаванне манархічных і праваслаўных асноў расійскай дзяржаўнасці. У нацыянальных рэгіёнах, у тым ліку і на Беларусі, царызм імкнуўся пératварыць пачатковую народную школу ў зброю русіфікацыі мясцовага насельніцтва. Увасабленнем педагагічнага кансерватызму станавіліся сярэднія школы.

Саслоўна-класавая русіфікатарская палітыка самадзяржаўя ў школьным пытанні параджала актыўную апазіцыю з боку нацыянальна-дэмакратычнай грамадскасці Беларусі, вяла да абвастрэння сацыяльных канфліктаў. У новых гістарычных умовах канца XIX — пачатку XX ст. грамадска-педагагічны рух узняўся на якасна новы ўзровень, праявіў сябе як асобная галіна нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Гэты рух выступіў як процілегласць дзяржаўнай школьнай палітыцы, садзейнічаў абвастрэнню грамадскага інтарэсу да праблем народнай адукацыі. Характэрнай асаблівасцю развіцця грамадска-педагагічнага руху дадзенага перыяду было тое, што пытанні народнай адукацыі з сацыяльна-педагагічнай сферы перайшлі ў сферу рэальнай палітыкі, сталі прадметам вострых палітычных дыскусій.

Рэвалюцыйны і грамадска-педагагічны рух аказалі вялікі ўплыў на развіццё педагагічнай думкі. Уздзеянне перадавых грамадскіх ідэй на педагагічную сферу праяві-

лася ў тым, што прынцыпы адзінства, навуковасці і свецкасці адукацыі трывала замацаваліся ў грамадскай свядомасці дэмакратычнага настаўніцтва. Прагрэсіўная, дэмакратычная педагогіка больш рашуча ставіла выхаваўча-адукацыйныя задачы, пашыраўся дыяпазон яе творчых пошукаў. У штодзённую педагагічную практыку пачалі актыўна пранікаць грамадзянска-гуманістычныя прынцыпы, якія раней былі здабыткам толькі тэорыі.

Моцны ўплыў на развіццё асветы і педагагічнай думкі Беларусі аказала перадавая руская педагогіка. Прагрэсіўныя ідэі рускіх педагогаў значна ўзбагацілі вучэбна-выхаваўчы працэс пачатковай і сярэдняй школы Беларусі, садзейнічалі ўдасканаленню метадаў навучання, аказалі ўплыў на стварэнне першых беларускіх падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

На Беларусі плённа працавалі рускія педагогі-даследчыкі і практыкі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё асветы і педагагічнай думкі краіны. Аднак многія з іх вольна ці нявольна рабіліся праваднікамі русіфікатарскай палітыкі самадзяржаўя і адмаўлялі за беларускім народам права на самастойнае развіццё, на сваю нацыянальную культуру, мову, асвету. Гэтыя педагогі, падрыхтаваныя ў расійскіх універсітэцкіх цэнтрах ці сярэдніх навучальных установах, а затым дасланыя ў Паўночна-Заходні край з высакароднай мэтай асветы «адсталага і забітага» карэннага насельніцтва, выконвалі і сацыяльна-палітычны заказ урада: навучыць падрастаючае пакаленне беларускай нацыі грамаце на рускай мове, закласці рускамоўны падмурак ведаў, не дапусціць выкарыстання роднай мовы ў працэсе навучання і выхавання. Такая дзейнасць настаўніцтва, асабліва ў сярэдніх навучальных установах, не адпавядала мэтам і задачам нацыянальнага адраджэння Беларусі, стварэнню нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Асновы беларускай нацыянальнай школы заклалі прадстаўнікі нацыянальнага адраджэння: Цётка, В. Іваноўскі, К. Каганец, Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, В. Ластоўскі, С. Палуян, Я. Лёсік, браты А. і І. Луцкевічы, Б. Тарашкевіч і інш. Яны стварылі першыя вучэбныя кнігі на беларускай мове, сфарміравалі асновы нацыянальнай педагогікі. Барацьба нацыянальна-дэмакратычных сіл за беларускую школу была важнейшай састаўной часткай усяго гістарычнага працэсу абуджэння беларускага народа.

Высветленыя аўтарам два напрамкі педагагічнай думкі

на тэрыторыі Беларусі: афіцыйны і нацыянальны — адлюстроўвалі супярэчлівыя інтарэсы царызму з яго імперскай, русіфікатарскай палітыкай і нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа. Адсутнасць сувязі, супрацоўніцтва, узаемадзеяння паміж гэтымі двума напрамкамі, нежаданне мясцовага школьнага начальства, настаўніцкіх колаў улічваць інтарэсы карэннай нацыі ў навучанні на роднай мове наносіла вялікую шкоду плённай распрацоўцы педагагічнай навукі, практыцы школьнай справы на Беларусі.

Пераадоленне расколу паміж прадстаўнікамі педагагічнай навукі, настаўнікамі-практыкамі, арганізатарамі школьнай справы па пытанню мовы навучання стала магчымым на Беларусі ў 20-я гады XX ст., калі ў рэспубліцы актыўна пайшоў працэс «беларусізацыі». Але і ён аказаўся недаўгавечным і быў перарваны сталінскай палітыкай уніфікацыі і русіфікацыі савецкіх рэспублік.

Асноўны змест педагагічных дыскусій, спрэчак, тэарэтычных меркаванняў таго часу складала барацьба паміж прагрэсіўнай, творчай, стваральнай педагогікай, накіраванай на зацвярджэнне ў сістэме адукацыі і выхавання дэмакратызму, гуманізму, грамадзянскасці, і кансерватыўнай, афіцыйнай педагогікай, якая супраціўлялася зменам, абнаўленню, рэформе школы.

Важнейшай асаблівасцю перадавой педагогікі была яе гуманістычная накіраванасць і дэмакратызм. Яе прадстаўнікі ў сваіх даследаваннях і штодзённай настаўніцкай працы падкрэслівалі неабходнасць уважлівых адносін да асобы дзіцяці, стварэння спрыяльных умоў для яе ўсебаковага і гарманічнага развіцця.

Дэмакратызм прагрэсіўнай педагогікі знаходзіў сваё адлюстраванне ў паслядоўным адстойванні права на адукацыю для ўсіх дзяцей незалежна ад іх сацыяльнага паходжання. Выступіўшы супраць афіцыйнай педагогікі, якая імкнулася захаваць саслоўную школу, педагагічныя калектывы, педагогі-даследчыкі разглядалі права на адукацыю для ўсіх дзяцей як адно з важнейшых правоў чалавека, а барацьбу за ліквідацыю прывілей у сферы адукацыі — як важнейшую ўмову дэмакратызацыі школы.

Праведзены аналіз педагагічнай думкі Беларусі паказвае, што прадстаўнікі прагрэсіўнай педагогікі (Ф. А. Кудрынскі, К. І. Ціхаміраў, А. М. Уласаў, М. А. Багдановіч, В. М. Тычынін і інш.) адстойвалі неабходнасць індывідуальнага падыходу ў навучанні і выхаванні вуч-

няў, уліку іх схільнасцей і інтарэсаў, развіцця здольнасцей і дараванняў. Такая пазіцыя была накіравана супраць догмаў кансерватыўнай педагогікі.

Прадстаўнікі прагрэсіўнай і кансерватыўнай педагогікі Беларусі па-рознаму падыходзілі да праблемы філасофска-светапогляднага выхавання ў агульнаадукацыйнай школе. Педагогі-дэмакраты выступалі супраць царкоўнага ўплыву на школу і лічылі рэлігію прыватнай справай. У Беларусі барацьба супраць рэлігійнага выхавання мела чыста нацыянальнае адценне, паколькі яна была накіравана супраць засілля рускай праваслаўнай царквы і яе русіфікатарскай дзейнасці. На педагагічных з'ездах, саветах, нарадах, курсах педагогі ставілі пытанне аб несумяшчальнасці навуковага і рэлігійнага светаразумення, выстаўлялі патрабаванні карэннай перапрацоўкі праграм на аснове навуковага светапогляду, навейшых дасягненняў педагагічнай навукі. Найбольш аптымальную пазіцыю займалі тыя дзеячы асветы і педагогікі, якія, не ўспрымаючы таксама вульгарнага атэізму, імкнуліся тэарэтычна абгрунтаваць магчымасць аб'яднання матэрыялізму і «культурнай ролі» рэлігіі ў школе.

У канцы XIX — пачатку XX ст. на Беларусі распаўсюджваліся ідэі эксперыментальнага вывучэння працэсаў навучання і выхавання. Вядучы прадстаўнік эксперыментальнай педагогікі Беларусі К. І. Ціхаміраў і яго паслядоўнікі зыходзілі з таго, што падмуркам для пабудовы навуковай педагогікі павінны служыць дакладныя даныя псіхалогіі, фізіялогіі, гігіены і іншых навук аб чалавеку.

Прадметам вострых сутыкненняў паміж прагрэсіўнай і кансерватыўнай педагогікай былі праблемы прызвання, асобы педагога. Прадстаўнікі прагрэсіўнай педагогікі дамагаліся незалежнасці настаўніка ад афіцыяльных установак і праграмных абмежаванняў, адстойвалі свабоду педагагічнага мыслення і творчасці, заклікалі настаўнікаў кіравацца выключна інтарэсамі справы выхавання і адукацыі падрастаючага пакалення. Галоўнымі вартасцямі сапраўднага педагога прадстаўнікі прагрэсіўнай педагогікі лічылі не шчырую рэлігійнасць, адданасць праваслаўнай царкве, вернасць рускай айчыне, а шырокі агульнаадукацыйны кругагляд, глыбокае веданне вучэбнага прадмета, добрае валоданне методыкай, імкненне да штодзённага самавыхавання і самаадукацыі ў спалучэнні са шчырай любоўю да дзяцей.

Трэба адзначыць, што афіцыйная педагогіка не стаяла

на месцы. Як сведчаць «Матэрыялы па арганізацыі школьнага навучання на асновах навуковай педагогікі», выдадзеныя ў якасці дадатку да цыркуляра папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі, школьнае начальства ў сваёй рабоце па кіраўніцтву і арганізацыі вучэбна-выхаваўчым працэсам імкнулася абапірацца на навейшыя дасягненні педагагічнай навукі.

Значнай крыніцай узбагачэння педагагічнай думкі Беларусі з'явіліся народна-педагагічныя ідэі, якія дазвалялі закладваць нацыянальную беларускую педагогіку на трывалым падмурку народнай мудрасці.

Педагагічная думка Беларусі, якая адлюстроўвала дынамічныя і супярэчлівыя працэсы эвалюцыі школы і грамадска-педагагічнага руху, уступіла на рубяжы вякоў у якасна новы этап свайго развіцця. Дзякуючы намаганням многіх педагогаў-даследчыкаў, выдатных прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі, прыхільнікаў беларускай нацыянальнай школы, настаўнікаў-наватараў, педагагічных калектываў, педагагічная думка ў сваіх лепшых узорах дасягала ўзроўню педагагічнай тэорыі. Тым самым педагагічная думка беларускага народа станавілася здабыткам еўрапейскай і сусветнай духоўнай культуры і педагагічнай навукі.

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ І ЛІТАРАТУРНЫЯ КРЫНІЦЫ[1]


Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў у Мінску (БДГА):
Ф. 325, воп. I, спр. 6.
Ф. 458, воп. I, спр. 18, 34, 103, 564, 581, 729.
Ф. 459, воп. I, спр. 1.
Ф. 460, воп. I, спр. 3, 6, 7.
Ф. 466, воп. I, спр. 70, 110, 136, 151, 266.
Ф. 468, воп. I, спр. 128, 361, 469.
Ф. 473, воп. I, спр. 97, 103.
Ф. 478, воп. I, спр. 49.
Ф. 480, воп. I, спр. 8, 14, 16, 37.
Ф. 639, воп. I, спр. 1.
Ф. 639, воп. I, спр. 1, 2.
Ф. 1176, воп. I, спр. 2, 7.
Ф. 1478, воп. I, спр. 1.
Ф. 2084, воп. I, спр. 129.
Ф. 2254, воп. I, спр. 63, 88, 93, 112, 163, 237.
Ф. 2256, воп. I, спр. 53, 57, 59.
Ф. 2258, воп. I, спр. 18, 31, 38, 48.
Ф. 2507, воп. I, спр. 516, 576, 894, 903.
Ф. 2519, воп. I, спр. 17, 29, 63, 71.
Ф. 2554, воп. I, спр. 97, 168, 234.


[1] Спіс літаратуры падаецца па меры ўпамінання матэрыялаў у тэксце.

Ф. 2566, воп. I, спр. 87, 93, 124.
Ф. 2568, воп. I, спр. 21.
Ф. 2597, воп. I, спр. 21, 29, 141.
Ф. 2604, воп. I, спр. 338, 344, 396, 441.
Ф. 2608, воп. I, спр. 24, 37, 98.
Ф. 2654, воп. I, спр. 18, 43, 54, 97, 106.
Ф. 2766, воп. I, спр. 395.
Ф. 23, воп. 2, спр. 922 б.
Ф. 37, воп. 066, спр. Г.
Ф. 39, воп. 1, спр. 7.
Ф. 1186, воп. 3, спр. 33, 81.
Гістарычны архіў Літоўскай Рэспублікі ў г. Вільнюсе:
Ф. 567, воп. 17, спр. 561, 584, 596, 723, 942, 943, 1021, 1056, 1181, 1186, 1187.
Ф. 659, воп. 1, спр. 1, 17, 78, 99, 245.
Архіў Літаратурнага музея М. Багдановіча:
Папкі: I, III, V, VI, VIII, IX, XI.
Величайшее повеление «Правила о частных учебных заведениях, классах и курсах Министерства народного просвещения, не пользующихся правами правительственных учебных заведений» от 1 июля 1914 г. // Циркуляр по Вилен. учеб. округу. — 1914. — С. 653—663.
Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 г. — СПб., 1914. — Вып. 8: Виленский учебный округ. Губернии: Виленская, Витебская, Гродненская, Минская и Могилевская.
Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 г. / Ред. В. И. Покровского. — СПб., 1916. — Вып. 16. Диаграммы и картограммы.
Отчет состояния Минского реального училища за 1897/98 уч. г. — Мн., 1899.
Отчет по управлению Виленским учебным округом за 1905 г. Низшие учебные заведения. — Вильно, 1906.
Памятная книжка Виленского учебного округа на 1902/03 уч. г. — Вильно, 1902.
Памятная книжка Виленского учебного округа на 1914 г. — Вильно, 1914.
Статистические сведения по начальному образованию в Российской империи. — СПб., 1902.
Багдановіч М. Збор твораў: У 2 т. — Мн., 1968. — Т. 2.
Багрячанский Н. Высшая школа для сельского населения // Белорус. учит. вестн. — Могилев на Днепре. 1911. — № 6. — С. 6—13.
Багушэвіч Ф. Творы. — Мн., 1967.
Белецкий А. Виленский учебный округ в XIX в. // Виленский календарь на 1904 простой год царствования императора Николая II, Вильно, 1903.
Белорусский учитель. — СПб., 1909.
Богданович А. К вопросу об «Основных приемах решения арифметических задач в начальной школе» // Народ. образование в Вилен. учеб. округе. — 1911. — № 3.
Богданович А. К вопросу о постановке преподавания геометрии в двухклассных начальных училищах Министерства народного просвещения // Там же. — 1911. — № 6.
Вахтеров В. П. Забытый вопрос // Рус. школа. — 1898. — № 1.

Глебов И. А. Историческая записка о Слуцкой гимназии с 1617—1630—1901 гг. — Вильно, 1903.

Голос учителя: Изд. группы учителей и учительниц Витеб. губ. — СПб., 1908.

Доброведовский М. Старая и молодая школа в Белоруссии // Школа и жизнь. — 1915. — № 18.

Ельницкий К. Примеры методической проработки уроков отечественной грамматики // Народ. образование в Вилен. учеб. округе. — 1913. — № 5, 6—7.

Знаменский С. С. Средняя школа за последние годы. Ученические волнения 1905—1906 гг. и их значение: Общий очерк и материалы. — СПб., 1909.

Инородческая школа: Сборник статей и материалов по вопросам инородческой школы / Под общ. ред. Г. Г. Тумима и В. А. Зеленко. — Пг, 1916.

Инструкция о правах учителей рукоделий в педагогических советах женских гимназий и прогимназий // Циркуляр по Вилен. учеб. округу. — 1890. — № 9. — С. 465.

Историческая записка Могилевской мужской гимназии, 1809—1909. — Могилев, 1909.

Карский Е. Ф. Белорусы. — М., 1955. — Язык белорусского народа, вып. I.

К вопросу о внеклассном чтении // Белорус. учит. вестн. — Могилев на Днепре. — 1910. — № 1.

Киприанович Г. Я. К истории женского образования в Западной России: Ист. записка ко дню 50-летия Виленской, Гродненской и Ковенской гимназий, 1860—1910. — Вильно, 1910.

Колас Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў. — СПб., 1910.

Колас Я. Збор твораў: У 14 т. — Мн., 1976. — Т. 12.

Круковский А. Очерки педагогического прошлого в Северо-Западном крае // Журн. М-ва нар. просвещения. — 1917. — Июль — август.

Кубанский Н. К вопросу об эстетическом воспитании в начальной школе. (Из заметок бывшего народного учителя) // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1910. — № 5.

Кудринский Ф. Несколько слов о воспитательном влиянии народной школы // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1902. — № 3.

Кудринский Ф. О книгах для чтения в народных училищах // Там же. — 1904. — № 3.

Кудринский Ф. Педагогические разговоры // Там же. — 1913. — № 12. — С. 653—660; 1914. — № 1.

Кукушкин И. П. Последнее десятилетие в истории Витебской дирекции народных училищ. 1891—1901 гг. — Витебск, 1901. — 59 с.

Купала Я. Збор твораў: У 7 т. — Мн., 1976.

Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі: з 40 рысункамі. — Вільня, 1910.

Лукашевич С. Основные приемы решения арифметических задач в начальной школе // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1910. — № 4.

Макаров А. Н. Впечатления, вынесенные из личного знакомства с народными училищами // Рус. школа. — 1909. — № 2.

Материалы по организации школьного обучения на началах научной педагогики. Приложение к Циркуляру по Виленскому учебному округу. — Вильно, 1915.

Мачульская М. Пропаганда белорусского языка // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1913. — № 1.

Мурзаев В. Украшайте классную комнату // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1907. — № 11.

(Одинцов Н. Ф.) О-в Н. Народное образование в Виленском учебном округе в 1893 году // Журн. М-ва нар. просвещения. — 1895.

Опыт обзора деятельности Могилевского земского управления в деле народного образования // Белорус. учит. вестн. — Могилев на Днепре. — 1910. — № 5.

Орловский Е. Ф. Очерк истории г. Гродно, составленный на основании печатных источников. — Гродно, 1889.

Орловский Е. Ф. Очерк истории гор. Гродно и его история до 1241 г.: (Реферат). — М., 1897.

Орловский Е. Ф. К истории народного образования в Гродненской губернии. — Гродно, 1899.

Орловский Е. Ф. Исторический очерк Гродненской гимназии. — Гродно, 1901.

Орловский Е. Ф. Учебное описание Гродненской губернии. (Для учебных заведений Гродненской губернии). — Гродно, 1909.

Орловский Е. Ф. Гродненская губерния в 1812 г. Ист. очерк. — Гродно, 1912.

Оршанцев С. Как вести историко-литературные работы в школе (Из методики преподавания литературы) // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1913. — № 1.

О сельскохозяйственных учительских курсах // Настольная книга по народ. образованию: Законы, распоряжения, правила. — СПб., 1901.

Отчет о состоянии церковноприходских школ и школ грамоты за 1892/93 учебный год // Грод. губерн. ведомости. — 1894. — 28 мая.

Отчет о состоянии церковноприходских школ Полоцкой епархии за 1890/91 учебный год и о деятельности Совета Витебского епархиального братства святого равноапостольного князя Владимира. — Витебск, 1892.

Палуян С. Лісты ў будучыню: Проза. Публіцыстыка. Крытыка. — Мн., 1986.

Петрушевский П. Рецензия на книгу С. А. Лосева «Об эстетическом воспитании в начальной школе». Могилев. — 1914 // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1914. — № 9.

Пляшкевич В. Обучение русскому языку в школе среди инородческого населения // Нар. образование в Вилен. учеб. округе, 1908. — № 7.

Полоцкая учительская семинария за 30 лет ее существования (1872—1902 годы). — Витебск, 1902.

Редакционная статья // Белорус. учит. вестн. — Могилев на Днепре. — 1911.

Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Настольная и дорожная книга для русских людей / Под ред. В. П. Семенова. — СПб., 1905.

Руткевич Г. О методах обучения письму в начальной школе // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1913. — № 4, 10, 11.

Синяков И. Необходимость значения основ фонетики для правильной постановки обучения грамоте по звуковому способу // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1910. — № 3.

Степанец Богдан. Вопросы воспитания и обучения: О нац. воспитании // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1909. — № 5.

Степанец Богдан. Каким должен быть народный учитель по завету русской истории // Там же. — 1910. — № 1.

Степанец Богдан. О воспитании и обучении // Там же. — 1911. — № 3, 4, 6.

Степанец Богдан. О практических уроках в учительской семинарии: Общая методика // Там же. — 1910. — № 3.

Степанец Богдан. Типы мышления // Там же. — 1908. — № 12.

Стефаненков Д. Письмо в редакцию // Белорус. учит. вестн. — Могилев на Днепре. — 1910. — № 2–3.

Стукалич В. К. Краткая заметка о белорусском наречии. — Витебск, 1898.

Сцепуро Д. А. Экспериментальная теория обучения правописанию в начальной школе // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1907. — № 9.

Съезд преподавателей математики, физики, естествоведения и географии средних учебных заведении Виленского учебного округа, происходивший в Вильно с 25 февраля по 2 марта 1908 г.: (Протоколы, резолюции, доклады). — Вильно, 1908—1910.

Тихомиров К. Обучение грамоте: (дидактические заметки) // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1901. — № 2.

Тихомиров К. Главнейшие результаты изучения памяти // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1905. — № 2.

Тихомиров К. Краткий отчет о занятиях первого всероссийского съезда по экспериментальной педагогике в С.-Петербурге // Там же. — 1911. — № 2.

Тихомиров К. Слоговой метод обучения грамоте в новой обработке // Там же. — 1911. — № 2.

Тихомиров К. Психологические основы обучения // Там же. — 1912. — № 2, 6—7, 10, 12.

Тоукач А. Словесный и наглядный методы, их оценка и применение в преподавании геометрии в народных четырехклассных училищах // Там же. — 1911. — № 11.

Труды I съезда церковно-школьных деятелей Полоцкой епархии. — Витебск, 1905.

Труды съезда преподавателей практических искусств и ремесел Виленского учебного округа (21—25 апреля 1910 г.). — Вильно, 1911.

Труды съезда преподавателей русского языка и истории средних учебных заведений Виленского учебного округа, происходившего в марте 1907 г. в г. Вильно. — Вильно, 1907.

Турцевич А. Хрестоматия по истории Западной России: Учеб. пособие для учеников ст. классов сред. учеб. заведений. — Вильно, 1892.

Турцевич А. Русская история (в связи с историей Великого княжества Литовского): Курс гор. и уезд. училищ. — Вильно, 1911.

Тычинин В. Н. О воспитании // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1914. — № 9, 10.

Учитель Б. Родной язык и национальное возрождение Белоруссии // Школа и жизнь. — 1915. — № 35.

Учительская взаимопомощь в Виленском учебном округе // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1913. — № 2. — С. 138—142.

Фарфоровский С. Очерки детской литературы для народного учителя (Какой должна быть детская книга?) // Там же. — 1911. — № 5. — С. 336—343.

Цётка. Першае чытанне для дзетак беларусаў. — СПб., 1906.

Цётка. Творы. — Мн., 1976.

Шестов А. К вопросу о постановке объяснительного чтения в четырехклассной учительской семинарии // Нар. образование в Вилен. учеб. округе. — 1907. — № 7—8.

Шестов А. Научная педагогика и русская школа: Обзор материалов

по организации школьного обучения на началах науч. педагогики в Вилен. учеб. округе. — Юрьев, 1916.

Якуб Колас. Жыццё і творчасць. — Мн., 1974.

Якушевич П. П. Недуги школьного классицизма и меры борьбы с ними: Дидакт. этюд. — Витебск, 1896.

Янка Купала. Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці паэта. — Мн., 1955.

Ярушевич А. Молодечно и его учебные заведения: К пятидесятилетию Молодечненской семинарии. 1864—1914. — Вильно, 1914.

Наша доля. — 1906. — № 1—6.

Наша ніва. — 1906. — № 1.

Наша ніва. — 1907. — № 11.

Наша ніва. — 1907. — № 27.

Наша ніва. — 1908. — № 14.

Наша ніва. — 1910. — № 7.

Наша ніва. — 1913. — № 10.

Школа и жизнь. — 1915. — № 18, 33.

Актуальные вопросы историографии и источниковедения истории школы и педагогики: (Сборник) АПН СССР, НИИ общ. педагогики; Под ред. Э. Д. Днепрова, О. Е. Кошелевой. — М., 1986.

Андреева Е. Г. Гуманистические идеи первоначального воспитания детей в дореволюционной Белоруссии: Учеб.-метод. пособие. — Мн., 1985.

Антология педагогической мысли Белорусской ССР. — М., 1986.

Арабей Л. В. Творчество Тетки: Автореф. дис... канд. филол. наук. — Мн., 1958.

Арабей Л. В. Стану песняй...: Жыццё і творчасць Цёткі: Дакум. аповесць. — Мн., 1990.

Арлова Г. П. Беларуская народная педагогіка. — Мн., 1993.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. — Мн., 1985.

Барашко Ил. А. П. Сапунов (Некролог) // Звезда. — 1924. — № 232. — 5 окт.

Белоруссия в эпоху капитализма. Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т истории АН БССР. — Мн., 1990. — Т. 2.

Белорусская ССР: Крат. энцикл. — Мн., 1982.

Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. — Мн., 1924.

Бич М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861—1904 гг. — Мн., 1983.

Богданов И. М. Грамотность и образование в дореволюционной России и в СССР. — М., 1964.

Вітан-Дубейкоўская Ю. Успаміны пра Цётку — Алаізу Пашкевіч. — Кайрыс // Маладосць. — 1991. — № 9.

Вклад учителей математики в подготовку и издание учебников // А. Г. Вопнярская, А. А. Гусак, И. Ф. Метельская, Н. В. Метельский // Из истории науки и техники Белоруссии. — Мн., 1988.

Воронин Н. Н. Древнее Гродно: По материалам археол. раскопок 1932—1949 гг. — М., 1954.

Германовіч І. К. Карусь Каганец як мовазнавец // Весн. Беларус. ун-та Сер. 4. — 1974. — № 3. — С. 30—37.

Дарафеенка Н. Выдатны гісторык Віцебшчыны // Віцебскі рабочы. — 1957. — № 147. — 26 ліп.

Езавітаў К. Становішча беларускае школы ў Латвіі: Пер. з латыш. — Вільня, 1923.

Журавлев В. К. Развитие народного образования на родном и

русском языках в Белоруссии и на Украине (дооктябрьский период) // Нац. язык и нац. культура: Сб. ст. — М., 1978.

Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. — 5-е выд. — Мн., 1991.

Ильюшин И. М., Умрейко С. А. Народное образование в Белорусской ССР. — Мн., 1961.

Каменская Н. В. Становление народного образования в Белоруссии (1917—1920 гг.). — Мн., 1980.

Канчер Е. С. Белорусский вопрос. — Пг., 1919.

Кветка Вітан. «Наша ніва» і Іван Луцкевіч // Скарыніч. — Мн., 1993.

Кириллов М. К. Начальная школа Белоруссии во второй половине XIX и в начале XX в. (1869—1907) // Из истории школы Белоруссии и Литвы. — М., 1964.

Кісялёў. З думкай пра Беларусь. — Мн., 1966.

Кравцов А. И. Педагогическое образование в Белоруссии в дооктябрьский период // Уч. зап. Белорус. ун-та. Сер. педагогика. — 1958.

Лесік Я. Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскай рэвалюцыі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэв. руху. — Мн., 1924.

Лойка А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастр. перыяд: У 2 ч. — Мн., 1989.

Луцэвіч У. Успаміны пра Цётку // Полымя. — 1966. — № 4. — С. 128—132.

Лянсу А. Ф. Педагагічныя погляды Янкі Купалы // Янка Купала: Энцыкл. давед. — Мн., 1986.

Мушынскі М. І. Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці. — Мн., 1982.

Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. — Мн., 1968.

Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии. — Мн., 1973.

Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР: Вторая половина XIX в. — М., 1976.

Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР: Конец XIX — начало XX в. — М., 1991.

Падліпскі А. Летапісец Віцебшчыны. — Мн., 1993.

Паначин Ф. Г. Учительство и революционное движение в России (XIX — начало XX в.) — 1986.

Пастухова З. А. Среднее образование в дореволюционной Белоруссии. — Мн., 1963.

Пичета В. И. Белорусский язык как фактор национально-культурный. — Мн., 1924.

Пічэта У. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым // Працы Беларус. дзярж. ун-та. — 1928. — № 19.

Пратакол з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25—27 сакавіка 1917 г. // Літ. і маст. — 1990. — 7 снеж.

Працько Т. С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі: Кароль Чаховіч. — Мн., 1990.

Рагойша В. Званар Адраджэння: Да 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Палуяна // Літ. і маст. — 1990. — 19 кастр. — С. 12.

Родионов В. Н. Якуб Колас — педагог. — Мн., 1981.

Родчанка Р. В. Старэйшая школа Беларусі. — Мн., 1985.

Семашкевіч Р. М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбургу: (канец XIX — пачатак XX ст.). — Мн., 1971.

Сташкевич Н. С. Приговор революции: Крушение антисов. движения в Белоруссии: (1917—1925). — Мн., 1985.

Трухан А. В. Педагогические общества и пресса начала XX в. в Белоруссии // Вопр. истории школы и педагогики. — Мн., 1983.

Туронак Ю. Іваноўскі быў нацыянальным дзеячам... // Літ. і маст. — 1992. — 16 кастр.

Улащик Н. Н. Очерки по археологии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. — М., 1973.

Цьвікевіч А. «Западно-русизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. — Мн., 1993.

Шибеко З. В., Шибеко С. Ф. Страницы жизни дореволюционного города. — Мн., 1990.

Школа и педагогическая мысль России периода двух буржуазно-демократических революций: Сб. науч. тр. / АПН СССР, НИИ общ. педагогики; Под. ред. Э. Д. Днепрова. — М., 1984.

Школа России накануне и в период революции 1905—1907 гг.: Сб. науч. тр. / АПН СССР, НИИ общ. педагогики; Под ред. Э. Д. Днепрова, Б. К. Тебиева. — М., 1985, 1986.

## ЗМЕСТ

Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Неабходнасць перабудовы школьнай справы . . . . . . 6
У адпаведнасці з патрабаваннямі жыцця . . . . . . —
Падмурак дэмакратызму . . . . . . . . . 22
За адукацыю на роднай мове! . . . . . . . . . 41
Стваральная, творчая педагогіка . . . . . . . . . 63
У пошуках плёну . . . . . . . . . . —
Па старонках педагагічных часопісаў . . . . . . . 82
На карысць навуцы і школе . . . . . . . . 100
Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Дакументальныя і літаратурныя крыніцы . . . . . . . . . 122